Алег Рукаль



# На службе князя Радзівіла

І гэтае загадвай ім,
каб былі беззаганнымі.

Калі ж хто аб сваіх,
а асабліва аб хатніх
не клапоціцца,
той адрокся ад веры
і горш за нявернага.



Алег Рукаль

# На службе князя Радзівіла

Аповесьць

Мінск
«Юніпак»
2013

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
Р84

**Рукаль, А.**

Р84 На службе князя Радзівіла: аповесць / Алег Рукаль. – Мінск : Юніпак, 2013. – 196 с. : іл.
ISBN 978-985-6802-58-7.

Аповесьць «На службе князя Радзівіла» прысьвечана падзеям Інфлянцкай вайны другой паловы XVI стагодзьдзя. На старонках твору паўстаюць гістарычныя постаці вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста, канцлера Вялікага Княства Літоўскага і ваяводы віленскага князя Мікалая Радзівіла Чорнага, найвышэйшага гетмана літоўскага князя Мікалая Радзівіла Рудога і іншых.

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-6802-58-7**

© Рукаль А. 2013
© Афармленне. ЗАТ «Юніпак», 2013

*Прысьвячаю кнігу*
*маёй жонцы Але*
*і нашым дзецям*
*Паўлу, Ганьне і Марку.*

*Выказваю падзяку*
*Царкве Ян Прадвесьнік.*

# На службе князя Радзівіла

## 1

15 студзеня 1563 году да заезнай карчмы, разьмешчанай на адлегласьці шасьцідзесяці вёрстаў ад Полацка, наблізіўся конны аршак. Дваццаць вершнікаў суправаджалі пяць вялікіх гружаных санак, якія цяжка сьлізгалі па сьнезе. На двары падарожныя прывязалі коней да канавязаў і пасьпяшаліся да шынкара.

Карчма была напоўнена людзьмі. Зямяне і месьцічы грэліся з дарогі і голасна размаўлялі. Слугі сноўдалі паміж лавамі і абслугоўвалі наведнікаў. Карчмар пачціва павітаў прыбылых рыцараў і запрасіў іх заняць месца за вялікім дубовым сталом.

Недалёка ад іх разьмясьціўся яшчэ адзін гурт ваяроў. Яны тоўпіліся за адным сталом і вялі ажыўленую размову. Адзін з іх, убачыўшы тых, хто ўвайшоў, ускочыў і радасна закрычаў:

– Вітковіч!

На гэты вокліч адгукнуўся камандзір знаёмага нам аршаку, высокі мужчына сарака гадоў з карат-

ка падстрыжанымі валасамі і пышнымі чорнымі вусамі.

– Каверскі!

Імгненьне і абодва рыцары ўзялі адзін аднаго ў абдоймы.

– Сябры, – зьвярнуўся да сядзеўшых з ім за сталом зямянаў Каверскі, – дазвольце адрэкамэндаваць вам майго даўняга прыяцеля, пана Вітковіча, паручніка гусарскай харугвы князя Мікалая Радзівіла Чорнага.

Ваяры ўзьняліся са сваіх месцаў і па чарзе пазнаёміліся з Вітковічам: Даліва, Гамылка, Ляхоўскі...

– Далучайцеся да нашага стала, пан паручнік, – запрасіў Даліва.

– З вялікім задавальненьнем, – адказаў Вітковіч.

– У якой справе вы сьпяшаецеся да Полацка? – запытаўся Каверскі.

– Мы вязем у горад порах ад князя Радзівіла. А вы?

– А мы кіруемся ў Вільню. Пан ваявода выправіў нас да цэйгаўзу. Са сталіцы будзем суправаджаць абоз са зброяй.

– Чакаеце на маскавітаў?

– Так. Іхныя вялізныя сілы сабраныя ў Мажайску. Хутчэй за ўсё, будзе выправа на Полацак.

– А горад падрыхтаваны да аблогі?

Каверскі пацiснуў плячыма.

– Цяпер маем інтэнсіўную работу над умацаваньнем замку. Прыходзяць абозы з порахам, серай і

сьвінцом. З віленскай людвізарні майстра Брайфуса нядаўна прыбылі два фальконы.

– Ну і як, пратрымаецеся?

Каверскі ізноў сьцепануў плячыма.

– Віжы паведамляюць аб грандыёзных сілах праціўніка ў Мажайску. Такіх войскаў маскавіты да нас даўно ўжо не прыводзілі. Гэтым разам давядзецца цяжка. А пратрымаемся ці не, залежыць ад нас саміх.

Адразу пасьля таго як прагучалі словы полацкага рыцара, у карчму ўварваўся малады мужчына з акрываўленай галавой. Усе размовы як абарвала. Наведнікі ўтаропіліся на яго. А ён, цяжка дыхаючы, абвёў поглядам памяшканьне і, заўважыўшы гурт рыцараў, кінуўся да іх стала.

– На купецкі абоз напалі... Ратуйце!

Ваяры паўскоквалі са сваіх месцаў, спрактыкавана, на хаду, прыхапіўшы зброю.

– Далёка адсюль? – кінуў пытаньне Вітковіч.

– Вёрстаў дзесяць.

– Колькі разбойнікаў?

– Каля пяцідзесяці.

– У абозе колькі чалавек?

– Прыблізна столькі ж. Але многія загінулі ў першыя хвіліны бою. Я цудам вырваўся.

– Вядзі нас, Павал, – зьвярнуўся да Вітковіча Каверскі.

– Тарусіч, Мыслоўскі, Карповіч, Махвіч і Галавач застаецеся ахоўваць абоз, – загадаў пан Вітковіч пяцём жаўнерам. – Камандуе Тарусіч. Астатнія хутка на двор.

З Каверскім было дзевяць жаўнераў. Улічваючы чатырнаццаць ваяроў рэшты яго аршаку, пад кіраўніцтвам пана Вітковіча агулам было дваццаць тры чалавекі.

Яны выбеглі на двор. Выхапілі з санак дзіды і шчыты. На галовы рыцары ўскінулі шаломы і шышакі. Ваяры Каверскага мелі добры баявы досьвед, а вось аршак Вітковіча напалову складаўся з моладзі, якая толькі паступіла на службу. У баях яна яшчэ ня ўдзельнічала. Пан Вітковіч паставіў вопытных ваяроў наперадзе, маладым загадаў трымацца за імі, а сам узначаліў аршак. Яны хутка рушылі па гасьцінцы. Купец, што вырваўся з рук разбойнікаў, з насьпех перавязанай галавой, паказваў ім дарогу, але хутка, ня маючы больш сілаў, адстаў. Рыцарам ён крыкнуў, каб яны не зварочвалі з гасьцінца.

Неўпрыкмет Вітковіч з ваярамі праляцелі сем ці восем вёрстаў. Дарога зрабіла рэзкі выгін, пасьля якога пачынаўся лес. На ўзьлеску застыў вершнік. Убачыўшы аршак, які імчаў на яго, ён выцяў каня і зьнік у лесе.

– Яны выставілі вартавога, – закрычаў пан Вітковіч, – трэба дагнаць яго.

У лесе яны амаль дасталі ўцекача, але гэта ўжо ня мела значэньня. Скрозь дрэвы паказалася паляна, на якой ішла бязьлітасная сеча. Зьвінела сталь, чуліся адчайныя крыкі людзей.

Вартавы разбойнікаў выскачыў на паляну і моцна закрычаў, папярэджваючы сваіх пра небясьпеку. Але гэта было апошняе, што ён пасьпеў зрабіць. Пан Вітковіч ударыў яго дзідай у сьпіну і выбіў з сядла.

Змаганьне завяршалася. Большасьць абаронцаў абозу была забіта. На паляне ляжалі мёртвыя целы, сьнег быў у чырвоных плямах крыві, некалькі коней бяз вершнікаў гойсалі па паляне.

Разбойнікаў, як і казаў купец, было каля пяцідзесяці. Кіраваў імі закуты ў латы рыцар на прыгожым высокім кані. Трацiна яго аршаку была конная, астатнія – пяхотнікі. Атрымаўшы папярэджаньне аб нападзе, яны перашыхтаваліся фронтам да вастрыя атакі, прычым зрабілі гэта даволі шпарка і ўзгоднена.

Вершнікі пана Вітковіча на вялікай хуткасьці ўрэзаліся ў іх шэрагі і ў першыя хвіліны бою прапаролі дзідамі і пасеклі шаблямі большасьць драбаў праціўніка. Быццам сталёвым клінам яны прарвалі варожы шыхт і падзялілі яго на дзьве часткі. Завязалася сеча. Першыя шэрагі рыцараў на чале з панам Вітковічам, не разрываючы шыхту, лёгка праходзілі скрозь разбойнікаў. Ззаду ў іх заставаліся толькі мёртвыя целы. Тыя, каму ўдавалася ўцячы ад гэтага страшнага авангарду, траплялі на маладых жаўнераў, якія праходзілі ў гэтай сутычцы баявы хрост. Сярод тых апошніх побач змагаліся два хлопцы, якім яшчэ ня споўнілася і дваццаці год, – Ян Заранковіч і Андрэй Тур.

Заранковіч загарадзіў шлях коннаму разбойніку, што спрабаваў уцячы з паляны. Той дзіка, быццам татарын, зароў і атакаваў маладога рыцара. Яны скрыжавалі шаблі. Адзін удар, другі, і Заранковіч маланкавым выпадам сьцяў ворага.

Правадыр разбойнікаў з некалькімі вершнікамі ўхіліўся ад бітвы з гуртом спрактыкаваных ваяроў і

кінуўся на моладзь Вітковіча. Першых двух юнакоў, якія сталі на ягоным шляху, ён засек. Цяпер бліжэй за ўсіх да галоўнага разбойніка апынуўся Заранковіч. Пераадолеўшы хвалю страху, ён скіраваў каня, каб сабой закрыць дзіру, якая ўтварылася ў іхным шыхце.

– Асьцярожна, Ян, – крыкнуў яму Тур, схапіўшыся з іншым ваяром.

Заранковіч выцяў праціўніка шабляй. Той лёгка адбіў удар і з усяе моцы ўдарыў у адказ. Ян з цяжкасьцю ўтрымаў шаблю ў руцэ. А вораг ужо замахваўся для наступнага ўдару.

"Як хутка", – прамільгнула думка ў галаве ў Заранковіча.

З вялікай цяжкасьцю ён адвёў варожы клінок убок. Але было відавочным, што трэцяга выпаду яму не адбіць.

Разбойнік нават прыўзняўся ў страмёнах, каб, уклаўшы ва ўдар усю вагу цела, зрабіць яго мацнейшым. Яго шабля стала хутка апускацца ўніз. А рука Заранковіча, у якой ён трымаў зброю, рухалася занадта павольна, нібыта чымсьці абцяжараная. Час як быццам спыніўся. У вочы Яну кінуліся падрабязнасьці, на якія ён не пасьпеў зьвярнуць увагу раней, – вораг меў дарагія бляхавыя дасьпехі, пагнуты ў некалькіх месцах шалом з апушчанай прылбіцай, на шаблі і на руцэ, што сьціскала эфэс, была кроў. Захацелася заплюшчыць вочы і болей гэтага ня бачыць, але не аднойчы бацька папярэджваў яго, навучаючы рыцарскай справе:

– Ніколі не закрывай вачэй! Глядзі на праціўніка!

Яшчэ Ян узгадаў з хатніх заняткаў, як бацька вучыў яго татарскаму прыёму рэзка зьнікаць у бок і зьвешвацца з сядла, калі няма магчымасьці адбіць удар. Так ён і зрабіў, упаўшы амаль пад самае бруха каню. Разбойнік толькі пасьпеў зьдзівіцца раптоўнасьці, з якой зьнік юнак. Шабля рассекла паветра, а сам ён страціў раўнавагу і ледзьве не абрынуўся разам са зброяй, якая пацягнула ўсё цела на дол. Ян імгненна вярнуўся на ранейшае становішча. Праціўнік яшчэ ня здолеў выпрастацца. Пасекчы безабароннага чалавека ў Заранковіча не паднялася рука. Ён скокнуў на ворага, і яны абодва зваліліся з коней. Ян сваім целам прыціснуў рыцара да зямлі.

– Здавайся, пан.

Той паспрабаваў вызваліцца, але зрабіць гэта было ня проста. Юнак моцна ўчапіўся ў яго і чакаў, пакуль нехта са сваіх не падтрымае яго.

Хутка бітва скончылася. Большасьць разбойнікаў была вынішчана, некаторых захапілі ў палон. Рыцары атачылі счэпленых праціўнікаў, разьвялі іх і дапамаглі Заранковічу ўзьняцца. Пан Вітковіч падыйшоў да правадыра.

– Устань.

Той марудна падняўся.

– Скінь шалом.

Разбойнік расшпіліў рамяні і зьняў з галавы сталёвую шапку.

Яму было каля пяцідзесяці гадоў. Поўны, круглы твар з падвойным падбародзьдзем; залысіна на галаве; невялікая бародка; нос, скрыўлены чыімсьці

моцным ударам. Страху ў поглядзе не было, хутчэй пагарда, якую ён старанна хацеў паказаць тым, у чыёй уладзе апынуўся.

– Імя?

– Пан Рольскі з Воршы.

– Дзеля разбою гэта зрабіў, ці была іншая прычына?

Разбойнік маўчаў. Пан Вітковіч сурова прамовіў:

– У Полацку, пан Рольскі, чакае цябе суд і прэнг. Зьвязаць яго, – загадаў ён жаўнерам.

У баі загінулі чацьвёра ваяроў Вітковіча. Сярод абаронцаў абозу жывымі засталіся дзесяць чалавек, амаль усе параненыя. Гаспадар абозу – заможны гандляр з Полацку – загінуў, як і двое ягоных сыноў.

Пераможца правадыра разбойнікаў Заранковіч, на якога пакуль ніхто не зьвяртаў увагі, адыйшоў убок і ў малітве дзякаваў Богу за тое, што збавіў ад сьмерці.

У гэты момант да сябра падбег Тур.

– Ну, Ян, малайчына! Такога рыцара адолеў! Хутка зробішся харунжым.

Аршак з перамогай вяртаўся назад. Калі яны прыбылі ў карчму, Рольскага, зьвязанага па руках і нагах, кінулі ў хлеў.

– Лепшага месца для зямяніна не маглі знайсьці? – сьцюдзёна запытаў ён.

– Ты сваю высакароднасьць згубіў, калі рабаваць пайшоў, – адказаў яму пан Даліва, – так што начуй са сьвіньмі. А ў Полацку табе сьсякуць галаву як вяльможнаму пану.

У абавязкі вартавога, які ахоўваў сані, цяпер увайшло яшчэ і назіраньне за Рольскім.

Пан Вітковіч прызначыў зьмену варты на ноч, а вольным жаўнерам загадаўісьці спаць. У карчме назьбіралася шмат людзей, начаваць давялося ў цеснаце. Увесь аршак Вітковіча разьмясьціўся ў адным невялікім пакоі. Перад сном ваяры сталі на малітву, схілілі галовы і падзякавалі Госпаду за мінулы дзень. Потым яны прыладзіліся проста на падлозе, паслаўшы пад сябе футры. Але заснуць адразу ўдалося далёка ня ўсім. Першая ў жыцьці бітва была для многіх занадта моцным узрушэньнем, каб пагрузіцца ў сон. Старыя жаўнеры хутка напоўнілі памяшканьне моцным храпам, а моладзь доўга не магла заснуць.

Ян Заранковіч таксама ня спаў. Перад вачыма стаяла тая паляна, кроў на сьнезе, мёртвыя целы. Чуліся гукі бою. Цяжка было асэнсаваць, што сам стаяў на парозе сьмерці і іншых пазбаўляў жыцьця.

## 2

Наступнага дня, разьвітаўшыся з Каверскім і яго ваярамі, пан Вітковіч рушыў са сваім аршаком да Полацка. Шыхт вершнікаў ехаў першым, за ім па сьнезе рухаліся санкі. Апошнімі ехалі людзі з купецкага абозу, якія засталіся жывымі. Целы забітых, складзеныя ў санках, яны везьлі з сабой.

Аддзел набліжаўся да аднаго з самых буйных і

багатых гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

За пятнаццаць вёрстаў ад Полацка насустрач ім выехаў загон казакоў. Закутыя ў мэталёвыя панцыры ваяры, узброеныя шаблямі і сагайдакамі, нечакана зьявіліся перад імі і, заўважыўшы незнаёмы аршак, рушылі да яго. Гэта былі гарадавыя казакі, якія за атрыманую зямлю несьлі гарнізонную службу ў многіх гарадах на ўсходняй мяжы Княства.

Пан Вітковіч выехаў наперад. Да яго зьвярнуўся камандзір казакоў.

– Стольнік Жаба. Ахоўная служба Полацку. Хто вы і куды кіруецеся?

– Пан Вітковіч, паручнік князя Радзівіла Чорнага. На загад канцлера едзем да полацкага ваяводы.

– А гэта хто? – спытаў Жаба, паказаўшы на Рольскага, які са зьвязанымі рукамі сядзеў у сядле.

– Учора разбойны аршак пад яго правадырствам напаў на купецкі абоз. Мы прыйшлі на дапамогу, калі ўсё амаль было скончана. Нямногіх пасьпелі выбавіць, – пан Вітковіч паказаў на купцоў, што засталіся ў жывых.

– Я праводзіў іх з Полацка, – сказаў Жаба, – а Якуба Барцэвіча, гаспадара абозу, ведаю асабіста. Я ня бачу яго сярод жывых, – ён запытальна паглядзеў на купцоў.

– Мы вязём яго цела ў Полацак, – адказалі яму.

– І сыны яго таксама загінулі?

– Так.

Жаба грозна паглядзеў на Рольскага.

– Хапае ў нас ворагаў, дык яшчэ і сярод сваіх знаходзяцца тыя, хто гатовы нажом у сьпіну ўдарыць.

Ён пад'ехаў да Рольскага.

– І даўно ты, пан, людзей дзеля ражка забіваеш? Напэўна, не адзін абоз на тваім сумленьні?

Той панура маўчаў.

– Пахолкі судзьдзі табе разьвяжуць язык. Усе свае грахі адкрыеш, – працягваў Жаба.

– Сустрэліся б мы з табой, казак, у іншым месцы, яшчэ невядома, чый язык першым бы разьвязаўся, – злосна адказаў яму Рольскі.

Жаба падняў плечы.

– Усё можа здарыцца, але жыцьцё сваё я дорага аддам. Ці маскавіту, ці татарыну, ці свайму пярэваратню накшталт цябе.

Ён зьвярнуўся да Вітковіча:

– У нас загад суправаджаць абозы, якія едуць у Полацак. Вы ня супраць, пан паручнік?

– Ня супраць.

Ваяры рушылі далей.

– Як служба, стольнік? – спытаў Жабу пан Вітковіч. – Зімой маскавіты не турбуюць?

– Шпегі маскоўскія напоўнілі край. Увесь час іх ловім. Цягнуцца яны ў Полацак, нешта вынюхваюць. Нядаўна на гарадзкой плошчы чвартавалі двух гандляроў за сувязь з маскавітамі.

– Рыхтуюць выправу на Полацак?

– Так, хутчэй за ўсё, гэтак яно і ёсьць.

– Ваяваў супраць маскавітаў?

– Так, я змагаўся з імі пад Невялем.

– Што думаеш пра іх войска?

– Яны ваююць лікам, а не навукай. З кавалерыяй нашай ім не пара́ўнацца. Але маскавітаў заўсёды шмат. Такіх вялікіх войскаў нам не сабраць.

Пры пад'езьдзе да гораду яны дагналі сялянскія вазы з правіянтам. Сяляне саступілі з дарогі, прапускаючы аршак, і зьнялі шапкі перад шляхтай.

– На гарадзкія запасы ня скардзіцеся? – запытаў пан Вітковіч.

– Не, усё ў парадку. Вялікакняскі скарб спраўна пастаўляе правіянт для залогі. Пакуль ня скардзімся.

– Адкуль прыходзіць правіянт?

– З розных месцаў: з Успольля, Анікшт, Браслава.

Гадзінай пазьней яны наблізіліся да Полацка. Хутка ваярам выразна сталі відаць вышынныя будынкі гораду: цэрквы, вежы замку, астрог вакол Вялікага пасаду і Запалоцьця.

Уязныя брамы ў Запалоцкі пасад ахоўваў аддзел месьцічаў, узброеных алебардамі і ручніцамі. Заўважыўшы людзей з абозу Барцэвіча і мёртвыя целы на санях, яны атачылі ваяроў і пачалі распытваць іх аб тым, што здарылася. Даведаўшыся аб нападзе на абоз, месьцічы разьюшана накінуліся на Рольскага, і вершнікам давялося яго абараняць.

– Гіцаль! Будзь праклятым!

– На сваіх руку падняў!

– Мы прыйдзем паглядзець на тваю страту, разбойнік!

– Глядзі, герой, як цябе сустракаюць, – зьвярнуўся да Рольскага пан Вітковіч, – а мог жа ў войску гетмана Бацькаўшчыне паслужыць. Тады,

калі б і налажыў галавою, то ў пашане і рыцарскай славе.

Аршак мінуў Запалоцкі пасад, праехаў па мосьце над ракой Палатой і праз Усьцейскую вежу ўехаў у Верхні Замак. Па вузкіх пятляючых вулках яны накіраваліся да гарадзкой плошчы, дзе разьмяшчалася рэзыдэнцыя ваяводы.

Побач з плошчай узвышаўся пяцівежавы Сафійскі сабор, гэты сымбаль велічы старадаўняй сталіцы Полацкага княства. Сафія мела чатыры баявыя вежы, а пятая, вялікая, узвышалася над цэнтрам храма.

Яны праехалі паўз некалькі цэркваў, манастыр і спыніліся ля палацу пана Станіслава Давойны, які служыў полацкім ваяводам. Пан Вітковіч аддаў Рольскага пад адказнасьць Жабы, і казакі разам з ацалелымі купцамі накіраваліся да гарадзкога судзьдзі, а паручнік Вітковіч пайшоў да ваяводы.

– Як загадаеце дакласьці пра сябе? – спытаў яго пахолак.

– Пан Вітковіч, паручнік князя Радзівіла Чорнага, прыбыў з асабістым пасланьнем канцлера.

Праз дзесяць хвілінаў пахолак правёў яго ў апартамэнты, дзе знаходзіўся начальнік Полацкага ваяводзтва. Пан Вітковіч пакланіўся.

– Яснавяльможны пан ваявода, вам ліст ад яго сьветласьці князя Мікалая Радзівіла.

Пан Давойна зьняў гербавую пячатку і заглыбіўся ў чытаньне.

Полацкаму ваяводзе было каля шасьцідзесяці гадоў. Гэта быў высокі мажны мужчына, які

захаваў яшчэ дастаткова сілаў, каб не выглядаць старым. У маладосьці пад кіраўніцтвам кіеўскага ваяводы Андрэя Няміровіча ён змагаўся супраць татараў і маскавітаў. За добрую службу пан Няміровіч узнагародзіў яго зямельнымі ўладаньнямі. Пан Давойна аказаўся добрым гаспадаром і хутка разбагацеў, так што ў паспалітае рушэньне выстаўляў са сваіх земляў каля сотні ўзброеных вершнікаў. Нейкі час ён служыў каморнікам вялікай княгіні Боны Сфорцы, а ў 1542 годзе быў прызначаны полацкім ваяводам. У Вільні яго ваяводзкай службай былі задаволены. Пры ім у замку пабудавалі новыя ўмацаваньні, колькасьць ваяроў залогі павялічылася, абараназдольнасьць узрасла.

Пан Давойна адклаў ліст.

– Дык вы прывезьлі порах. Гэта своечасова. Давайце паглядзім.

Яны спусьціліся ў двор. Пан Вітковіч загадаў жаўнерам зьняць пакрывалы з чатырох санак. На іх стаялі вялікія парахавыя бочкі.

– А пятыя санкі? – запытаў Вітковіча ваявода.

– Пораху там няма. Гэта прыватны груз князя Радзівіла.

– Які груз, калі гэта не таямніца?

– Не, не таямніца. Гэта надрукаваныя ў Нясьвіжы кнігі. Князь дасылае іх у рэфармацкі збор Полацку.

– Якія кнігі?

– “Катэхізіс” і “Апраўданьне грэшнага чалавека перад Богам”.

– А хто аўтар гэтых працаў?

– Сымон Будны.

– Князь Радзівіл клапоціцца аб распаўсюджаньні эвангельскай веры. Вы таксама пратэстант, пан паручнік?

– Так.

– А вашы людзі?

– Амаль усе.

– А як жа Гарадзельскі прывілей?

– Думаю, артыкулы, якія вы маеце на ўвазе, у бліжэйшым часе будуць адменены. Пратэстанты ўжо складаюць большую частку паноў-рады.

– У нас у Полацку таксама многія прынялі новую веру. У мінулым годзе я прысутнічаў на адкрыцьці ў горадзе кальвінскага збору.

– Заўтра я абавязкова буду ў ім на нядзельным набажэнстве.

Яны накіраваліся ў каралеўскую клець. Так называлася разьмешчанае непадалёк ад галоўнай вежы замку памяшканьне, у якім знаходзіліся гарадзкія склады зброі, боезапасаў і харчаваньня.

Ваявода загадаў пахолкам згружаць бочкі і заносіць іх у сярэдзіну. Пан Вітковіч папытаўся дазволу спусьціцца ўніз і агледзець арсэнал.

У цэйкгаўзе стаялі дзесяць бронзавых фальканэтаў, дзьве жалезныя гарматы такога ж калібру і будовы, пяць сэрпантынаў, болей за семдзясят гакаўніцаў. Побач прыладзіліся жалезныя, медныя і каменныя формы для адліўкі ядраў і куль, запасы пораху, серы, сялітры, каменных і алавянных ядраў. Тамсама была складзена вялікая колькасьць ручніц.

Тое, што пан Вітковіч убачыў у цэйкгаўзе, трохі

супакоіла яго: калі вораг прыйдзе, зброі і боезапасаў у горадзе дастаткова.

– Калі выяжджаеце з Полацку, паручнік? – запытаў ваявода.

– Праз два дні.

– Я загадаў заняцца расквартараваньнем вашых людзей пану Мацевічу.

– Дзякую.

Ваявода выпісаў паперу аб атрыманьні дваццацёх бочак пораху і, разьвітаўшыся, зьехаў. Разам з панам Мацевічам ваяры скіраваліся ў выдзеленую ім для жыльля адну з гараднёў замкавага муру. Для пана Вітковіча быў падрыхтаваны дом у Вялікім пасадзе.

Пан Вітковіч пашыхтаваў жаўнераў каля гарадні.

– Мы выпраўляемся назад у панядзелак. А восьмай раніцы – зборка. Усім быць гатовымі да выезду. Да гэтага часу вы вольныя. У горадзе паводзіць сябе годна, адпаведна званьню хрысьціянскага жаўнера.

Заранковіч ледзь пасьпеў скласьці рэчы ў гарадні, як да яго прыляцеў Тур.

– Пайшлі ў горад.

– Я з вамі, – крыкнуў Броніс Радына, яшчэ адзін юнак з іх аршаку.

– Хадзем.

Спачатку яны агледзелі ўмацаваньні Верхняга замку. Усе гарадні былі зроблены з сасновых бярвеньняў таўшчынёй у пяць сьценаў і даўжынёй каля трох сажняў. Унутры большасьць гараднёў былі засыпаны зямлёй і каменьнем, у некаторых знаходзіліся склады і жылыя памяшканьні для ваяроў. Дах у гараднях быў зроблены з тоўстых бярвёнаў з

дашчаным пакрыцьцём для разьмяшчэньня на іх гарматаў.

Паміж гараднямі цягнуліся сьцены, таксама рубленыя з сасновых бярвёнаў. Праз пэўную, хоць часам розную, колькасьць гараднёў былі пастаўлены вежы вышынёй каля дзьвюх-трох сажняў і даўжынёй каля пяці сажняў. Каб вораг не падпаліў іх зьнізу, яны былі абкладзены дзірваном на вышыню больш за чалавечы рост.

Пасьля агляду замку жаўнеры рушылі на кірмаш. На драўляных і каменных сталах гандлявалі купцы, рамесьнікі і сяляне. Было шмат іншаземных гандляроў, у першую чаргу, з Рыгі – галоўнага гандлёвага партнэра-канкурэнта Полацка. Нямецкія купцы прапаноўвалі пакупнікам сукно з Ангельшчыны, Францыі і Фляндрыі, палатно з Галяндыі, соль, жалеза, медзь, волава, воск. У выстаўленых імі вялікіх бочках прадаваліся рыба, піва, віно.

На кірмашы стаяў характэрны гул. Людзі гучна размаўлялі, зьбівалі кошты, абмяркоўвалі тавар.

Сябры выйшлі да радоў, дзе гандлявалі прадстаўнікі полацкіх майстроў-збройнікаў – парахоўнікоў, мечнікаў, шабельнікаў і пішчальнікаў. Чаго там толькі не было! Мячы, палашы, шаблі з разнастайнымі малюнкамі эфэсаў, чаканы, кінжалы, сагайдакі з прыгожымі ўзорамі футаралаў. Прадавалася і агняпальная зброя. На сталах ляжалі гакаўніцы, у кожнай з якіх да ніжняй часткі ствала быў прываранызачэпны крук. Гэтым круком гакаўніца прымацоўвалася да сьцяны, што гасіла аддачу пры стральбе.

Тур схапіў са стала цяжкі двухручны меч і некалькі разоў узмахнуў ім у паветры.

– Вось такім мой дзед біў маскавітаў пад Воршай!

– Твой дзед удзельнічаў у той бітве? – спытаў яго Ян.

– Так, ён доўгі час служыў у гетмана Астроскага. Ахоўваў Валынь, быў пры гетмане, калі той сустракаў Бону Сфорцу, біўся з татарамі пад Сокалам, на рацэ Альшанцы, хадзіў на Ачакаў.

– Геройскі час, геройскае пакаленьне, – сказаў Заранковіч і, таксама як і Тур, секануў шабляй, якая яму спадабалася.

Заранковіч і Тур так захапіліся аглядам зброі, што не заўважылі, як Радына іх пакінуў. Пазьней яны пабачылі сябра ля лаўкі з упрыгожваньнямі, ён купляў вытанчаную драўляную шкатулку. Броніс хутка схаваў яе ў футра. Тур падыйшоў да яго.

– Ну, цяпер распавядай.

– Што распавядаць?

– Каму купіў шкатулку?

Бранілаў пачырванеў.

– Толькі не кажы, што сястры, – працягваў Тур. – Гэта Заранковіч можа маніць пра сёстраў. Ён мае чатырох.

Ян з другога боку падыйшоў да Радыны.

– Але, калі патрапіў, то кажы. Тур ад цябе не адвяжацца.

– Добра, раскажу, – паабяцаў Броніс пасьля некаторага роздуму, – але вы першыя.

– Што першыя?

– Распавядайце першыя.

– Пра што?

– Не пра сёстраў.

Заранковіч і Тур пераглянуліся.

– А мне няма пра што расказваць, – заявіў Тур і пачырванеў.

– Як гэта няма пра што? – зьдзівіўся Заранковіч. – Ты хіба не абяцаў мне ажаніцца з маёй сястрой?

– Я ж яшчэ ніводнай з іх ня бачыў!

– Ты што, мне ня верыш? Сам казаў, што я хутка стану харунжым. Я сваякоў не забуду.

Тур зьбіраўся нешта адказаць, але спыніўся і падазрона паглядзеў на Радыну.

– Але як жа ты, Бронік, спрытна ўнік адказу.

Радына ўздыхнуў.

– Гэта падарунак для маёй нарачонкі, панны Нарковіч.

– Навошта ж ты на ваенную службу паступіў, калі ў цябе ўжо заручыны былі? – спытаў Ян у Браніслава.

– Яе бацька паставіў мне такую ўмову. Сказаў, што перш чым ажаніцца, шляхціц павінны паслужыць у войску.

– У яе мудры бацька.

– Броніслаў, а можа ён хоча, каб нейкі маскавіт пазбавіў яго ад непажаданага жаніха? – спытаў Тур і гучна засьмяяўся.

– А яна будзе цябе чакаць? – запытаў Заранковіч.

– Так, – бяз ценю сумневаў адказаў Радына.

– Тады, Ян, давядзецца табе саступіць рангу харунжага Броніку, – сказаў Тур, – за харунжага бацька хутка выдасьць яе замуж.

– Дзеля панны Нарковіч ахвотна саступаю, – сказаў Ян, абняўшы сяброў за плечы і моцна сьціснуўшы іх у абдоймах.

## 3

У нядзелю раніцай Заранковіч, Тур і Радына разам выправіліся да полацкага рэфармацкага збору. Гэта быў нядаўна пабудаваны драўляны храм. Перад невялікай брамай, што адкрывала шлях у зборавы двор, стаялі некалькі дзясяткаў санак і трохі большая колькасьць коней пад сядлом.

Юнакі ўвайшлі ў сярэдзіну. Збор быў перапоўнены. Людзі, пераважна зямяне, былі апрануты па-сьвяточнаму. Большасьць была ў верхняй вопратцы, у падбітых лісіным і саболевым мехам футрах. Тыя, хто не баяўся холаду, красаваліся ў адзеньні з нямецкага, ангельскага і чэскага сукна, з шоўку і аксаміту.

Служэньне пачалося з выкананьня малітоўных сьпеваў. Усе прысутныя ўсталі са сваіх месцаў і ў адзіным духу славілі Бога. У рэфармацкай царкве маліліся пакладзенымі на музыку псальмамі. Пад дахамі збору гучала:

Багаслаў, душа мая, Госпада!
Госпадзе, Ты вялікі надзіў!
У веліч і красу апрануўся Ты!
Сьвятлом, быццам шатай,
Акутаўся Ты, нябёсы раскінуў,
Як палотны шатра.

Пасьля таго як сьціхлі малітоўныя гімны, да катэдры казнадзея падыйшоў міністар. Гэта быў немалады мужчына, апрануты ў доўгі барвовы балахон; на галаве – барэтка такога ж колеру. У руках ён трымаў Біблію. Людзі прыселі на лаўкі. Пачалася казань.

Прайшло хвілінаў пятнаццаць, калі Ян адчуў на сабе нейчы позірк. Ён павярнуўся назад і ўбачыў, што высокі сівавалосы зямянін, які сядзеў ззаду трохі ўбаку ад яго, пільна ўзіраецца на яго. Заранковіч адвярнуўся, але да канца казані адчуваў, што гэты незнаёмец глядзіць на яго.

Пасьля служэньня юнакі выйшлі са збору. Стаяў марозны сонечны дзень. Прамяні сонца, адбіваючыся ад сьнегу, сьляпілі вочы. Юнакі глядзелі на плынь людзей, якія выходзілі са збору, з цікавасьцю вывучаючы полацкіх зямянаў. Хутка Заранковіч заўважыў таго, хто глядзеў на яго падчас служэньня. Гэты пан падыйшоў да іх і спыніўся насупраць Яна.

– Заранковіч? – спытаў ён.

– Так, – зьдзіўлена адказаў Ян.

– Сын Лукаша Заранковіча з Залесься?

– Так, – Ян ня ведаў, што і думаць.

– А ты вельмі падобны да свайго бацькі. Калі цябе ўбачыў, адразу зразумеў, што ты – сын Лукаша. Не здагадваешся, хто я?

Ян пачаў пасьпешліва ўзгадваць. Ён смутна памятаў, як бацька расказваў яму пра свайго ратнага сябра, які жыў у Полацку. Ян дапусьціў, што гэта быў менавіта ён. Аб існаваньні іншых людзей у Полацку, якія б ведалі ягонага бацьку, ён ня чуў. Уся

бяда была ў тым, што Ян не запомніў ягонага імя. Таму давялося адказаць з вінаватай усьмешкай:

– Прабачце, вяльможны пан, не здагадваюся.

– Я Лявон Габрушка. Чуў пра мяне?

– Так, вядома. Вы служылі разам з маім бацькам у войску гетмана Юрыя Радзівіла. Тата распавядаў пра вас.

– Ну вось, – зямянін дабрадушна ўсьміхнуўся скрозь вусы, – нарэшце пазналі адзін аднаго. Давай абдымемся.

Адпусьціўшы Заранковіча, які ледзьве не задыхнуўся ў яго абдымках, пан Габрушка прамовіў:

– Ты, я думаю, меншы сын Лукаша. Калі памяць мяне не падводзіць, бацька назваў цябе Янам?

– Так.

– Як ён? Я ўжо даўно не атрымліваў ад яго вестак. Зрэшты, як і ён ад мяне.

Ян паціснуў плячыма.

– Усё як звычайна. За апошнія некалькі год ніякіх значных падзеяў у нас не адбылося. Толькі я паступіў на службу да князя Радзівіла.

– Чорнага?

– Так.

– Даўно?

– Ужо чатыры месяцы.

– А гэта твае баявыя таварышы? – спытаў пан Габрушка, паказаўшы на Андрэя і Браніслава.

– Так. Дазвольце вам іх адрэкамэндаваць. Гэта пан Тур з Мажэвічаў гербу “Равіч”. А гэта пан Радына з Ашмянаў гербу “Сокал”.

Сябры Яна пакланіліся.

– Як я разумею, вы ў Полацку па справах службы?

– Так. Мы ўваходзім у склад коннага аршаку, які ахоўваў абоз з порахам.

– Калі прыбылі?

– Учора.

– А вяртаецеся?

– Заўтра раніцай.

– Чаму ж ты мяне не адшукаў?

Ян нават і ня ведаў, што адказаць.

– Але добра, – махнуў рукой пан Габрушка, – калі ў вас няма іншых справаў, запрашаю вас да мяне на абед.

– З задавальненьнем прымаем вашу прапанову. Я прыняў бы яе, нават калі б у мяне былі іншыя справы, – сказаў Ян.

– Акрамя службовых, канечне, – паправіў яго пан Габрушка, – ты жаўнер і не належыш сабе.

– Вядома.

– Тады за мною.

Яны селі на коней і рушылі за панам, з якім нядаўна пазнаёміліся. Па дарозе пан Габрушка апавядаў:

– Пасьля таго як у мінулым годзе маскавіты зьявіліся пад Віцебскам і Воршай, я выправіў жонку і дзяцей да сваякоў у Горадню. У Полацку становіцца небясьпечна. Не выпадкова адзін за другім прыходзяць абозы са зброяй. Вайна наблізілася да гораду ўсутыч.

– Калі я слушна зразумеў пачутыя размовы, многія дасьведчаныя людзі лічаць, што Іван Жахлівы ў

хуткім часе павядзе свае войскі на Полацак, – сказаў Ян.

– Так, у горадзе гэта ні для каго не сакрэт. Шмат хто жыве з гатовасьцю ў кожны момант пакінуць Полацак.

– А вы?

– Ну што ты! Я меў на ўвазе жанчын і дзяцей. Выправіўшы сем'і, зямяне будуць бараніць горад. Гэта наша зямля, і нам няма куды ісьці.

Дом пана Габрушкі выгодна ўладкаваўся на ўскрайку Якіманскага пасаду. Ён стаяў у глыбіні вялікага двару, засаджанага дрэвамі і кустамі. Улетку ў ім, напэўна, было прыгожа, цяпер жа сярод голых дрэваў і кустоўя двор здаваўся вялізным і нейкім пустым.

Пахолкі павыбягалі з дому і ўзялі з рук вершнікаў лейцы. Юнакі накіраваліся за гаспадаром у вялізны драўляны гмах. Яны мінулі сені і апынуліся ў сьветлым пакоі, дзе гарэў агмень.

– Разьмяшчайцеся. Зараз накрыюць стол.

Абстаноўка ўсярэдзіне дому была простай, але пэўныя рэчы дадавалі гэтай простасьці шляхетную зграбнасьць і нават вытанчанасьць. Напрыклад, мяккія ўсходнія дываны, габелены і зброя, што віселі на сьцяне.

Хутка абед быў гатовы. Чацьвёра жаўнераў коратка памаліліся і селі за стол. Юнакі адразу заняліся зьнішчэннем страваў, а пан Габрушка, які набыў маўклівых слухачоў, расказваў пра сваю маладосьць:

– У пачатку 1534 году ў Вільні праходзіў вальны

сойм. На ім было вырашана адваёўваць у маскавітаў Смаленск і Северскую зямлю. Якраз памёр маскоўскі князь Васіль, які захапіў у нас гэтыя землі. Яго міласьць, вялікі князь Жыгімонт Стары, абвясьціў збор паспалітага рушэньня. Да Вялікадня войска павінна было сабрацца ў Менску. Камандаваў ім найвышэйшы гетман Юры Радзівіл, праслаўлены ў сечах ліцьвінскі Геркулес. Там, у Менску, мы пазнаёміліся з тваім бацькам, Ян. Мы адразу пасябравалі і бавілі шмат часу разам. А яго сапраўды было шмат. Калі казаць шчыра, ня лепшы тады быў дух у войску. Не хацелі зямяне ісьці на тую вайну. У прызначаны час войска так і не сабралася. А тыя рыцары, якія ўсё ж прыехалі, толькі і рабілі, што п'янствавалі ды ганілі гетмана. Потым і ўвогуле пачалася дэзэрцыя.

Вырушылі ў паход толькі 1 жніўня. Спачатку накіраваліся на Севершчыну, але па дарозе прыйшла вестка аб тым, што пад Смаленскам заўважана вялікае маскоўскае войска. Мы пайшлі на Магілёў. Там гетман падзяліў войска. Кіеўскага ваяводу Андрэя Няміровіча ён скіраваў на Северскую зямлю, князя Аляксандра Вішнявецкага – на Смаленск, а сам застаўся ў Магілёве. Гетман зьбіраў весткі аб праціўніку, а яны прыходзілі трывожныя. У Маскве стаяла войска для паходу на Літву. Называлася неверагодная лічба ваякаў – сто пяцьдзясят тысячаў. Так у чаканьні вайны прыйшлі халады. На зіму гетман распусьціў войска. Ня думаў ён, што маскавіты адважацца выступаць у паход да вясны. Мы выправіліся дадому. А вораг позьняй во-

сеньню рушыў на пакінутыя без абароннага заслону межы. Усходняя частка краіны была захоплена. Маскавіты выкарыстоўвалі татарскую тактыку: да вугольля выпальвалі гарады і паселішчы, забівалі люд паспаліты, а тых, хто застаўся ў жывых, гналі ў няволю ў сваю Масковію. Шмат тады было праліта крыві і сьлёз у Літве. Страх вісеў над усім Княствам. Вораг дайшоў аж да Маладэчна, а некаторыя іх аддзелы бачылі пад самой Вільняй.

Наступнага лета мы рушылі выбіваць маскавітаў з нашай зямлі. Гомель здаўся пасьля двух дзён артылерыйскага абстрэлу. Наступным быў Старадуб. Горад удалося ўзяць штурмам толькі ў канцы верасьня. Маскавіты, што заселі ў ім, былі добрымі змагарамі, ня ў прыклад тым, што здалі Гомель. Мы зрабілі падкоп і ўзарвалі частку сьцяны. А потым кінуліся ў пралом. Два разы маскавіты выбівалі нас, але ўсё ж замак быў узяты. Ваяры, разьюшаныя адчайным супрацівам, не шкадавалі нікога. Гэта была страшная рэзаніна. З цяжкасьцю гетману ўдалося спыніць яе.

У лютым 1536 году пад кіраўніцтвам яснавяльможнага пана Андрэя Няміровіча мы выправіліся пад Себеж. Нас было каля паўтарох тысячаў вершнікаў. Дарэчы, у склад харугвы разам са сваім почтам уваходзіў малады Мікалай Радзівіл, якому вы зараз служыце. Мы так і не зразумелі, чаму гетман паслаў на гэтую толькі што збудаваную маскоўскую крэпасьць гэтак мала жаўнераў. Калі наша войска падыйшло да яе, то замест штурму нам самім давялося адбівацца ад маскавітаў, якія выйшлі на вылазку. Завязалася бітва. Варожы націск быў та-

кі моцны, што мы пачалі адступаць. Нас выціснулі на лёд тамтэйшага возера. Мы адчайна біліся, але раптам пачулі жудасны гук, які прымусіў нашы сэрцы сьціснуцца ў жаху. Здагадваецеся, які? – спытаў пан Габрушка юнакоў, якія ўважліва глядзелі на яго.

– Трэск лёду, – сказаў Ян, які чуў пра гэтую бітву ад бацькі.

– Так. Пад намі паламаўся лёд. Многія ваяры апынуліся ў вадзе. І я ў тым ліку. Усё адбылося вельмі хутка. Конь пада мною праваліўся, і я не пасьпеў апамятацца, як сам ужо быў у вадзе. Гэта было страшна. Я не баяўся загінуць ад удару шаблі ці дзіды, але пайсьці на дно ў ледзяной вадзе! Я вельмі спалохаўся і ўзмаліўся Госпаду. Цяжкія дасьпехі цягнулі ўніз, вада была такой халоднай, што, здавалася, у цела ўваткнуліся тысячы вострых іголак.

Нейкім цудам мне ўдалося ўхапіцца за край лёду. Слава Госпаду! Твой бацька, Ян, і яшчэ адзін рыцар – Мацьвей Сядзерскі – кінуліся мне на дапамогу. Вакол чулася дзікае іржаньне звар’яцелых коней і страшныя крыкі людзей. Першым падбег Сядзерскі. Ён схапіў мяне за рукі і пачаў выцягваць з вады. У яго за спіной зьявіўся маскавіт з занесеным бярдышом. Я да канца дзён сваіх не забуду той хвіліны. Я паспрабаваў закрычаць, але Мацьвей па выразе майго твару ўжо зразумеў, што яму пагражае сьмерць. Ён хацеў павярнуць галаву назад, але не пасьпеў. Пачуўся глухі ўдар. Мне ў твар пырснула кроў, рукі Мацьвея аслабелі, і ён сам зваліўся на край лёду. А я з галавой пайшоў пад ваду.

Ад холаду скроні сьціснула такім абручом бо-

лю, што галава, здавалася, лопне. Ня ведаю, як мне ўдалося вынырнуць на паверхню. Я ўжо амаль чакаў, калі маскавіт ударыць мяне і спыніць пакуты. Але рана я сабраўся паміраць. Падасьпеў твой бацька і адным ударам зваліў маскавіта. Той рухнуў у ваду і сваёй вагой ледзьве не пацягнуў мяне на дно. Але Лукаш, твой бацька, і тут выхапіў мяне і дапамог мне выкараскацца. На лёдзе працягвалася змаганьне. Маскавіты кінуліся дабіваць і тапіць рыцараў, якія трапілі ў ваду. Пан Няміровіч выводзіў рэшткі войска ў лес. Мы ашчэрыліся дзідамі і мячамі і марудна адступалі са страшнага возера. Да нас даносіліся крыкі нашых таварышаў, але дапамагчы мы ім не маглі.

Так няўдала скончыўся наш паход на Себеж. Ініцыятыва ў вайне перайшла да маскавітаў. Яны абклалі Любеч і Віцебск. Замкаў не ўзялі, але пасады спалілі. Многія ў складзе паноў-рады тады вырашылі, што лепей пачаць з Масквой мірныя перамовы.

У сакавіку 1537 году было падпісана замірэньне тэрмінам на пяць год. Гомель заставаўся за Літвой, а Старадуб, за які было праліта так шмат крыві, адыходзіў да Маскоўскага Княства.

Пасьля падпісаньня мірнай угоды твой бацька зыйшоў са службы, а я служыў яшчэ сем гадоў, пасьля чаго пасяліўся ў Полацку. На шчасьце, мір працягваўся дастаткова доўга. Наступны раз я пачуў пра маскоўскае войска ў 1558 годзе, калі яно ўварвалася ў Інфлянты. Я тады адразу зразумеў: будзе новая вайна. Нельга дазволіць маскавітам захапіць

гэтыя землі. Інакш уся наша Літва апынецца безабароннай перад імі.

Пан Габрушка ўважліва паглядзеў на сваіх слухачоў.

– Я думаю: хутка пачнецца сапраўдная вайна. Тое, што было ў папярэднія пяць год, – гэта так, памежныя сутычкі. Хутка ўсе сілы прыйдзецца кінуць на вайну. У Маскве вырас магутны князь. Ён працягне справу свайго бацькі – вайну з Літвой.

Пан Габрушка яшчэ доўга апавядаў пра сябе і пра жыццё ў Полацку. Нарэшце, заўважыўшы, што юнакі канчаткова стаміліся слухаць яго, усьміхнуўся ў вусы:

– Напэўна, я старэю. Раблюся занадта балбатлівым. А вы добра выхаваныя. Амаль заснулі, але ўсё роўна намагаецеся слухаць. Ужо позна. Заставайцеся ў мяне на ноч.

– Прабачце, ня можам. Наш харунжы пераверне ўвесь горад, калі мы ня будзем начаваць разам з усімі. Тым больш, што заўтра выяжджаем.

– Ну, тады выпраўляйцеся. Толькі пачакайце яшчэ паўгадзіны. Я хачу напісаць твайму бацьку ліст.

– Ну, як вам сёньняшні вечар? – Заранковіч зірнуў на сяброў, калі яны выйшлі з дому.

– Выдатна. І ўвогуле час добра прайшоў у Полацку, – сказаў Тур.

– Заўтра ў Нясьвіж. Зноў у рукі пана харунжага.

Тур паківаў галавой.

– Ці ён нам зараз страшны? Нарэшце прыйшоў

час станавіцца рыцарамі. Тым больш, што мы ўжо ўдзельнічалі ў бітве.

Радына ўсьміхнуўся.

– Большасьць нашых таварышаў, напэўна, назвала б бойку з тымі абадранцамі хутчэй невялікай сутычкай, чым бітвай.

– Нішто сабе сутычка! Ян ледзьве не загінуў ад рукі таго Рольскага з Воршы!

– Гэта даказвае, што да сапраўдных рыцараў нам яшчэ далёка.

– Броніс, праз тваё нудоцтва панна Нарковіч ніколі ня выйдзе за цябе замуж.

## 4

У панядзелак 18 студзеня а восьмай раніцы, як і было загадана панам Вітковічам, аддзел пашыхтаваўся да ад'езду ў Нясьвіж. Харунжы пан Карытка – дасьведчаны ваяр, які больш за трыццаць год служыў Радзівілам, – агледзеў шыхт і да прыбыцьця камандзіра палічыў вершнікаў. Усе былі на месцы.

Пан Вітковіч затрымліваўся. Ваяры пачыналі хваляваца. Яму гэта было не ўласьціва.

Ён прыбыў толькі праз гадзіну. Жаўнеры, прывучаныя да жорсткай дысцыпліны, увесь гэты час прастаялі ў конным шыхце, чакаючы свайго камандзіра.

Пан Вітковіч хутка скакаў з боку палацу ваяводы Давойны.

– Усе на месцы? – спытаў ён харунжага, асадзіўшы каня.

– Усе, пан паручнік.

Пан Вітковіч абвёў вокам ваяроў. Яго ўсхваляваны твар казаў, што здарылася нешта важнае.

– На Полацак ідзе войска маскоўскага князя.

Жаўнеры ўважліва глядзелі на яго.

– Пры канцы месяца яно будзе тут.

– Колькі іх? – запытаў пан Карытка.

– Шмат. Гэтым разам вельмі шмат. Сам Іван Жахлівы ачольвае выправу.

Пан Вітковіч зрабіў паўзу.

– Я прыняў рашэньне застацца ў Полацку. Дзеля абароны гораду зараз важны кожны рыцар. Будзем змагацца з маскавітамі. Гатовыя?

– Так! – разам адказалі ваяры.

– Махвіч, ты выпраўляешся ў Нясьвіж. Павязеш ліст князю.

Махвіч быў самым юным жаўнерам у іх аршаку. Яму ледзьве споўнілася сямнаццаць год. У тым, што для падобнага даручэньня камандзір выбярэ менавіта яго, ніхто не сумняваўся. Але самому маладому ваяру, якога тры дні таму не ўзялі на бой з разбойнікамі, рашэньне пана Вітковіча падалося несправядлівым. Кроў кінулася яму да галавы.

– Ці можна пытаньне, пане паручнік? – дрыготкім ад хваляваньня голасам запытаў ён.

– Кажы.

– Дазвольце застацца ў Полацку!

– Не дазваляю. Праз гадзіну ты мусіш пакінуць

горад і імчаць так хутка, як толькі здолееш. Ад гэтага шмат у чым залежыць наш ратунак. Князь павінны як мага хутчэй атрымаць вестку аб інвазіі.

Ён зьвярнуўся да астатніх жаўнераў:

– Зараз я вяртаюся да пана Давойны. Вы застаяцеся чакаць мяне.

Пацягнуліся дні падрыхтоўкі да абароны гораду. Некалькі тысячаў сялянаў і месьцічаў пад кіраўніцтвам старасты ўмацоўвалі сьцены замку і астрогу вакол пасадаў. Жыхары вадой палівалі валы, на якіх стаялі гарадзкія ўмацаваньні, каб яны пакрыліся ільдом і сталі нязручнымі для штурму.

Многія насельнікі пакідалі Полацак. У асноўным зьяжджалі жанчыны, старыя і дзеці. Мужчыны праводзілі сваіх родных і вярталіся, каб бараніць свае дамы.

Аднаго дня конныя Заранковіч, Радына і Тур апынуліся перад Спасаўскім манастыром, што быў заснаваны ў дванаццатым стагодзьдзі Эўфрасіньняй Полацкай. Каля манастыра стаялі некалькі санак, на якія манахіні са сьлязьмі складалі рэчы. Даведаўшыся аб набліжэньні маскоўскага войска, яны прынялі рашэньне зьехаць. З плачам сёстры пакідалі муры роднага манастыра, дзе на працягу больш чым чатырохсот гадоў не спыняліся служэньні Госпаду.

Юнакі сыйшлі з коней і дапамаглі манахіням ладаваць вазы. Калі ўсё была сабрана, жанчыны ў апошні раз разьвіталіся са сваім домам і, ня ў сілах стрымліваць рыданьняў, выправіліся ў далёкі шлях. Ваяры правялі іх да гарадзкой брамы.

– З Госпадам, сёстры!

– Дзякуй вам, браты. Мы будзем маліцца за вас.

Значна больш людзей прыбывала ў Полацак. Жыхары блізкіх і далёкіх ваколіцаў сьцягваліся ў горад на працягу двух тыдняў з таго моманту, як стала вядома аб набліжэньні маскавітаў. Усе ўцякалі ад страшнага ворага: зямяне, духоўныя, месьцічы, сяляне. Людзі ішлі сем'ямі, абцяжараныя скарбам. У сьветлы час сутак ля гарадзкіх брамаў зьбіралася шмат уцекачоў, пастаянна стваралася цісканіна. Чуліся лаянка і жаласьлівыя крыкі. Зямяне патрабавалі, каб ім саступалі дарогу і карбачамі разганялі сабраных ля брам сялянаў.

На тэрыторыі Вялікага і Запалоцкага пасадаў стаялі некалькі сотняў пакінутых насельнікамі падворкаў. На працягу двух дзён яны былі заняты, а новыя ўцекачы ўсё прыбывалі.

Войска Івана Жахлівага выйшла з Мажайску ў напрамку Тарапца, потым – на Вялікія Лукі. 16 студзеня палкі прыбылі ў Невель і адтуль рушылі на Полацак. Гэтае войска налічвала больш за васямнаццаць тысячаў баяраў, з якімі ішлі дваццаць пяць тысячаў узброеных халопаў, каля васьмі тысячаў стральцоў і сямі тысячаў казанскіх, астраханскіх ды крымскіх татараў. З маскоўскім князем на Полацак ішлі казанскія ханы Аляксандар і Сімяон, царэвічы Ібак, Тактамыш, Бэкбулат і Кайбула. Артылерыя налічвала дзьвесьце гарматаў, у лік якіх уваходзілі чатыры вялікія сьценабітныя гарматы і трыццаць шэсьць камене- і вогнекідальных машын. Праз недахоп коней гарматы, боезапасы і іншы рыштунак

цягнулі на сабе сорак тысячаў "чорных" людзей. Кожную з чатырох сьценабітных гарматаў цягнулі каля тысячы нявольнікаў.

Хто мог спыніць гэтае нашэсьце, задавалі сабе пытаньне палачане.

Дарога з Невеля да Полацка праходзіла праз лес і была занадта вузкай для вялікага маскоўскага войска. Рухацца магчыма было толькі з малой хуткасьцю. Акрамя гэтага, войска ішло ў вялікім беспарадку. Палкі перамяшаліся паміж сабою і валам сунуліся па дарозе. Іван Жахлівы вымушаны быў спыняць войска і разам з ваяводамі ставіць палкі ў баявыя парадкі.

31 студзеня загон Жабы сустрэў на подступах да гораду авангард маскавітаў. Не ўступаючы ў бой, казакі вярнуліся ў замак і даклалі аб тым, што ўбачылі. Ваявода Давойна аддаў загад коннаму аршаку пад кіраўніцтвам маладога знатнага зямяніна Яна Глябовіча атакаваць праціўніка.

– Пакуль маскоўскае войска расьцягнута па ўсёй дарозе, мы маем магчымасьць яго паскубсьці. У доўгі бой не ўвязвайцеся. Калі ня здолееце атакаваць іх раптоўна, вяртайцеся назад. Прывядзіце мне палонных, – даваў указаньні Глябовічу пан Давойна.

Пан Глябовіч узяў з сабой сто вершнікаў, у тым ліку і пятнаццаць чалавек Вітковіча. Ледзьве ня ўсё насельніцтва гораду праводзіла іх. Усе разумелі: вялікай шкоды аграмаднаму маскоўскаму войску атака гэтай жменькі ваяроў не прынясе. Але чаму б не скарыстацца часовай слабасьцю праціўніка? Можа, дзякуючы такім "камарыным укусам" і ўдасца

вытрымаць аблогу? Ці выйграць час да прыходу дапамогі.

Гарадзкая брама адчынілася, аршак выехаў на дарогу, і ваяры шпарка пашыбавалі насустрач ворагу. Толькі камякі сьнегу вылятталі з-пад конскіх капытоў. Настрой у вершнікаў быў прыўзьняты. Чаканьне доўгай аблогі прыгнятала, а імгненная кавалерыйская атака – гэта тое, што зямяне ўмелі рабіць лепш за ўсё.

У гэты час у Заходняй Эўропе пяхотніцкія фармаваньні па ступені важнасьці ў баявых дзеях выціснулі коннае рыцарства. На палях змаганьняў панавалі ляндзкнэхты – найманыя нямецкія пяхотнікі. У войсках большасьці эўрапейскіх дзяржаваў пяхота колькасна перавышала кавалерыю. У суседняй Польшчы вершнікаў і драбаў было прыблізна пароўну. А ў Вялікім Княстве Літоўскім па-ранейшаму галоўнай дзейнай сілай была кавалерыя. Ваяваць у Літве было справай шляхецкай, а служыць у драбах шляхта лічыла ніжэй за сваю годнасьць. Здаралася, што падчас выправы вершнікі не жадалі спыняцца ў адным абозе разам з пяхотай.

На ўзлеску даволі нечакана паказаўся авангард маскавітаў. Дзьве-тры сотні вершнікаў выехалі з лесу і рушылі да Полацку. Ян упершыню бачыў перад сабою маскоўскіх ваяроў. Адразу кінулася ў вочы іх слабая экіпіроўка. Дасьпехаў ці ўвогуле не было, ці былі толькі тонкія кальчугі. Узброены яны былі дзідамі, шчытамі, крывымі шаблямі і сагайдакамі. Маскоўскія коні былі нізкарослыя, прыземленыя. З гэткім рыштункам і коньмі яны не маглі вытры-

мацць атаку ліцьвінскіх рыцараў, закутых у сталёвыя дасьпехі. Маскавіты засыпалі іх стрэламі, але вялікай шкоды не зрабілі: шчыты і дасьпехі баранілі рыцараў. Толькі пад некаторымі вершнікамі забілі коней.

Імгненьне – і супраціўнікі сутыкнуліся ў конным баі. Першыя шыхты маскавітаў былі зьмеценыя і ўтаптаныя ў зямлю. Заднія шэрагі паспрабавалі атачыць колькасна меньшых за іх ліцьвінаў, але хутка зразумелі немагчымасьць гэтага. Ліцьвіны разарвалі шыхт, падзялілі маскавітаў на дзьве вялікія групы і, у сваю чаргу, самі падзяліліся пароўну.

Ян Заранковіч адкаснуўся ад нацэленай на яго дзіды і ў адказ ударыў праціўніка. Маскавіт паспрабаваў засланіцца шчытом, але Заранковіч у апошні момант адвёў сваю дзіду ўбок, і яе вастрыё ўдарыла ў край шчыта, зрыкашэціла маскавіту ў плячо і выбіла яго з сядла. Ян адкінуў нязручную ў блізкім баі дзіду і выхапіў шаблю.

Камандзір маскавітаў мужна змагаўся і забіў некалькіх рыцараў. Вакол яго адзін за адным падалі яго ваяры, але ён усё яшчэ быў на кані. Нарэшце, яны сустрэліся з панам Глябовічам. Два камандзіры сышліся ў паядынку. Зазьвінелі шаблі, пасыпаліся ўдары адзін мацнейшы за другі. Астатнія ваяры стварылі вакол іх вольную прастору, даўшы правадырам, паводле рыцарскага закону, высьветліць, хто з іх мацнейшы. Пан Глябовіч спрытна фэхтаваў. Ён абрынуўся на супраціўніка і двойчы параніў яго. Хутчэй за ўсё, ён збіраўся захапіць маскавіта ў палон і таму не сьпяшаўся дабіваць

яго. Але вораг настолькі адчайна супраціўляўся, што сам быў блізкі да перамогі ў двубоі. Адбіўшы некалькі небясьпечных выпадаў, пан Глябовіч нанёс яму трэцюю рану, на гэты раз сьмяротную.

Сьмерць камандзіра канчаткова зламала маскавітаў. Яны ўжо не абараняліся, а павярнулі коней да лесу ў марнай спробе ўратавацца. Гэтага ім зрабіць не далі.

Амаль увесь маскоўскі аддзел быў перабіты, калі з лесу з моцнымі крыкамі выскачылі татары. Цяпер Ян увачавідкі пабачыў яшчэ аднаго спрадвечнага ворага сваёй краіны, наезды якога былі сапраўднай бядой для Княства. Заранковіч адразу зьвярнуў увагу на тое, што татары таксама былі на нязвыкла малых для яго погляду конях.

Пан Глябовіч падаў каманду злучыць шыхт, і ліцьвінскія ваяры схапіліся з праціўнікам. Звон сталі заглушаўся крыкамі татараў. Аддзел пана Вітковіча змагаўся на правым фланзе. Супраць закутых у латы рыцараў татары, як і маскавіты, ня ўстоялі. І першымі іх шыхт прарвалі менавіта жаўнеры пана Вітковіча. Яны зьмялі татараў, з якімі сутыкнуліся, і прымусілі іх рассыпацца. Для астатніх ваяроў маскоўскага цара гэта паслужыла сыгналам да ўцёкаў. З тым жа дзікім гігатаньнем, з якім татары выскачылі з лесу, яны і памчаліся назад, пакінуўшы ляжаць на сьнезе многіх забітых.

Пан Глябовіч забараніў іх перасьледаваць. Усім была вядома ваенная тактыка татараў падманным адыходам зававліваць ворагаў у засаду. Да таго ж, прыйшла пара вяртацца ў горад. Сваёй мэты яны да-

сягнулі. Працягваць змаганьне было небясьпечна. Напэўна, ужо падыходзілі вялікія сілы праціўніка.

Вершнікі паімчалі назад. На конях маскавітаў яны везьлі палонных. Калі аршак пана Глябовіча вярнуўся ў горад, жыхары радаснымі воклічамі сустракалі жаўнераў і афіцэраў. Разьлік пана Давойны апраўдаўся: гэтая невялікая перамога ўзьняла баявы дух абаронцаў, і цяпер ворага чакалі не з асуджанасьцю і страхам, а з рашучасьцю ўсімі сіламі супрацьстаяць захопнікам.

Доўга чакаць не давялося. Ужо ў той самы дзень званы ўсіх цэркваў білі ў набат. Жыхары рушылі да Сафійскага сабору. Перад галоўным храмам гораду было прызначана месца збору ўсіх абаронцаў Полацка.

Каля сабору перазвон заглушаўся барабанным пошчакам і гукам вайсковых трубаў ды літаўраў, пад якія шыхтаваліся зямяне, панцырныя баяры, гарадавыя казакі. Былі яшчэ найманыя ваяры, у асноўным, з Польшчы.

Узброены рыцары былі “па-гусарску”: у руках дзіды даўжынёй каля чатырох сажняў і шчыты з выявамі асабістых гербаў, на баку – шаблі ці мячы. Ліцьвінскія зямяне былі апрануты ў панцыры, на галовах – шаломы з прылбіцамі. Польскія рыцары адрозьніваліся ад ліцьвінскіх бляхавымі дасьпехамі і шышакамі замест цяжкіх шаломаў. Казакі і панцырныя баяры таксама былі закутыя ў дасьпехі. Замест дзідаў у руках яны трымалі мячы і рагаціны. Усе яны былі ўзброены сагайдакамі.

Гэта была кавалерыя – галоўная ўдарная сіла

войскаў Вялікага Княства Літоўскага. Але, пакольکі аблога вымушала вершнікаў сыйсьці з коней, то гэтая сіла шмат у чым траціла сваю эфэктыўнасьць.

Побач з вершнікамі стаялі пяхотнікі. У асноўным, гэта былі рамесьнікі і купцы. Узбраеньне і абарончае абмундзіраваньне ў іх было самае разнастайнае. Са зброі яны мелі дзіды, алебарды, сякеры, сагайдакі. Шмат у каго былі ручніцы. Дасьпехаў у большасьці не было. Гэтыя пастаўленыя ў баявым шыхце аддзелы атачала чалавечае мора сялянаў і гарадзкой беднаты, якія таксама прыйшлі на збор з той зброяй, што мелі: з доўгімі завостранымі шастамі, баграмі, косамі, сякерамі.

Перад ваярамі стаялі ваявода Давойна, полацкі япіскап Арсэн і некалькі знатных зямянаў.

Ваявода абвёў войска позіркам.

– Я ня буду казаць шмат. Вы ўсё ведаеце самі. Адзіны шанец уратавацца для нас – гэта выстаяць з Божай дапамогай. Хай ніхто не спадзяецца на літасьць маскоўскага князя. Калі маскавіты ўварвуцца ў горад, яны не пашкадуюць нікога. І ведайце: дапамога да нас прыйдзе. Да вялікага князя, паноў-рады і канцлера выпраўлены вестуны. Нас не пакінуць адных. Галоўнае пратрымацца да прыходу нашых войскаў. Хай ніхто не шкадуе сябе, і тады мы пераможам. Нас ня так шмат, але перамога не ў вялікім мностве ваяроў, а ў сіле духу. Мы стаім на сваёй, Богам дадзенай, зямлі і будзем стаяць на ёй да канца. Усё, з Богам!

Да народу зьвярнуўся япіскап:

– Усе справы чалавечыя марныя, калі няма на іх

Божага дабраславеньня. Давайце ў малітве зьвернемся да Госпада, бо ўсялякая перамога ад Бога.

У шматтысячным сходзе людзей наступіла цішыня. Тут сабраліся хрысьціяне розных канфэсіяў: праваслаўныя, пратэстанты, каталікі. Але ўсе яны верылі ў Аднаго Бога і ў Адзінага Збаўцу Ісуса Хрыста, а ў гэтую хвіліну перад агульнай небясьпекай тым больш забыліся на адрозьненьні. Сэрцы і вусны ўсіх сабраных зьвярнуліся да Госпада.

Пралунаў зычны голас япіскапа:

– Літасьцівы Госпад! Усе мы просім Тваёй абароны ў гэты складаны час. Вораг падыходзіць да нашага гораду. Узмацні нашыя сэрцы, узмацні нашыя рукі. Дай нам сілы выстаяць і перамагчы. Спашлі нам выбаўленьне. Толькі на Цябе, Адзінага Бога, мы спадзяемся. Усё ў Тваіх руках. У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, хай так станецца, – і ўсе разам сказалі:

– Амэн.

– Ідзеце і змагайцеся. Выканайце свой абавязак сумленна. Бо няма большай любові, як тая, калі нехта душу сваю кладзе за братоў сваіх. Мы ўвесь час будзем маліцца за вас, – прамовіў япіскап да ваяроў.

Ваявода сабраў сваіх памочнікаў і даваў ім апошнія ўказаньні. Аддзелы пачалі пакідаць месцы збору і накіроўваліся на ўказаныя ім месцы нясеньня службы.

Людзі пана Вітковіча паступілі пад камандаваньне Яна Глябовіча, які кіраваў абаронай Запалоцкага пасаду. Пан Вітковіч быў прызначаны адказным за абарону вялікага адрэзку пасадзкага астрогу. Да

ягонага аддзелу далучыліся шэсьцьдзясят зямянаў і аддзел рамесьнікаў.

Нясьвіскія жаўнеры прыбылі на месца. Пан Вітковіч загадаў ваярам разьмеркавацца ўздоўж астрогу. Жаўнеры займалі баявыя пазыцыі на сьценах. З каралеўскай клеці прынесьлі зьвязаныя па дзесяць штук ручніцы і пачалі раздаваць іх ваярам. На сьценах заканчвалі ладаваць гарматы. У асноўным, стаялі лёгкія фальканэты і сэрпантыны, паміж імі ўзвышаліся васьміпудовыя фальконы з доўгімі ствамі і кароткаствольныя буйнакалібэрныя мартыры. Побач разьмяшчаліся бочкі з порахам і складзеныя пірамідамі ядры.

Хутка першыя маскавіты зьявіліся на дарозе. Гэта былі конныя аршакі. Сярод іх, напэўна, былі тыя, каго разьбілі ваяры пана Глябовіча.

Жыхары Полацка сабраліся ля сьценаў і ўважліва глядзелі на прышлага ворага. Усьлед за перадавымі палкамі зьявіліся наступныя, і цяпер маскавіты ішлі бесьперапынным патокам. Адзін за адным зьяўляліся стралецкія палкі. Палачанаў уразіла, што гарматы і гружаныя сані цягнулі ня коні, а вялізарная колькасьць халопаў, якіх падганялі бізунамі.

То там, то тут маскавіты падыходзілі блізка да сьценаў гораду і выкрыквалі на адрас ліцьвінаў пагрозы ды зьнявагі. Ім адказвалі выстраламі з гарматаў, ручніцаў і лукаў. Група з васьмі стральцоў доўгі час стаяла насупраць Сафійскай вежы і асыпала палачанаў насьмешкамі. З вежы па іх вяла агонь гармата, але пры выстралах яны разьбяга-

ліся ў розныя бакі, а потым непашкоджанымі вярталіся на папярэдняе месца. Ззаду ў іх, на бясьпечнай адлегласьці, сабраўся вялізны натоўп, што крыкамі падбадзёрваў сьмельчакоў. Нарэшце ў вежу падняўся галоўны полацкі гарматнік Войцах Міклашэвіч. Два ягоныя выстралы таксама не дасягнулі мэты. Пасьля трэцяга стральцы, як звычайна, расьсеяліся, але ядро ўпала недалёка ад аднаго з іх, зрыкашэціла ад зямлі і ўдарыла ў яго, разарваўшы цела на дзьве часткі. З замку прагучаў трыюмфальны крык некалькіх тысяч палачанаў, якія назіралі за гэтай карцінай. Стральцы крычалі ім у адказ пагрозы, але ўжо з бясьпечнай адлегласьці.

Высака ўзьняўшы над сабою белы сьцяг, да брамы падыйшлі трое пасланцоў ад маскавітаў.

– Што вам? – крыкнулі ім са сьценаў.

– Царскія граматы полацкаму ваяводзе.

Пасланцоў пусьцілі. Жаўнеры ўзялі іх у шчыльнае кола і павялі да палацу пана Давойны. Сярод мноства сабраных знайшліся тыя, хто пазнаў у іх полацкіх жыхароў. Натоўп разьюшыўся. Дзясяткі рук пацягнуліся да здраднікаў, каб разарваць іх. Жаўнерам з цяжкасьцю ўдалося стрымаць гэты націск і абараніць “маскоўскіх пасланцоў”. Яны схаваліся ў рэзідэнцыі ваяводы.

Суправаджальнікі не разыходзіліся і чакалі заканчэньня прыёму. Праз паўгадзіны Станіслаў Давойна выйшаў на вуліцу разам з пасланцамі, якія мелі спалоханы выгляд. У натоўпе падняліся моцныя крыкі з патрабаваньнем выдаць здраднікаў. Ваявода

пачакаў, пакуль галас сьціхне, і падняў над галавой прынесеныя пасланцамі граматы.

– Маскоўскі князь Іван патрабуе, каб мы склалі зброю, і называе сябе нашым сапраўдным валадаром.

Крыкі гневу прагучалі яму ў адказ. Палачане таксама патрабавалі расправіцца з перабежчыкамі.

Ваявода кінуў маскоўскія граматы на зямлю і растаптаў іх нагой. На пасланцоў ён указаў ахове:

– Павесіць іх.

Прысуд навёў на здраднікаў жах і трымценьне:

– Яснавяльможны пан, зьлітуйцеся...

– Мы ж паслы цара маскоўскага.

– Падданымі вялікага князя літоўскага вы сталі раней, – адказаў ім пан Давойна.

Ахоўнікі сьцягнулі іх з ганку, і далей іх лёсам заняўся натоўп, які і прывёў прысуд у выкананьне.

Маскоўскія войскі ішлі на працягу ўсяго дня 31 студзеня. Ваяводы растаўлялі палкі, разьбівалі табары. Ваяры капалі шанцы і будавалі артылерыйскія батарэі. Вораг атачаў горад, і хутка Полацак апынуўся ў коле. У многіх абаронцаў гораду сьціскаліся сэрцы пры выглядзе вялізарнага войска, якое падыйшло да яго сьценаў.

Іван Жахлівы накіраваў конныя аддзелы паліць бліжэйшыя вёскі. За тры вярсты ад гораду маскавіты пачалі будаваць абложныя туры. З надыходам змроку полымя вогнішчаў асьвяціла маскоўскія табары вакол гораду. Ваяры адпачывалі пасьля доўгага пераходу. А з другога боку сьценаў за імі назіралі тыя, хто падчас аблогі будзе ім супрацьстаяць. І мала хто ў гэтую трывожную ноч змог задрамаць.

## 5

Наступнага дня маскавіты пачалі абстрэльваць Полацак. Праз сьцены паляцелі ядры, камяні і агонь. З гораду распачалі страляніну ў адказ. Воблакі парахавога дыму ахінулі старадаўнюю сталіцу крывічоў. Страшэнны грукат гарматаў скаланаў паветра. Загарэлася шмат дамоў. Вялікі і Запалоцкі пасады напоўніліся чорным дымам, які рэзаў вочы і забіваў лёгкія абаронцам гораду.

Артабстрэл працягваўся каля васьмі гадзінаў. Пасьля гэтага маскоўскія ваяводы пачалі шыхтаваць войскі для штурму.

– Ну, Ян, зараз пачнецца, – Тур змог перакрычаць грукат гарматаў, толькі нахіліўшыся да самага вуха сябра.

Заранковіч моўчкі кіўнуў галавой і мацней сьціснуў ручніцу вільготнымі далонямі.

Маскавіты рушылі на штурм. Першымі ішлі баярскія халопы, якія былі асуджаны на немінучую пагібель. Полацкая артылерыя залп за залпам высякала іх шэрагі. Ядры і карцеч уразаліся ў бягучую масу, разрывалі людзей на кавалкі, адрывалі ў іх галовы і канечнасьці, несьлі сьмерць і жахлівыя раны. Але па целах загіблых беглі наступныя ваяры, і натоўп рушыў да сьценаў гораду. Калі маскавіты апынуліся на дастатковай адлегласьці, да грукату гарматаў далучыліся ціхія пляскачы ад агню ручніц. Па наступоўцах ударылі лукі.

Заранковіч выстраліў па ворагу, які набліжаўся, быццам тысячагаловая пачвара, і аддаў ручніцу на

перазарадку. Непрыяцель быў зусім блізка. Магчыма было разглядзець тых, хто бег у першых шэрагах. Абарончай экіпіроўкі выстаўленыя наперад халопы ня мелі. Ядры, кулі, стрэлы касілі іх як траву. Але іх было вельмі шмат. Нават шквальны агонь ня быў здольны спыніць наступ. Некалькі разоў халопы спрабавалі павярнуць назад, але стральцы, якія ішлі ззаду, спынялі іх і гналі наперад.

Першыя шэрагі маскавітаў спусьціліся ў роў. Штурхаючы адзін аднаго, яны пачалі ўзьбірацца наверх. Сьцены гораду ашчэрыліся дзідамі і алебардамі.

Заранковіч стрэліў у ворага, які паказаўся з рову, той упаў, але ягонае цела зараз жа накрыла хваля чалавечага мора, што імкнулася наверх, да сьценаў.

Маскавіты, якія ішлі першымі, сьлізгалі на абледзянелых валах, падалі, спрабавалі адступіць, але натоўп, што напіраў ззаду, літаральна вынес іх да сьценаў астрогу.

Ян адкінуў ручніцу, ад якой ужо не было карысьці, і схапіў дзіду. Вось ужо захопнікі зьявіліся пад самымі сьценамі. Па прынесеных з сабой лесьвіцах яны пачалі лезьці ўгору. Зьверху на іх паліліся гарачая смала і кіпень. Ян ударыў маскавіта, які поўз па лесьвіцы, але яго месца адразу заняў наступны. Пачалася рукапашная. Людзі з абодвух бакоў звар'яцелі ад лютасьці і разьюшана забівалі адзін аднаго.

Пекла працягвалася некалькі гадзінаў. На адрэзку астрога, за абарону якога адказваў пан Вітковіч, толькі аднойчы зьявілася пагроза прарыву

маскавітаў. Некалькі чалавек праціўніка на чале з ваяром гіганцкага росту здолелі перабрацца цераз сьцяну. Ад мяча волата загінулі некалькі зямянаў, якія спрабавалі выбіць ворагаў. Да небясьпечнага месца адразу накіраваўся пан Вітковіч і скрыжаваў зброю з маскавітам. На імгненьне падалося, што і яго, спрактыкаванага ваяра, скрышыць сваёй вялізарнай сілай страшны вораг, такімі моцнымі былі ўдары маскавіта. Але не, меч паручніка рухаўся хутчэй. Колючым ударам ён праткнуў грудзі непрыяцелю. Са страшным крыкам той упаў на дол. Пан Вітковіч скінуў адоленага праціўніка са сьцяны. Астатніх маскавітаў, якія прарваліся разам з волатам, пасеклі яго жаўнеры.

Нарэшце націск маскавітаў саслабеў. Яны ўжо ня так разьюшана ішлі на сьцены. Нават стральцы, якія напіралі ззаду, не маглі прымусіць халопаў ісьці на ліцьвінскія мячы і дзіды. Па ворагу, які сабраўся каля сьценаў, павялі агонь з ручніцаў. Гэта вырашыла справу. Маскавіты павярнулі назад. Першы штурм Полацак вытрымаў.

Страшэннае відовішча адкрылася абаронцам гораду, калі вораг адступіў. Вялікая колькасьць трупаў ляжала на валах, унутры рову і на значнай адлегласьці перад ім. Засьпетыя сьмерцю людзі ляжалі ў самых разнастайных позах. Недзе са стогнамі варушыліся параненыя. Яны былі асуджаны загінуць ад рук сялянаў, якія высыпалі з места дабіваць праціўніка. Маскоўскіх ваяроў, ледзь жывых, зьнявечаных страшнымі ранамі, раздушаных сваімі

ж войскамі, сяляне жорстка забівалі, выліваючы на іх усю лютасьць да ненавіснага ворага.

Ян стомлена прыхіліўся да сьцяны. Жах ад убачанага за апошнія некалькі гадзінаў ён ня мог уявіць сабе нават у самым жудасным сьне. Гэта было пекла на зямлі. Падчас бою ён быў быццам у тумане і акрамя ворагаў, якія ўпарта лезьлі на сьцены, нічога болей не заўважаў, але зараз ад выгляду крыві, зьнявечаных трупаў, адсечаных рук да горла падступіла млыць.

Наступныя некалькі дзён маскавіты абстрэльвалі горад. Агонь вялі з усіх гарматаў. Полацак усейвалі запальныя зарады, якія выраблялiся з пораху, пакрытага смалой. Зарады імкліва пралятали над галовамі абаронцаў і, пакідаючы ў паветры вогненныя сьляды, падалі на дахі драўляных будынкаў. Пасады былі ў агні.

З гораду вялі агонь у адказ. На астрожным адрэзку, што абаранялі людзі пана Вітковіча, працаваў полацкі гарматнік Мацьвей Воўк. Гарматаў у маскавітаў было ў пяць разоў болей. Каб хоць неяк кампэнсаваць гэтую перавагу праціўніка, полацкія гарматнікі імкнуліся пераўзыходзіць маскоўцаў у хуткасьці стральбы.

Мацьвей Воўк пасылаў праціўніку ядро за ядром. Па ягоным твары цяклі струмяні поту, ён скінуў з сябе футра і застаўся ў адной кашулі, якая на сьпіне прамокла наскрозь. Ад яго цела на марозе ішла пара. Пан гарматнік нізка прыгінаўся да рулі, старанна наводзіў гармату і прыкладаў пожаг да кноту. Гармата выштурхоўвала з сябе каменнае ці алавянае ядро,

якое ў воблаку дыму і агню вылятала з рулі. Біў ён трапна, псаваў гарматы маскавітаў і прымушаў ворага спыняць агонь.

Кожны полацкі жыхар удзельнічаў у абароне. Тыя, хто ня быў на сьценах, тушылі пажары. Як толькі маскавіты спынялі страляніну, месьцічы ў сьпешным парадку аднаўлялі пашкоджаньні астрогу.

Падыходзілі да заканчэньня шостыя суткі аблогі. Быў позьні вечар. Ваяры абодвух войскаў адпачывалі. Заранковіч і Тур, у гэтую ноч вольныя ад службы, разьмясьціліся разам з іншымі жаўнерамі пана Вітковіча ў адным з дамоў Запалоцкага пасаду, які гаспадары пакінулі пасьля пачатку абстрэлу. Самога пана Вітковіча не было. Ваявода Давойна выклікаў яго на раду.

Андрэй і Ян ляжалі на суседніх ложках. Нягледзячы на моцную стомленасьць, заснуць абодва не маглі. Трывожна было на душы.

– Чуў, што гавораць пра запас ежы ў горадзе? – спытаў Тур.

Ян, не расплюшчваючы вачэй, адмоўна памахаў галавой.

– Не.

– Харчоў зусім не засталося.

– Гэта было ясна з таго, як нас кармілі апошнія два дні.

– Ян, дык прайшло ўсяго шэсьць дзён! Некаторыя гарады месяцамі вытрымліваюць аблогу. Значыць, Полацак ня быў падрыхтаваны да прыходу маскавітаў.

– Колькасьць жыхароў павялічылася. Тут увесь Полацкі павет сабраўся.

– І што, цяжка было гэта прадугледзець?

– Можна было. Але, па-першае, ніхто не чакаў ворага зімой. Лічылася, што маскавіты павінны прыйсьці з надыходам цяпла. Па-другое, як гэта заўсёды бывае, напэўна, не хапіла грошай.

– Трэба было іх дастаць.

– Дзе?

– Ня ведаю. Пан Давойна прызначаны на пасаду ваяводы ў тым ліку і для вырашэньня гэтага пытаньня.

– Ён не ўсемагутны. Дарэчы, зброі і боезапасаў падрыхтавана дастаткова. І ў прынцыпе, калі выбіраць паміж запасамі пораху і ежы, то я выбяру першае.

– Ну, пры доўгай адсутнасьці ежы запасы пораху таксама могуць не спатрэбіцца. А адкуль ты ведаеш, што пораху дастаткова? Можа, ён таксама хутка скончыцца?

– Пан Вітковіч казаў.

– Ты бачыў, якія праломы робяць у астрозе гэтыя аграмадныя гарматы маскавітаў? – запытаў Тур.

– Бачыў.

– З такімі пашкоджаньнямі сьценаў мы можам ня вытрымаць наступнага штурму.

– Я чуў, як пан Карытка казаў, што, магчыма, пасады прыйдзецца падпаліць і адступіць за сьцены замку.

– Але яго тэрыторыя зусім невялікая. Усе там ня зьмесьцяцца.

– Я ня ведаю, Андрэй.

У дом увайшоў пан Вітковіч. Жаўнеры ўсталі.

– Адпачываць нам сёньня таксама не давядзецца, – сказаў камандзір, – праз дзьве гадзіны робім вылазку на батарэю маскавітаў. Будзем адбіваць гарматы.

Адказным за гэту выправу ваявода прызначыў пана Глябовіча. З сабой ён узяў тых жаўнераў, з якімі хадзіў сустракаць маскавітаў. Праз патаемны ход, што ішоў пад астрогам, яны выбраліся за межы Запалоцкага пасаду. Наперадзе ў начной імгле знаходзілася батарэя маскавітаў. Ваяры накіраваліся да яе. Калі яны падышлі бліжэй, пан Глябовіч загадаў усім залегчы і далей рухацца паўзком.

Заранковіч, Тур і Радына знаходзіліся побач. Сьціскаючы ў руках шаблі, яны паўзлі па сьнезе сьледам за панам Вітковічам. На сабе яны таксама несьлі порах і карцеч, каб імі зарадзіць захопленыя гарматы, а не шукаць у цемры варожыя боезапасы.

Маскоўскія вартавыя іх прыкмецілі. Пан Вітковіч першым убачыў наперадзе агеньчык, што апускаўся да кноту.

– Прыгнуцца, – моцна закрычаў ён, і зараз жа начную цемру разадрала яркая бліскавіца. Ударыў грукат гарматнага стрэлу. Ян мацней уціснуўся ў сьнег. Зусім побач з ім нешта прасьвістала, нехта з жаўнераў коратка ўскрыкнуў і навекі змоўк.

– Наперад! – прагучала каманда пана Глябовіча. Ліцьвіны, ускочыўшы на ногі, пабеглі на ворага. У паветры засьвісталі стрэлы. Ударыў другі гарматны

стрэл, трэці. Многія ваяры паваліліся, скошаныя карцечай.

Вось і батарэя. Яны імкліва ўварваліся на яе тэрыторыю.

Ян убачыў перад сабой маскавіта і паласнуў яго шабляй па галаве. З цемры выбег яшчэ адзін праціўнік. Яны скрыжавалі клінкі, і Ян з цяжкасьцю адкаснуўся ад шаблі, але выпадам у адказ пакалаў маскавіта.

Начная цемра агалашалася крыкамі. Сонныя маскавіты, дрэнна цямячы, што адбываецца, выбягалі проста на ліцьвінаў і гінулі пад іх шаблямі. Чуліся праклёны, стогны, просьбы аб ратунку. Невялікая група маскавітаў арганізавала абарону, астатнія кінуліся ўцякаць.

Ваяры Глябовіча спрабавалі зламаць супраціў рэшты маскавітаў. Звон шабель чуўся ўсё цішэй. Адзін за адным маскоўцы палі. Батарэя была ўзятая. Але бой толькі пачынаўся. На іх ішоў перадавы полк баярына Шарамецева.

– Разьвярнуць гарматы! – прагучала каманда пана Глябовіча.

Ваяры кінуліся выконваць загад.

Ім прыйшла дапамога з Полацку. З гораду пачалі страляць асьвятляльнымі зарадамі, выробленымі з вугалю, серы, салетры і смалы, якія былі зьмяшаны з насечаным пакцялём.

Ноч асьвяцілася яскравымі бліскавіцамі. Асьвятляльныя зарады выхоплівалі з цемры вялікую колькасьць стральцоў, якія сьпяшаліся да батарэі. Яны знаходзіліся зусім побач.

Маскавіты асыпалі батарэю стрэламі. Мыслоўскі, які стаяў побач з Янам, ускрыкнуў і зваліўся на зямлю – страла трапіла яму ў твар. Заранковіч нахіліўся да яго. Ён быў мёртвы.

Ліцьвіны зарадзілі гармату. Чарговы зарад з Полацку асьвяціў маскоўцаў, якія падыйшлі зусім блізка. Яшчэ хвіліна прамаруджаньня і яны возьмуць батарэю.

– Агонь! – скамандаваў пан Глябовіч.

Гарматы ўдарылі па ворагу. Залп зьмітузіў шыхты маскавітаў. Ад таго, што яны падыйшлі на малую адлегласьць, наступствы для іх былі жахлівымі. Стогны і крыкі данесьліся да ліцьвінскіх ваяроў.

Пан Глябовіч узьняў шаблю ўгору.

– Рубо-о-о-н! – прагучаў стары баявы кліч Полацка.

Яны кінуліся на ворага і шаблямі спынілі яго рух. Маскавіты ня вытрымалі і пачалі адступаць. Калі б яны ведалі, што ім супрацьстаіць усяго толькі невялікі гурт ваяроў! Але ў гэты момант начная цемра была саюзніцай сьмельчакам, якія, перш чым вярнуцца на батарэю, пасеклі нямала праціўнікаў.

Але тут зрабілася ясным, што батарэю не ўтрымаць. З таго боку, адкуль ішлі маскавіты, яна была неўмацаваная і яе лёгка было ўзяць штурмам. Акрамя таго, суседнія батарэі маглі накрыць шквальным агнём захопленую батарэю разам з людзьмі, што на ёй знаходзіліся.

Пан Глябовіч пакінуў людзей Вітковіча прыкрываць адступленьне, а астатніх ваяроў павёў да гораду. Маскавіты паспрабавалі перахапіць групу,

якая сыходзіла, і абышлі батарэю з флангу. Але па стральцах адкрылі гарматны агонь са сьценаў, і яны вымушаны былі адыйсьці.

Тым часам полк Шарамецева зноў рушыў на батарэю. Маскавіты бачылі адступленьне групы пана Глябовіча і вырашылі, што батарэю пакінулі ўсе ваяры, таму шчыльнай масай беглі наперад, не чакаючы сустрэць супраціў.

Ліцьвіны залеглі побач з набітымі карцечай гарматамі. На батарэі стаяла ціша, толькі чулася рыпеньне сьнегу пад нагамі маскоўцаў.

Тур узьняў галаву, жадаючы ў цемры выглядзець ворагаў, якія хутка набліжаліся. Ян рукой апусьціў яго галаву ў сьнег.

І ў гэтае імгненьне пачулася каманда пана Вітковіча:

– Агонь!

Зноў ноч асьвятлілася кароткімі бліскавіцамі. Ударыў гром гарматаў, і першыя шэрагі маскавітаў былі зьмецены вогненным сьмерчам. Стральцы кінуліся назад, пакінуўшы за сабой мёртвыя целы.

– Закляпаць гарматы, – загадаў пан Вітковіч, і жаўнеры кінуліся выконваць яго каманду.

– Сыходзім, – скамандаваў ён, калі гарматы былі папсаваныя, і паходняй падпаліў выкладзеную ім парахавую дарожку, якая вяла да знойдзеных жаўнерамі запасаў пораху маскавітаў. Праз некалькі хвілінаў увесь гэты запас паляціць у паветра.

Яны беглі назад. Толькі зараз Ян зразумеў, як шмат сілаў было страчана падчас бою. Ён цяжка дыхаў шырока расчыненым ротам, і халод-

нае марознае паветра быццам іголкамі балюча абпальвала лёгкія. Адбівалася слабое харчаваньне і недасыпаньне апошніх дзён. Ногі дрэнна слухаліся яго. Некалькі разоў ён падаў, і Тур дапамагаў яму падняцца, сам ледзь жывы ад стомленасьці.

Ззаду на батарэі пачуўся выбух вялізнай сілы. На некалькі імгненьняў ноч зьмянілася днём. Хваля гарачага паветра ўдарыла ваярам у сьпіны і зьбіла іх з ног. Чуліся крыкі маскавітаў.

Сьцены Полацку высіліся перад імі ў цемры. З кожным крокам яны станавіліся ўсё бліжэй, але колькі гэтых крокаў неабходна было зрабіць яшчэ! Для хуткага бегу Яну не хапала дыханьня. Ён адчуваў у роце прысмак крыві.

Да збаўленчых сьценаў заставалася зусім няшмат, калі "загаварыла" батарэя маскавітаў – суседка той, што была зьнішчана. Большасьць ядраў не даляталі да іх, але некаторыя рыкашэцілі ад зямлі і неслі небясьпеку.

Блізкасьць схову дадала Яну моцы. Цяпер ён быў упэўнены ў тым, што дабярэцца да астрогу. Ён нават абагнаў Тура, які бег трохі ўперадзе.

Побач у цемры па сьнезе пляснула ядро. З боку батарэі праціўніка гучалі ўсё новыя і новыя стрэлы.

Ян ці пачуў, ці адчуў, што гэтае ядро ляціць проста на іх. Але не пасьпеў ён зваліцца на зямлю, як ззаду пачуўся вусьцішны крык, ядро прасьвістала побач з Янам і ўрэзалася ў кагосьці наперадзе.

Усё ў сярэдзіне ў Заранковіча пахаладзела, калі ён зразумеў, хто бег ззаду за ім.

– Андрусь! – закрычаў ён, у надзеі пачуць знаёмы голас.

Ніхто не адказаў.

Ян апусьціўся на калені і папоўз назад. Маскавіты білі як звар'яцелыя. Яшчэ некалькі ядраў ляснулі побач з ім.

– Тур! – яшчэ раз крыкнуў Заранковіч.

Нічога.

Калі ён знайшоў сябра, той яшчэ быў жывы, бо сваёй рукой сьціснуў руку Яна. Але хутка хватка Тура саслабла і, як Заранковіч ні крычаў, ніякіх прыкметаў жыцьця Андрэй не падаваў. Ян падняў сябра на рукі і, не зьвяртаючы ніякай увагі на стрэлы маскавітаў, павольна панёс яго да астрога. Яму атрымалася дабрацца да схованкі, дзе цела Тура прынялі жаўнеры ягонага аддзелу, а сам Ян укленчыў зьняможаны. Над Андрэем схіліўся пан Вітковіч. Праз хвіліну камандзір падняўся на ногі. Ян з надзеяй паглядзеў на яго, але пан Вітковіч адмоўна памахаў галавой. Ян перавёў позірк на мёртвае цела сябра. Хацелася плакаць, але сьлёзаў не было, і ад таго стала яшчэ цяжэй.

Гэтая няўдалая вылазка моцна падарвала баявы дух абаронцаў гораду. Сярод месьцічаў усё часьцей гучалі галасы аб здачы Полацка. Пан Давойна загадаў павесіць некалькіх чалавек, якія распаўсюджвалі панічныя чуткі.

Нягледзячы на тое, што галоўная мэта атакі не была дасягнута і загінула шмат ваяроў, маскавітам гэтая вылазка таксама дорага каштавала. Зноў невялікая група ліцьвінаў зьнішчыла ў некалькі разоў

большую колькасьць праціўніка. Былі выведзены са строю пятнаццаць гарматаў, узарваны вялікі запас пораху. Падчас бою гарматнае ядро трапіла ў галаву камандзіру перадавога палка баярыну Шарамецеву. На яго месца Іван Жахлівы прызначыў князя Кашына.

## 6

Недахоп харчаваньня адчуваўся ўсё мацней. Не было чым карміць нават ваяроў, якія ў першую чаргу павінны былі атрымліваць ежу.

Раніцай 8 лютага аддзел пана Вітковіча, як звычайна, заняў свае пазыцыі за астрогам. На сьценах ішла падрыхтоўка да чарговага баявога дня. Але тут Ян убачыў вялікую граматаў сялянаў, якія кіраваліся з глыбіні пасаду да гарадзкой брамы. Яны рухаліся да выхаду. Наперадзе ішоў высокі мужчына з белым сьцягам. Ваяры сыходзілі са сьценаў і, падыходзячы бліжэй да гэтай людзкой плыні, станавіліся з абодвух бакоў ад яе. І таксама маўчалі. Многія апусьцілі галовы.

– Што гэта значыць? – спытаў Заранковіч Карповіча, які стаяў побач.

– Пан Давойна загадаў выпусьціць іх з гораду.

– Чаму?

– Каб паменьшыць лік едакоў.

– Колькі іх? – спытаў Ян, аглядаючы сялянаў, якія расьцягнуліся на вялікую даўжыню.

– Кажуць, каля дзьвюх тысячаў.

– Яны ж умацоўвалі сьцены пасьля абстрэлаў.

– Зараз гэта прыйдзецца рабіць іншым.

Ваяры адчынілі браму, і сяляне выйшлі з гораду ў накірунку маскоўскага табару. Калі яны перадолелі большую частку адлегласьці, насустрач ім выбеглі вялікія гурты маскавітаў. Маскоўцы дабеглі да сялянаў і пачалі выхопліваць з натоўпу людзей, у першую чаргу рослых, крэпкіх мужчынаў і прыгожых жанчынаў. Яны разьбілі сялянаў, якія спрабавалі трымацца разам, на шматлікія астраўкі і зьмяшаліся з ліцьвінамі. Жонкі былі разьдзелены з мужамі, дзеці адарваныя ад бацькоў. Да гарадзкіх сьценаў, на якіх сабраліся ледзьве ня ўсе, хто застаўся ў Полацку, далятталі жаночыя крыкі і дзіцячы плач. Жаўнеры ў жаху глядзелі на тое, што адбывалася, і ў гневе сьціскалі ў руках зброю, праклінаючы сваё бясьсільле дапамагчы няшчасным. А праціўны табар усё больш узбуджаўся. Новыя маскавіты імчаліся на конях і беглі пешкі да ліцьвінаў, імкнучыся ўзяць удзел у падзеле нявольнікаў. Пачаліся сваркі. Знатныя вяльможы забіралі ў простых ваяроў палонных, якія былі найвялікшай каштоўнасьцю.

Хутка ўсе палонныя былі падзелены. Маскавіты разыйшліся па баявых пазыцыях. На сьнезе засталіся ляжаць некалькі забітых. Верагодна, гэта былі сяляне, якія аказалі супраціў.

Зноў, як і ў папярэднія дні, загаварылі гарматы. Маскавіты абрынулі на Полацак сапраўдны вогненны сьмерч. Асабліва вялікую шкоду прыносілі выстралы вялікіх сьценабітных гарматаў, што білі ядрамі па дваццаць і болей пудоў у адны і тыя ж месцы астрогу.

У сьценах узьнікалі прарэхі, якія месьцічам заладжваць не ўдавалася.

Увечары таго дня, калі спыніўся абмен артылерыйскімі ўдарамі, у маскоўскім табары пачалося незразумелае ажыўленьне. Полацкія ваяры сабраліся на сьценах, жадаючы даведацца, што адбываецца ў непрыяцельскім стане. Доўга ім чакаць не давялося. Маскавіты адзін за адным падыходзілі бліжэй да сьценаў. Яны крычалі, размахвалі нечым у руках і адбівалі блазенскія паклоны. Але зразумець, што гэта азначае, пакуль не ўдавалася. Нарэшце з маскоўскага табару выйшаў чалавек з белым сьцягам. Ён наблізіўся да сьценаў і закрычаў:

– Не страляйце! Я свой.

Гэта быў адзін з выгнаных да маскавітаў сялянаў. Ён падыйшоў да астрогу Запалоцкага пасаду.

– Яны прасілі перадаць падзяку за ежу, – сказаў ён ваярам.

– За якую ежу?

Селянін апусьціў галаву.

– За тую, што была схавана ў лесе пад зямлёй.

І тут усе зразумелі. На тэрыторыі, занятай маскоўскімі войскамі, у глыбокіх ямах пад зямлёй знаходзіліся запасы харчаваньня. Верагодна, нехта з выпушчаных сялянаў ведаў іх месцазнаходжаньне і паказаў яго ворагам. Крыкі абурэньня разьнесьліся сярод жаўнераў:

– Здраднікі!

– Прыстрэліць падлюку!

– Ціха! – крыкнуў пан Карытка. – Ён ні ў чым не вінаваты. Гэтых людзей саміх здрадзілі.

Ён зьвярнуўся да селяніна:

– Ты можаш не вяртацца назад. Заставайся з намі.

Той адмоўна паківаў галавой.

– Не, ня трэба. Хутка маскавіты возьмуць горад, і тады яны нікога не пашкадуюць. Лепш знаходзіцца па-за сьценамі, чым усярэдзіне.

І пайшоў назад. Ягоныя словы, сказаныя, хутчэй за ўсё, без пабочнай думкі, нагэтулькі ўразілі ваяроў, што на некаторы час сярод іх запанавала магільная цішыня. Хутка возьмуць. І бяз гэтай заявы селяніна ў многіх жаўнераў паўставала пытаньне: “А ці верыць у горадзе нехта яшчэ, апрача іх саміх, у тое, што Полацак вытрымае аблогу? І калі ніхто ня верыць, то навошта яны днём і ноччу аддаюць апошнія сілы, каб спыніць захопнікаў?”

10 лютага пан Давойна выклікаў камандзіраў на чарговую раду. Тры гадзіны пазьней пан Вітковіч вярнуўся да сваіх жаўнераў. Ён выглядаў раззлаваным.

– Усё, здымаем абарону.

– Што? – у жаху закрычалі ваяры.

– Адыходзім у замак. Гэта загад пана ваяводы. Пасады будуць падпалены і аддадзены ворагу.

– Чаму?

– Пан Давойна лічыць, што з такімі пашкоджаньнямі ў астрозе мы ня вытрымаем наступнага штурму.

– Вытрымаем! Станем у праломах з шаблямі! – пачуліся шматлікія воклічы.

– Рашэньне прынятае. Мы – жаўнеры, і выконваем загад пана ваяводы, – сказаў пан Ві-

тковіч як адрэзаў. Хоць сам ня быў згодны з гэтым рашэньнем, але заахвочваць парушэньне дысцыпліны паручнік князя Радзівіла ня мог. Полацкія зямяне яшчэ працягвалі абурацца, а ваяры з Нясьвіжу, ведаючы строгасьць камандзіра, пайшлі выконваць загад. Ян, адыходзячы, чуў, як пан Вітковіч нягучна сказаў пану Карытку:

– А Давойна слабы.

Здача пасадаў азначала паланеньне вялізарнай колькасьці паспалітага люду – за сьценамі замку ўсе, хто сабраўся ў горадзе, разьмясьціцца не маглі. На радзе ў ваяводы пан Глябовіч прапанаваў замест таго, каб аддаваць тысячы людзей маскавітам, выкарыстаць гэтыя чалавечыя сілы для маштабнай атакі на праціўніка. Малады афіцэр браўся сам узначаліць гэтую атаку, але ваявода ня даў згоду на яе правядзеньне, лічачы гэта занадта рызыкоўным.

Зноў паўтарылася карціна з выхадам палонных да маскавітаў. Толькі на гэты раз ворагу дасталася значна больш багатая здабыча. У адзін толькі царскі полк выйшлі адзінаццаць тысяч сялянаў. Астатнія палкі і татарскія станы таксама не засталіся без нявольнікаў. А ў Полацку ваяры здымаліся са сваіх пазыцыяў, падпальвалі дамы ў пасадах і адыходзілі ў замак.

Памылка пана Давойны стала відавочнай амаль адразу. Дым, які падымаўся з Запалоцкага пасаду, вецер пагнаў проста на замак. Пад прыкрыцьцём дыму маскавіты падцягнулі гарматы на блізкую адлегласьць і зараз білі наўпрост. Ваяры апынуліся

пад шквальным агнём маскоўскай артылерыі, языкі полымя зьявіліся на сьценах і ўнутры замку.

Хутка прайшла чутка аб тым, што ў горад удалося прабрацца пасланцу князя Мікалая Радзівіла Рудога. Прынесеная ім навіна абвяшчала: "Гетман даў вялікаму князю слова выратаваць Полацак і ў гэты час падыходзіць да гораду".

Гэтая навіна дайшла і да Івана Жахлівага. Здарылася гэта наступным чынам. Два палачаніны – Марк Іваніч і Фядок Хлябовіч – спрабавалі выбрацца з гораду. Але прайсьці незаўважанымі ім не ўдалося – іх злавілі казанскія татары. На допыт іх павялі да самога маскоўскага князя. Ад іх Іван Жахлівы даведаўся пра набліжэньне князя Радзівіла. Выведка маскавітаў пацьвердзіла, што ліцьвінскае войска падыходзіць да Полацка. І нават назвала колькасьць ваяроў – сорак тысяч чалавек. Адкуль узялася гэтая вялікая лічба, невядома. На самой справе гетман вёў усяго тры з паловай тысячы вершнікаў. Маскоўскі цар загадаў весьці па Полацку пастаянны абстрэл і не спыняць яго нават ноччу. З гораду павялі агонь у адказ, сканцэнтраваўшы яго на стаўцы Івана Жахлівага ў Барысаглебскім манастыры ў Бельчыцах. Білі з гарматаў, гакаўніцаў і навальных ручніц. Такога жорсткага агню з абодвух бакоў не было з пачатку аблогі. Зямля дрыжэла ад кананады, гучаў няспынны грукат, паўсюль плыў палены пах. Ядры са злавесным сьвістам пранізвалі паветра, уразаліся ў сьцены, руйнавалі будынкі, забівалі людзей. Іван Жахлівы ў мэтах бясьпекі перавёў сваю стаўку ў

царкву Георгія Вялікага, якая знаходзілася далей ад замку.

Маскавіты чаргавалі артылерыйскія абстрэлы са шматгадзіннымі штурмамі. Іван Жахлівы кідаў на замак вялікія лавы ваяроў, яны накатваліся на сьцены, нібыта гіганцкія марскія хвалі. Але на шляху гэтых хваляў паўставалі скалы стойкасьці і мужнасьці абаронцаў Полацка, аб якія яны разьбіваліся.

Ян ня мог зразумець, як ім гэта ўдавалася. Яны мала елі, амаль ня спалі, іх душыў дым, але яны ўсё адно стойка адбівалі адну атаку за другой. Многія загінулі, але тыя, хто застаўся, змагаліся за дваіх і за траіх. Ваяры чынілі сапраўдныя цуды на сьценах. Для Заранковіча ўсё бачанае ім у гэтыя дні стала неацэннай школай вайсковага мастацтва і прыкладам сапраўднай шляхетнасьці духу.

Падчас чарговай атакі, калі жаўнеры пана Вітковіча ярасна секлі маскавітаў, непадалёк ад іх паветра скалануў вялізнай сілы выбух. Выявілася, што праціўнік падвёў падкоп і ўзарваў частку сьцяны. У адной з гараднёў знаходзіўся вялікі парахавы запас, выбух якога прывёў да страшных разбурэньняў. Моцны агонь ахапіў замкавую сьцяну. Выгарэла сорак зьвёнаў сьцяны даўжынёй трыста сажняў. Маскавіты рынуліся ў пралом. Але там ім загарадзілі шлях полацкія рыцары. Пачалася крывавая сеча. Гэтая бітва пасярод палаючай, быццам у пекле, замкавай сьцяны, працягвалася некалькі гадзінаў. Маскавіты адступілі, так і не прарваўшыся ўсярэдзіну замку.

У ноч з 14 на 15 лютага Іван Жахлівы загадаў кня-

зю Васілію Сярэбранаму біць па замку запальнымі зарадамі. Яшчэ да сьвітаньня маскавітам удалося ў шмат якіх месцах падпаліць замак. Цяпер ужо ніхто не сумняваўся, што гэта канец. На прыход князя Радзівіла спадзявацца не даводзілася.

Пасьля сёмага адбітага штурму пан Давойна прыняў рашэньне выйсьці да маскоўскага князя і пачаць перамовы аб здачы гораду. Калі ваярам абвясьцілі пра гэтае рашэньне, у адказ пачуліся незадаволеныя крыкі. Жаўнеры занадта шмат заплацілі і гатовы былі плаціць яшчэ, каб не дапусьціць здачы аднаго з самых славутых местаў Вялікага Княства Літоўскага.

Пан Давойна, япіскап Арсэн з вялікім крыжом у руках і прадстаўнікі знатнай шляхты з белым сьцягам выйшлі з замку. Тыя, хто застаўся за сьценамі, назіралі, як яны марудна прайшлі паўз маскоўскіх ваяроў, якія расступіліся, і накіраваліся да стаўкі Івана Жахлівага. Абодва войскі замерлі ў чаканьні рашэньня сваіх правадыроў. Полацкая дэлегацыя вярнулася ў замак праз тры гадзіны. Пан Давойна сабраў камандзіраў і абвясьціў ім вынікі перамоваў:

– Маскоўскі князь абяцае захаваньне жыцьця, свабоды і маёмасьці кожнаму, хто здасца яму. Полацкую залогу ён згодны выпусьціць са зброяй і артылерыяй.

Ваяры з нецярплівасьцю чакалі вяртаньня сваіх камандзіраў з апошняй нарады ў полацкага ваяводы. Калі пан Вітковіч зьявіўся на сьценах, яны атачылі яго.

– Пан Давойна прыняў рашэньне здаць горад.

Хоць усе ўнутрана чакалі гэтага, крыкі абурэньня ўсё ж вырваліся з вуснаў ваяроў:

– Гэта ганьба!

– Згодны, – сказаў пан Вітковіч, – і я часткай гэтай ганьбы быць не жадаю. Цяпер выслухайце мяне. Я і яшчэ некалькі камандзіраў абвясьцілі пану ваяводзе, што мы не складзем зброю. Па-першае, я не давяраю абяцанкам маскоўскага князя. Гэты тыран ня верыць сам сабе, а хоча, каб яму паверылі нашы людзі. Ды і навошта яму адпускаць нас? Горад і так амаль у яго руках. Можа, ён ведае тое, чаго ня ведаем мы? Напрыклад, што гетман Радзівіл усё ж такі падыходзіць да Полацка. Па-другое, нават калі маскавіты выпусьцяць нас, здача гораду не дадасьць нам гонару. Дзеля чаго тады гінулі нашы сябры? Іх кроў не вадзіца, і пралілася яна не дарэмна. Вайна з Масковіяй толькі пачынаецца. Вораг моцны, і нашай дзяржаве спатрэбяцца ўсе сілы, каб перамагчы яго. Калі мы не здамося, нашая ахвяра натхніць тых рыцараў, якія будуць змагацца з ворагам пасьля нас. Наш чын стане для іх прыкладам. Але калі мы здамо горад, як жа мы зможам вярнуцца да сваіх і ўзяцца за абарону краіны? Хто паверыць, што мы пакладзём усё, што маем, нават жыцьцё, каб абараніць яе? Вось што я думаю на гэты конт. Але гэта я казаў не як камандзір, а выказваў сваё меркаваньне. Кожны з вас хай вырашае сам.

Заранковіч падыйшоў да Радыны.

– Ну што?

– Я згодны з панам Вітковічам.

– А як жа панна Нарковіч?

– Хай Госпад дасьць ёй годнага мужа. Памерці, абараняючы Радзіму, – гэта добрая сьмерць для шляхціца. А што будзе ў выпадку здачы – невядома.

– Можа, усё ж такі рызыкняце і выйдзеце з гораду?

Ян павярнуўся. Перад ім стаяў пан Габрушка.

– А вы?

– Я застаюся. Але я ўжо ў гадах. У вашым узросьце я б выйшаў.

– Хіба тут ва ўзросьце справа? – запытаў Браніслаў.

15 лютага частка войска на чале з панам Давойнам выйшла з Верхняга замку. Многія ліцьвінскія рыцары і найманыя жаўнеры адмовіліся выканаць загад ваяводы і засталіся на сваіх баявых пазыцыях.

Пан Давойна вёў войска паміж маскавітамі, якія стаялі з абодвух бакоў. Ліцьвіны ішлі са зброяй, з харугвамі, цягнулі за сабой гарматы. Побач з панам Давойнам несьлі гарадзкі скарб. Хутка яны схаваліся за сьпінамі варожых жаўнераў. Тыя, хто застаўся ў замку, пачалі рыхтавацца да абароны. Пан Вітковіч зьвярнуўся да сваіх ваяроў:

– Вось і ўсё. Напэўна, гэта наш апошні бой. Я дзякую вам за добрую службу. Змагацца побач з такімі сьмелымі жаўнерамі – вялікі гонар для мяне. Захавайце ж да канца тую мужнасьць, якую вы праяўлялі ўвесь гэты час. Няхай Госпад нам дапаможа! Памолімся, браты мае мілыя.

– Госпад Ісус, Тваё Слова кажа, што той, хто не клапоціцца пра хатніх сваіх, горш за нявернага. Няхай жа нашае жыцьцё будзе годным хрысьціянскага

імя. Дапамажы нам у апошнюю хвіліну, як Ты дапамагаў увесь гэты час. Амэн.

– Амэн, – выгукнулі сотні абветраных і абмарожаных жаўнерскіх вуснаў.

У тыя колькі хвілінаў, што заставаліся да штурму, жаўнеры разьвіталіся адзін з адным. Ян і Бронісь яшчэ раз праверылі зброю, агледзелі ручніцы, спраўдзілі, ці зручна дастаюцца корды з-за пояса, памацалі, ці не надламаліся шаблі. Апошняе, што запомнілася Яну перад бітвай, – гэта незвычайны, глыбокі блакіт свабоднага неба, па якім павольна плылі аблокі.

Хутка маскавіты наблізіліся да разбураных і спаленых сьценаў замку. Іх сустрэў залп з ручніцаў. Ліцьвіны разрадзілі агняпальную зброю і ўзяліся за шаблі. Лавіна маскоўскіх ваяроў абрынулася на іх. Пачалася бязьлітасная сеча.

На вачах Яна палі многія ваяры. Броніся забілі ўдарам дзіды, і ён бязгучна рухнуў каля Заранковіча. Пану Карытку, які адначасова змагаўся з трыма татарамі, накінулі аркан на шыю. Харунжы паваліўся, і яго праціўнікі, думаючы, што ён ня ў стане працягваць барацьбу, кінуліся на яго. Але нечакана для іх пан Карытка прыпадняўся і ўсадзіў корд у грудзі аднаму з ворагаў. Разьюшаныя татары засеклі яго шаблямі, хаця спачатку, відаць, зьбіраліся захапіць у палон. Пан Габрушка, які сек цяжкім двухручным мечам, сабраў ля сваіх ног нямала праціўнікаў, перш чым сам лёг ад удару шаблі па галаве. Побач з ім біўся казацкі стольнік Жаба. Як і абяцаў Рольскаму, сваё жыцьцё ён аддаў ворагам дорага, і перад тым як

загінуць, шмат маскоўцаў пакanaў сваёй рыцарскай рукой.

Сярод масквітаў, якія змагаліся з аддзелам пана Вітковіча, вылучаўся малады ваяр у багатых дасьпехах. Хутчэй за ўсё, гэта быў нейкі багаты баярын, якому служылі ваяры, што былі побач з ім. Сам ён у бітву не ўступаў, але актыўна кіраваў сваімі людзьмі. Акружаны некалькімі ваярамі, якія ахоўвалі яго, гэты юнак апынуўся насупраць Заранковіча.

Ян зразумеў, што гэта канец. Нікога са сваіх побач ужо не было. Некалькі хвілінаў раней ён бачыў, як пяць ці шэсьць маскавітаў атачылі пана Вітковіча, і ён зьнік за іх сьпінамі, напэўна, загінуўшы. Ян гучна закрычаў і кінуўся на ворагаў, намеціўшы перад сьмерцю пакласьці камандзіра варожага аддзелу. Ён абрынуў магутны ўдар на галаву маскавіта, які стаяў бліжэй за ўсіх. Той нават не пасьпеў падняць шаблю і зваліўся на зямлю. Праціўнікі не чакалі ад Яна такога спрыту і трохі зьбянтэжыліся. Ён паклаў шабляй другога маскоўца і апынуўся твар да твару з юнаком у дасьпехах. Ян замахнуўся, але ўдарыць ня здолеў. На яго накінуліся ззаду і з бакоў, павалілі на зямлю, некалькі разоў моцна ўдарылі, але не вастрыём зброі, а рукаяткамі шабляў і кулакамі. Ян з жахам зразумеў, што яго не зьбіраюцца забіваць, а бяруць у палон. Мноства рук пацягнуліся да яго і пачалі зрываць ягоныя дасьпехі. Багаты юнак падыйшоў да Заранковіча.

– Спрытны хлопец, – усьміхнуўся ён і ўдарыў Яна нагой у жывот. – Зьвязаць яго.

Асобныя баі ў замку ішлі на працягу ўсяго дня.

У ноч з 15 на 16 лютага супраціў быў канчаткова зламаны. Горад цалкам апынуўся ў руках маскавітаў.

18 лютага Іван Жахлівы ўехаў у Верхні замак і абвясьціў сябе князем полацкім. Яго сустрэла невялікая дэлегацыя мясцовых жыхароў, якія назвалі яго абаронцам праваслаўя ад засільля лютараў.

А што ж з войскам, якое выйшла з замку? Стаўшы на ўказанае Іванам Жахлівым месца ў полі, ліцьвінскія ваяры, атачоныя варожымі палкамі, дарэмна чакалі зьяўленьня маскоўскага князя. Пан Давойна прасіў, каб яго завялі да Івана Жахлівага. Калі маскоўцу перадалі просьбу ліцьвінскага ваяводы, ён пасьмяяўся з яго даверлівасьці і загадаў трымаць палонных бяз ежы пяць дзён. Гарадзкі скарб князь Іван загадаў сканфіскаваць і прынесьці да яго ног. Абяцаную свабоду ён даў толькі пяцістам польскім рыцарам. Кожнаму з іх ён падараваў футравую вопратку і залатыя манэты. Іван Жахлівы заявіў палякам, што з Каронай ён ваяваць не зьбіраецца, а хоча вярнуць толькі сваю вотчыну – Валынь, Падольле і Вільню. На сталіцу Вялікага Княства ён паслаў баярскую коньніцу.

Гетман Радзівіл са сваім малалікім войскам нічым ня здолеў дапамагчы Полацку і вымушаны быў адступіць у Менск.

У Полацку пачаліся пагромы. Захопнікі ўрываліся ў дамы, рабавалі, забівалі, гвалцілі.

Татары проста на тэрыторыі касьцёлу засеклі манахаў-бэрнардынаў, а храм падпалілі. Даведаўшыся пра гэта, Іван Жахлівы накіраваў аналягічную “місію” ў дамініканскі касьцёл і аддаў

агульны загад забіваць кожнага, хто жагнаецца не па-праваслаўнаму.

Маскавіт, які ўзяў у палон Заранковіча, разьмясьціўся ў багатым доме ў Верхнім замку. Апрача Яна, у яго было яшчэ каля двух дзясяткаў палонных рыцараў. Іх кінулі ў хлеў і паставілі каля ўваходу варту. А тым часам прыводзілі ўсё новых палонных, ня толькі зямянаў, але і месьцічаў. З надыходам ночы палонным прыйшлося раскладацца спаць на земляной падлозе. Яны леглі ўсе разам, і шчыльна прыцісьнуліся адзін да аднаго, каб хоць неяк сагрэцца. Але гэта не дапамагло. Спаць на прамерзлай зямлі ў халодным хляве было немагчыма. Ніхто не заснуў. Усю ноч чуліся кашаль і стогны параненых.

Ян, адчуваючы, як ледзяны холад ахоплівае сьпіну і быццам пранікае ўсярэдзіну, устаў і, адыйшоўшы ўбок, прысеў каля сьцяны. Ён з цяжкасьцю змог паварушыць замёрлымі пальцамі. Глыбокі кашаль ахапіў яго і не адпускаў некалькі хвілінаў. Раптам з цемры падыйшоў адзін з палонных зямянаў.

– Ня сьпіцца?

– Не. Яшчэ пару такіх начэй, і ім ня трэба будзе нас забіваць. Мы ўсе тут пакалеем.

Зямянін працягнуў яму руку.

– Якуб Малініч.

Ян адказаў на поціск рукі.

– Ян Заранковіч.

– Я служыў у гарнізоне. А ты прыехаў у горад ратавацца ад маскавітаў?

– Не, я служу князю Радзівілу Чорнаму. Мы

ахоўвалі пасланы канцлерам абоз з порахам. Усе мае таварышы, напэўна, загінулі. Тут няма ніводнага з іх. Хутка і я пайду за імі сьледам.

– Няма ведама, можа быць, і не.

Ян ускінуў галаву.

– Што ты хочаш сказаць?

– Ты ведаеш, хто нас паланіў?

– Не.

– Нейкі баярын Сямёнаў з Масквы.

– Малады ў дасьпехах?

– Так.

– Я ледзьве не засек яго.

Маліціч усьміхнуўся.

– Не нагадвай яму аб гэтым. Ці заўважыў, каго ён бярэ ў палон?

Ян задумаўся на хвіліну.

– Зямянаў.

– І багатых гандляроў, – дадаў Маліціч. – Калі яго людзі бралі мяне і яшчэ некалькіх ваяроў, з намі былі людзі з атраду рамесьнікаў. Дык вось, рамесьнікаў Сямёнаў загадаў забіць, а нас прывялі сюды.

– Ну і што гэта значыць?

– Я думаю, ён бярэ ў палон тых, хто здольны заплаціць выкуп.

## 7

Наступнага дня іх усіх пад моцнай аховай вывелі з Верхняга замку і пагналі за горад да Дзьвіны. Пола-

цак уяўляў сабой вялікае папялішча. Да гэтага часу гарэў Запалоцкі пасад і шматлікія будынкі ў Верхнім замку. Паўсюль на зямлі ляжалі трупы. Маскавіты, што навадніліі горад, загрузьлі ў рабаваньнях і гвалтах. На вачах палонных некалькі п'яных стральцоў за валасы цягнулі жанчыну, якая адчайна крычала. Хмары груганоў кружылі ў небе, выглядаючы шматлікую здабычу.

Да Дзьвіны гналі ня толькі іх. З усіх канцоў ішлі новыя і новыя гурты палонных. За горадам сабралася большая частка маскоўскага войска, якая атачыла захопленых у горадзе жыхароў. На рацэ была прасечана вялікая палонка, і некалькі дзясяткаў чалавек працягвалі секчы лёд, пашыраючы яе берагі.

Іван Жахлівы знаходзіўся ў атачэньні знатных баяраў, сярод якіх ён выдзяляўся дарагім царскім убранствам. На яго галаве паўзьверх шапкі быў апрануты залаты вянец, выкладзены алмазамі вялікіх памераў, у руцэ ён трымаў залаты скіпетар, з-пад расшпіленага футра быў відаць кафтан з чырвонага аксаміту, шыты буйнымі пэрламі. На шыі на залатым ланцугу віселі некалькі каштоўных камянёў. Перад князем, укленчыўшы, стаялі некалькі чалавек. Побач з імі з аголенымі шаблямі ўзвышаліся стральцы. Прыгледзеўшыся, Ян заўважыў, што тыя, хто стаяў на каленях, былі гебраямі, хутчэй за ўсё, габрайскімі старэйшынамі. Ззаду ў іх, у шчыльным коле маскавітаў, стаяла рэшта полацкіх нашчадкаў Ізраэля.

– Да Абрагама іх, – прагучала каманда Івана Жахлівага.

Занесеныя шаблі апусьціліся на галовы старэйшынаў. Пранізьліва закрычалі жанчыны. Маскавіты кінуліся да гебраяў і сталі гнаць іх на лёд, да палонкі. Некалькі чалавек вырваліся з атачэньня і паспрабавалі ўцячы. Іх падстрэлілі з лукаў. Ля палонкі маскавіты сьпіхвалі молячых аб літасьці людзей у ваду, тапілі іх дзідамі і баграмі. Хутка палонка была напоўнена мёртвымі целамі, ад яе і да берагу па лёдзе цягнуўся шырокі крывавы сьлед.

“Гасудараў суд” тым часам працягваўся. Да маскоўскага князя, які прымушаў называць сябе царом, цэлымі грамадамі падводзілі палонных, запісвалі імёны і прапаноўвалі цалаваць крыж у клятве на вернасьць яму. Хто адмаўляўся, тых забівалі. Многіх Іван Жахлівы забіў сам невялікім перначом, ад чаго ягоныя рукі і вопратка былі заліты крывёю. Пратэстантаў і каталікоў, якія адмаўляліся перахрышчвацца ў праваслаўе, забівалі адразу.

Сярод гурту з дзесяці асобаў, якія сталі перад маскавітам, Ян пазнаў міністра, што прапаведаваў у зборы ў першую нядзелю іхняга побыту ў Полацку. Нехта пацалаваў крыж на вернасьць князю маскавітаў, нехта адмовіўся і быў забіты, а міністар застаўся стаяць адзін перад Іванам Жахлівым.

– Мне паведамілі, што ты распаўсюджваў лютараву ерась, – зьвярнуўся да казнадзея маскоўскі князь – Гэта так?!

Міністар моўчкі стаяў, апусьціўшы погляд долу, ня маючы ні сілаў, ні жаданьня ўздымаць вачэй на ўсходняга дэспата.

– Адказвай цару! – закрычаў на яго адзін з баяраў.

– Так, – ціха адказаў міністар.

– Калі раскаешся і вернешся да ісьціннай веры, я зьлітуюся над табой.

– Зараз пагодзіцца, – прашаптаў зямянін, які стаяў побач з Заранковічам. Ян таксама вырашыў: міністар, напужаны тым, што адбывалася, хутчэй за ўсё, ня вытрымае выпрабаваньня.

Той нарэшце ўзьняў галаву і паглядзеў на тырана.

– Не. Ня ерась я прапаведаваў, а праўду, якая грунтуецца на Слове Божым.

Іван Жахлівы махнуў рукой.

– Тады ідзі пад лёд.

Двое стральцоў схапілі міністра і пацягнулі да ракі.

– Малайчына, – прашаптаў сусед Яна.

– Засталося і нам памерці таксама годна, – прамовіў Заранковіч.

Іншаземцам, якія былі нанятыя на службу ў полацкую залогу, маскоўскі князь прапанаваў служыць яму. Хто адмовіўся, тых ён жорстка пакараў. Так, Андрэю Гесэ, які падчас аблогі камандаваў аховай вайсковага запасу, Іван Жахлівы загадаў прастрэліць абедзьве рукі, выкалаць адно вока, агнём выпаліць палову барады і гнаць разам з жонкаю і дзецьмі ў Маскву, дзе трымаць да сьмерці.

Ян паглядзеў на чарговую групу палонных, якія паўсталі перад Іванам Жахлівым, і ледзь стрымаў крык. Сярод іх знаходзіўся пан Вітковіч. Ягоны твар быў зьнявечаны страшным шнарам, правая далонь

была адсечана, уся вопратка ў крыві. Але дастаткова было паглядзець яму ў вочы, каб зразумець, што дух яго ня быў зламаны.

– Ну што, хто з вас будзе прысягаць вярнуўшаму свае спрадвечныя землі гасудару? – спытаў баярын, які прыслугоўваў Івану Жахліваму.

– Хлусіш, сабака маскоўскі, – гучна сказаў пан Вітковіч, – ніколі гэтыя землі пад Масквой не былі.

Па натоўпе прабег выгук зьдзіўленьня. Так сьмела ніхто з палонных сёньня не размаўляў.

– Ды ты, халоп, я бачу, забываешся! – закрычаў Іван Жахлівы.

Ян з захапленьнем глядзеў на пана Вітковіча. Ні ценю страху не прамільгнула на ягоным твары.

– Я ад нараджэньня вольны чалавек, – спакойна адказаў ён, – ніколі нічыім халопам ня быў.

Над натоўпам застыла цішыня. Нават Іван Жахлівы ў зьдзіўленьні ўтаропіўся на дзёрзкага ліцьвіна. А пан Вітковіч на яго ўжо не глядзеў. Ён узьняў вочы да неба і маліўся, разумеючы, што прыйшла гадзіна ягонай сьмерці фізічнай. Гэта яшчэ больш разьюшыла самадзержца. Схапіўшы свой акрываўлены пярнач, ён за тры скачкі пераадолеў адлегласьць да пана Вітковіча і занёс руку для ўдару. Пан Вітковіч адарваў погляд ад неба і гэтак жа спакойна, як і раней, паглядзеў у вочы маскавіту. Ні адзін мускул не здрыгануўся на яго твары. Такім Ян і запомніў свайго камандзіра назаўсёды: годную постаць бяз страху перад разьюшаным тыранам, са спакойным позіркам у страшныя вочы сьмерці.

Удар – і пан Вітковіч рухнуў на зямлю. Іван

Жахлівы кінуўся на палонных, што стаялі побач, і аднаго за адным засек іх.

– Ад нараджэньня вольныя! – люта роў ён. – Вось вам вашы вольнасьці! Усіх іх выразаць! – ён паказаў на вялікую грамаду палонных, у якой знаходзіўся і Ян.

Маскавіты кінуліся выконваць загад.

“Ну вось і ўсё, – падумаў Ян. – Госпад, прабач мне грахі і прымі душу”.

Сямёнаў са слугамі стаяў непадалёк ад іх. Ён таксама выхапіў шаблю і на ўсё горла заклікаў да забойства. Але сваіх нявольнікаў ён не забіваў, а разам са слугамі пачаў выціскаць іх з агульнай масы палонных. Калі некалькі стральцоў занеслі шаблі над ягонай здабычай, іх спынілі людзі маладога баярына.

Яны беглі прэч са страшнага месца, падганяныя слугамі Сямёнава, а ззаду далятаді жудасныя гукі страшэннай бойні. Хутка іх загналі ў той хлеў, адкуль вывелі раніцай. Усе доўга маўчалі, узрушаныя пабачаным.

– Відаць, Сямёнаву моцна патрэбныя грошы, калі ён рызыкнуў не паслухацца загаду князя, – прамовіў Маліновіч, які стаяў побач з Янам.

Здаецца, нават саміх маскавітаў напалохалі зьверствы, якія чыніў іхні князь. Сярод ваяроў папаўзлі чуткі, быццам у Івана Жахлівага на руках праступае кроў забітых ім людзей. І колькі ён яе не змывае, кроў усё адно зьяўляецца. Казалі, што калі маскоўскаму князю неабходна паставіць пячатку на якую-небудзь паперу, ён усіх выганяе з пакояў, каб

ніхто ня бачыў ягоных рук, што ён хавае ў футры. Але знаходзіліся людзі, якія сьцьвярджалі, што бачылі, як на пячатках потым выступала кроў.

Пасьля бойні на Дзьвіне Заранковіча і іншых палонных трымалі ў хлеве яшчэ два тыдні. Каб яны не акалелі ад холаду, Сямёнаў загадаў кінуць ім нейкую цёплую вопратку. Сам маскоўскі баярын увесь гэты час кіраваў рабаваньнем багатых дамоў Полацку.

Нарэшце надыйшоў дзень адпраўкі ў Маскву. Палонных вывелі на двор, зьвязалі рукі вяроўкамі, а потым злучылі іх яшчэ па трох. Пасьля гэтага іх пагналі на вуліцу. Вершнікі маскавітаў ехалі ўперадзе, за імі ішлі палонныя, якіх ахоўвалі пешыя ваяры, а ў канцы рухалася доўгая чарада грузавых санак з нарабаванай маёмасьцю. Баярын Сямёнаў вяртаўся ў Маскву.

Ліцьвінаў апошні раз гналі ўздоўж вуліцаў Полацку. Горад заўважна апусьцеў. Значная колькасьць маскоўскага войска ўжо пакінула яго. Іван Жахлівы таксама выехаў з Полацка. Горад ён пакінуў на адказнасьць баярына Пятра Шуйскага. Свайму ваяводзе ён загадаў навесьці ў горадзе парадак: пачысьціць старыя рвы і выкапаць новыя, аднавіць разбураныя сьцены і вежы. Маскоўскі вялікі князь аддаў загад не прапускаць мясцовых жыхароў у замак, толькі па вялікіх сьвятах – у Сафійскі сабор, але ня ўсіх адразу, а невялікімі гуртамі і пры гэтым павялічыць ахову.

Ад гораду, у які Ян прыехаў больш за паўтары месяцы таму, мала што засталося. Найбагацейшае



*Іван Жахлівы знаходзіўся ў атачэньні знатных баяраў, сярод якіх ён выдзяляўся дарагім царскім убранствам...*



*У пакоі знаходзіліся вялікі князь і многія знакамітыя паны. Гэта былі людзі, якія кіравалі Вялікім Княствам Літоўскім...*



*Марыя дастала з-пад футра белую хустку і павязала яе Яну на рукаво дасьпеха...*



*Князь Радзівіл Руды ў атачэньні вершнікаў, сярод якіх быў ягоны шаснаццацігадовы сын Крыштап, заняў месца на ўзвышшы...*

места Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ляжала ў руінах. На месцы дамоў засталіся пажарышчы. У адным толькі Ніжнім замку згарэла больш за тры тысячы двароў. Яшчэ больш пацярпелі пасады. Ад Запалоцьця ўвогуле мала што засталося.

Ян быў зьвязаны з Малінічам і яшчэ адным полацкім зямянінам – Юшкам Зайцам. Апрануты яны былі абы-як, на трох мелі адну пару рукавіцаў, якую па чарзе апранալі, каб хоць трошкі сагрэць рукі. Ян не ўяўляў, як ім жывымі дабрацца да Масквы.

Абоз ішоў па дарозе на Невель. Сустрэтыя па дарозе паселішчы былі ўшчэнт спалены. Калі месяц таму Іван Жахлівы падыходзіў да Полацка, то зьнішчажаў усё на сваім шляху. Цяпер, калі войскі вярталіся назад, гэта павярнулася супраць іх: не было дзе рабіць прыпынкі пасьля доўгіх пераходаў. На першай начоўцы абозу Сямёнава на пажарышчы нейкай вёскі ледзь знайшоўся цудам ацалелы дом для самога баярына, усе астатнія – і ваяры і палонныя – прабылі ноч на вуліцы каля раскладзенага вялікага вогнішча.

Па дарозе ім пастаянна сустракаліся замерзлыя целы палонных, якіх гналі перад імі. Гэта былі людзі, што ня вытрымалі пераходу. Іх было шмат. Сотні. Мужчыны і жанчыны. Некаторых маскавіты дабівалі, і яны ляжалі ва ўласнай крыві, некаторых кідалі замярзаць яшчэ жывымі. Заяц, які пасьля першага дня пераходу пачуваўся вельмі дрэнна і ўжо зьвярнуў на сябе ўвагу аховы, пры выглядзе ляжачых у сьнезе трупаў панура прамармытаў, што хутка таксама будзе ляжаць і ён. Якуб і Ян ратавалі яго, але яны са-

мі былі зьнясіленымі і захварэлі. Ян адчуваў, што ён хутка таксама здасца. Між тым ахова прымушала іх рухацца яшчэ хутчэй. Сямёнаў сьпяшаўся.

Увечары Зайцу зрабілася зусім кепска. Заранковіч і Малініч фактычна цягнулі яго на сабе, і гэта ноша была для іх непасільнай.

Усё адбылося вельмі хутка. Ян, які не адрываў вачэй ад зямлі, нават не заўважыў, як адзін з ахоўнікаў падыйшоў да іх. Ён толькі пачуў гук шаблі, што расьсякала паветра, і глухі ўдар. Заяц бязгучна зваліўся ў сьнег і пацягнуў за сабой сваіх таварышаў. Заранковіч ускочыў на ногі і ў лютасьці кінуўся на маскавіта. Той ударыў яго рукаяткай шаблі, і Ян з залітым крывёю тварам зноў апынуўся ў сьнезе. Ахоўнік разрэзаў вяроўку, якая зьвязвала іх з Зайцам, і загадаў падымацца. Малініч дапамог Яну. Яны пайшлі далей.

– Я наступны, – сказаў Заранковіч.

– Трымайся.

Трэці дзень яны ішлі па лясной дарозе. Ззаду застаўся ляжаць ужо не адзін іхні таварыш. Сямёнаў, бачачы, як драбнее сума выкупаў, загадаў ахове дабіваць толькі самых безнадзейных.

Дарога зрабіла паварот. Упоперак яе, перагароджваючы шлях абозу, ляжала сасна. Справа да дарогі падыходзіла невялікая лясная горка з густым разлапістым ялоўнікам. Зьнячэўку для ўсіх, з гушчароў трэснулі стрэлы ручніц, пайшоў дымок, засьвісталі стрэлы, і з дзясятак маскавітаў пападалі з коней. З узгорку на дарогу з крыкамі вырваліся ваяры і кінуліся на ахову абозу. Усе, хто знаходзіўся

ў абозе – і жаўнеры і палонныя,– застыглі ў здранцьвеньні. Раптоўнасьць, з якой была зьдзейсьнена атака, у першыя хвіліны бою дала нападнікам перавагу і, хоць іх было меньш, чым маскавітаў, зраўняла шанцы.

Сярод палонных першым у сытуацыі разабраўся Малініч. Убачыўшы, што ахоўнікі павярнуліся тварам да атакі і пакінулі іх у сябе за сьпіной, ён закрычаў: “Наперад!”, і яны кінуліся на маскавітаў.

Малініча засек ахоўнік. Але ўдарыць бягучага побач Заранковіча ён не пасьпеў, і Ян, урэзаўшыся ў яго, зьбіў маскавіта з ног. Ахоўнік рухнуў на зямлю і выпусьціў з рукі шаблю, якая звалілася на сьнег. Ян, таксама не ўтрымаўшы раўнавагу, паваліўся побач з ім. Заранковічу першаму ўдалося прыпадняцца, і ён выцяў маскавіта па твары. Пакуль той не ачуняў, Ян схапіў шаблю і магутным ударам забіў ахоўніка.

Вакол ішоў жорсткі бой. Шмат каго з палонных ахова засекла, але сваю справу яны зрабілі: значная частка маскоўскіх ваяроў была на час адцягнута ад асноўнай бітвы і нічым не магла дапамагчы сваім таварышам у галаве абозу, а менавіта на іх прыйшоўся галоўны ўдар нападнікаў. Урэшце рэшт барацьба завязалася па ўсёй даўжыні вазоў. Зьвінела сталь, ляскалі ручніцы, ваяры падалі ў сьнег, на якім пунсавела кроў.

Заранковіч шабляй разрэзаў вяроўку, уварваўся ў гушчу змаганьня і пачаў секчы ворагаў. Перад вачыма мільгалі чалавечыя твары, скрыўленыя нянавісьцю, страхам і болем, зьяўляліся праціўнікі і падалі пад ягонымі ўдарамі, а на іх месца ўставалі

новыя. Ян таксама атрымаў некалькі лёгкіх ранаў, але ў запале барацьбы амаль не зважаў на іх.

Пасьля гадзіны жорсткай сечы ўсе маскавіты ў галаве і ў сярэдзіне абозу былі выбіты. Маскоўскія ваяры, якія захавалі жыцьцё і зброю, адступілі ў хвост калоны, і бітва працягвалася.

Так атрымалася, што чалавечыя хвалі, якія пастаянна сутыкаліся паміж сабой, вынесьлі Заранковіча на Сямёнава. Два праціўнікі на імгненьне зьнерухомелі, ацэньваючы сілы адзін аднаго.

– Зараз пабачым, што ты ўмееш без аховы, – скрозь зубы працадзіў Ян.

– Спадабалася быць маім халопам? – з насьмешкай спытаў Сямёнаў. – Прывыкайце, хутка наш гасудар усю Літву ўпакорыць.

– Гэта вы ўсе гасударавы халопы. А мы – вольныя людзі. Нічыімі рабамі ніколі не былі і быць не зьбіраемся, – адказаў Ян.

– Не захацеў пакаштаваць майго бізуна, дык пакаштуеш маёй шаблі.

Ян зрабіў выпад і пачаў атаку. Шабляй Сямёнаў валодаў горш за яго. Але Ян быў вельмі зьнясілены, і гэта давала Сямёнаву перавагу. Натхненьне ад вяртаньня свабоды і надзея на ратунак, якія падвоілі сілы Заранковіча ў першыя хвіліны бою, цяпер зьніклі, адкрыўшы праўду аб тым, што ў гэты момант ён быў даволі слабы. Акрамя гэтага, сталі нагадваць пра сябе атрыманыя раненьні. Карацей, адбіўшы атаку Заранковіча, Сямёнаў стаў моцна насоўвацца на яго, і хутка адзін з ягоных удараў дасягнуў мэты – ён зрабіў даволі сур'ёзную рану ў правым баку

праціўніка. Цяпер кожны крок правай нагой даваўся Яну з моцным болем. Сямёнаў заўважыў слабасьць праціўніка і падвоіў тэмп. Яшчэ два разы Ян проста цудам вывернуўся ад, здавалася б, апошніх удараў.

– Канец табе! – закрычаў Сямёнаў сарваным ад зьбітага дыханьня голасам. Ён біў удар за ўдарам. Заранковіч адступаў пад яго націскам, нават не спрабуючы атакаваць. Але частку перавагі Ян аддаў маскавіту наўмысна, чакаючы, калі ня вельмі вышкалены праціўнік занадта захопіцца стыхіяй атакі і зробіць памылку. І разьлік Заранковіча апраўдаўся. Пасьля чарговага выпаду Сямёнаў ня так хутка, як трэба, прыбраў назад руку з шабляй, і гэтага імгненьня хапіла Яну, каб ударыць маскавіта па руцэ. Шабля праціўніка адляцела ў бок. Сямёнаў адбег назад і схапіў шаблю ляжачага побач забітага ваяра. Ян з-за болю ў баку не пасьпеў яму перашкодзіць. Сямёнаў зноў быў узброены, але зараз шаблю ён трымаў у левай руцэ. На яго твары была напісана разгубленасьць. Ян зразумеў, што левай рукой ён не валодае. Заранковіч нанёс Сямёнаву некалькі ўдараў, якія той няўмела адбіў. Ян кінуўся ў атаку. Удар у левае плячо Сямёнаў адбіць не пасьпеў. Цяпер у яго дрэнна дзейнічалі абедзьве рукі. Гэта азначала паразу. Да яго гонару, ён ня страціў сьмеласьці. Сьціснуўшы шаблю ў левай руцэ, амаль непаслухмянай правай ён дастаў з-за поясу кінжал і кінуўся на Яна, зьбіраючыся перад сьмерцю пакараць праціўніка. Заранковіч ухіліўся ад шаблі, што прасьвістала ля самай галавы, і, перш чым Сямёнаў

пасьпеў ударыць яго кінжалам, нанёс удар у адказ. З ціхім стогнам баярын рухнуў на зямлю.

Сілы амаль пакінулі Яна. Калі маскоўскі ваяр падскочыў да яго і нанёс удар зьверху, ён пасьпеў падставіць шаблю, але гэта ня надта дапамагло. Шабля праціўніка абрынулася на яго і расьсекла ключыцу. Ад моцнага болю пацямнела ў вачах, і ён зваліўся на сьнег.

## 8

Першым адчуваньнем, на якое Ян зьвярнуў увагу, быў моцны холад. Яго некуды везьлі. Ён ляжаў у цемры, у якую праз заплюшчаныя векі ўрываліся праблёскі сьвятла. Ні адчыніць вочы, ні варухнуцца сілаў у яго не было. Раптам з холаду ён апынуўся ў цеплыні. Ляжаць стала нашмат зручней. Ян заўважыў, што перастала трэсьці, значыць яго ўжо нікуды ня везьлі. Заранковіч спрабаваў расплюшчыць вочы, але праз гэтыя высілкі толькі правальваўся ў непрытомнасьць. Нарэшце, калі ён ачуняў чарговы раз, то змог разамкнуць векі. Рэзкае сьвятло асьляпіла яго і выклікала боль у вачах. Праз пэўны час, калі ён звыкся са сьвятлом, то выявіў, што ляжыць у ложку ў незнаёмым пакоі. Ложак стаяў ля сьцяны насупраць дзьвярэй, у сьцяне зьлева быў зроблены агмень, у якім гарэў агонь, справа знаходзілася вакно. Ян паспрабаваў прыўзьняцца, але тут жа ўся правая частка цела была працята моцным болем. Ён успомніў аб дзьвюх атрыманых ранах – у бок

ад Сямёнава і ў плячо ад апошняга маскавіта, з якім змагаўся.

У пакой зайшла жанчына, мяркуючы па вопратцы, служанка, і накіравалася да агменю. Заўважыўшы, што Заранковіч ляжыць з расплюшчанымі вачыма, яна крыкнула ад зьдзіўленьня і выскачыла з пакою. Некалькі хвілінаў пазьней яна вярнулася, а разам з ёй да Яна прыйшлі тры чалавекі: пані і яе дзеці – хлопец і дзяўчына, якія былі на некалькі гадоў маладзейшыя за Яна. Заранковіч затрымаў свой погляд на дачцэ пані. Гэта была прыгожая дзяўчына, вельмі падобная да маці. У яе былі блакітныя вочы, якія акаймоўваліся тонкімі чорнымі бровамі. Доўгія русыя валасы былі заплецены ў касу, якая спускалася з пляча. Пад занадта працяглым поглядам Заранковіча дзяўчына пачырванела і схавалася за сьпіну маці. Яе брат быў прыроджаным рыцарам: высокі, шыракаплечы, хутчэй за ўсё, здольны гэтак жа проста падняць цяжкі двухручны меч, як і звычайную шаблю.

Пані падыйшла да Заранковіча і прысела на крэсла каля ложка.

– Як пан пачуваецца?

Ян хацеў адказаць, але выявілася, што язык абсалютна не паслухмяны яму.

– Алёна, прынясі вады, – сказала пані служанцы.

– Дзякую, – з цяжкасьцю выціснуў з сябе Ян, адпіўшы з кубка. – Дзе я?

– У Віцебску. Як вашае імя?

– Ян Заранковіч.

– Ганна Мяжэвіч, – адрэкамэндавалася пані.

– Ці гэта ваш дом?

– Так.

– Дзякую вам за клопаты. Які сёньня дзень?

– Дваццаць чацьвёртага сакавіка.

– Ці я ўвесь гэты час быў непрытомны?

– Так.

– Як я апынуўся ў Віцебску?

– Вы нічога ня памятаеце?

– Я памятаю шлях з Полацка, атаку невядомага войска, бітву.

– Вас прывезьлі параненым бяз памяці. Шчыра кажучы, я не спадзявалася, што пан застанецца жывым. Але, пэўна, Госпад моцна трымае пана за руку.

– Хто нас выратаваў?

– Аддзел пана Збараскага, віцебскага ваяводы.

Ян меў намер задаваць новыя пытаньні, але пані Мяжэвіч паківала галавой.

– Сёньня я больш ня буду размаўляць з панам. Пан яшчэ надта слабы. Адпачывайце.

Для Яна пацягнуліся дні выздараўленьня. Пані Мяжэвіч дазволіла яму ўстаць толькі праз два тыдні. Бо апроч таго, што яшчэ не зажылі атрыманыя раны, Ян быў моцна зьнясілены. Сілы аднаўляліся марудна, што выклікала ў Заранковіча скрайнюю нецярплівасьць. Пані Мяжэвіч з цяжкасьцю ўдавалася прымушаць яго заставацца ў ложку і пільнавацца вызначанага ёю парадку. Жанчына атачыла Яна сапраўднай матчынай любоўю. Яе муж і старэйшы сын загінулі ў бітве з маскавітамі. Засталіся васямнаццацігадовая дачка Марыя і шаснаццацігадовы

сын Мікалай. Мяжэвічы разам прыходзілі да яго ў пакой і бавілі з ім шмат часу. Яны разам чыталі Слова Божае і маліліся.

Ян распавядаў пра аблогу Полацка і пра службу ў князя Радзівіла, а яны яму – пра поўнае небясьпекаў жыцьцё на памежжы. Ад іх Ян даведаўся, што аддзел пана Збараскага пранік на забраную маскавітамі тэрыторыю Полацкага ваяводзтва, высочваў на гасьцінцы Полацак-Невель варожыя абозы і нападаў на іх. Адным з такіх абозаў быў той, у якім на ўсход гналі Заранковіча. Заканчэньне бітвы, якое Ян прапусьціў, прайшло на карысьць ліцьвінаў: маскавіты былі зьнішчаны, а палонныя вызвалены. Відаць, нейкі жаўнер, аглядаючы тых, што ляжалі ў сьнезе, пабачыў, што жыцьцё яшчэ не пакінула Заранковіча. Параненых паклалі ў санкі, і аршак накіраваўся да Віцебска. Пасьля прыбыцьця ў горад пан Збараскі разьмеркаваў параненых па сем'ях. Так Ян апынуўся ў доме пані Мяжэвіч.

Была ўжо сярэдзіна красавіка, калі Яну дазволілі выходзіць на двор. Да гэтага часу надыйшла сапраўдная вясна. Стаялі сонечныя дні, прабівалася лістота, толькі вецер быў яшчэ халодны.

Выздараўленьне Яна пайшло хутчэй. Неўзабаве ён пачаў займацца практыкаваньнямі на шаблях з Мікалаем Мяжэвічам і спрабаваў езьдзіць конна.

Выявілася, што Мікалай бліскуча валодае шабляй. Яну давялося прыкласьці нямала намаганьняў, каб адбіць яго настойлівыя атакі. Шчырае зьдзіўленьне, якое застыла на твары Заранковіча, пацешыла юнака.

– Бацька вучыў цябе? – запытаўся Ян.

– Так. Ён пастаянна займаўся намі з братам.

– Там, дзе я вырас, мала хто ў тваім веку так добра валодае зброяй.

– Там няма па суседзтву такога ворага, як тут. У нас кожны зямянін з дзяцінства гатовы да вайны.

Неяк пані Мяжэвіч запрасіла Заранковіча да сябе.

– Сядай, Ян. Мне трэба паразмаўляць з табой.

– Я слухаю.

– Ты ўжо амаль выздаравеў. Што ты зьбіраешся рабіць далей?

– Паеду ў Нясьвіж, да месца сваёй службы.

– Я хачу папрасіць цябе пра адну паслугу.

– Прасіце пра што заўгодна. Я жыцьцём вам абавязаны.

– Я вырашыла адправіць Марыю ды Мікалая і хачу, каб яны паехалі з табой.

– Адправіць?

– Так. Я ня ўпэўнена, што Віцебск не спасьцігне лёс Полацка. Я ўжо страціла мужа і сына. Калі нешта здарыцца з малодшымі, я не перажыву гэтага.

– А пані калі паедзе?

– Я застануся тут. Дзецям патрэбны будуць грошы, а наш маёнтак у Віцебскім павеце – адзіная крыніца даходаў. Калі мы страцім яе, то застанемся бяз сродкаў.

– Куды маю ехаць з імі?

– У Нясьвіж. Я буду прасіць князя Радзівіла ўзяць маіх дзяцей пад апеку. Думаю, ён не адмовіць у дапамозе тым, чые бацька і брат загінулі,

абараняючы Радзіму. З гэтай нагоды я таксама папрашу цябе перадаць князю ліст і распавесьці пра маю патрэбу. Хоць ты і просты жаўнер, але князь, напэўна, захоча пачуць ад цябе падрабязнасьці аблогі Полацка.

– Я зраблю ўсё, аб чым пані просіць. Але ці ня лічыце вы, што такая вандроўка можа быць больш небясьпечнай, чым чаканьне ворага ў Віцебску? Тут добры замак. Яго няпроста будзе ўзяць.

– У Полацку таксама быў замак.

– На чым паедзе панна Марыя? Дарогі зараз адольныя толькі для вершнікаў.

– Яна паедзе конна. Для яе гэта не складана.

– Ёсьць яшчэ адна цяжкасьць. Паветы, у якіх ідзе вайна, поўныя ліхімі людзьмі. Калі мы пад’яжджалі да Полацка, на нашых вачах банда зьнішчыла купецкі абоз.

– Для гэтага я наняла ахову.

– Калі вы цьвёрда вырашылі, што так будзе лепей, я з гатоўнасьцю правяду Мікалая і Марыю да месца прызначэньня.

Праз некалькі дзён пасьля гэтай размовы Ян неяк увайшоў у пакой, дзе каля вакна, адна, сядзела Марыя. Ён павітаўся:

– Дзень добры.

– Добры дзень, – сказала дзяўчына ў адказ.

– Цяжка пакідаць бацькоўскі дом? – Ян па сумным выглядзе Марыі здагадаўся, аб чым яна думае.

– Ня проста цяжка, а страшна. Не разумею, навошта патрэбна гэта рабіць.

– Так вырашыла ваша маці.

– Я ведаю.

– Заставацца ў Віцебску небясьпечна. У кожны момант могуць заявіцца маскавіты і зрабіць з горадам тое, што яны зрабілі з Полацкам.

– Я ўсё гэта разумею, але ўсё адно не магу прыняць, што прыйдзецца ехаць у незнаёмы горад да чужых людзей.

– Гэта цяжка, – згадзіўся Ян.

– А Мікалай задаволены, – прамовіла панна Марыя.

– Ну, для яго ў Нясьвіжы адкрыюцца добрыя пэрспэктывы. Ён можа паступіць на службу да князя Мікалая Радзівіла. Аб гэтым многія зямяне мараць.

– Як бы я хацела, каб усё заставалася бяз гэтых пераменаў, па-ранейшаму.

Настолькі прыгожай была панна, якая сядзела перад ім, што Ян з нейкім сорамам падумаў, што ён не падзяляе яе суму з нагоды будучай паездкі. У тым сэнсе, што ён паедзе разам з ёй.

Раніца ад'езду выдалася пахмурная. Апошнія некалькі дзён стаяла сонечнае надвор'е, але ўначы пайшоў дождж, які не спыніўся і раніцай. Цяжкія хмары зацягнулі неба. Было холадна і няўтульна, быццам у позьнюю восень.

Прыбыла нанятая паняй Мяжэвіч ахова. Яна складалася з пяцёх зямянаў – маўклівых, крэпкіх мужчын трыццаці пяці сарака гадоў. На паясах у іх віселі шаблі, за сьпінамі знаходзіліся сагайдакі. Ян, аглядзеўшы іх, вырашыў, што пані Мяжэвіч зрабіла добры выбар. У кожным быў відаць вопытны і

спрактыкаваны ваяр, які не аднойчы глядзеў сьмерці ў твар.

З дому выйшла пані Мяжэвіч з дзецьмі. Марыя ў касьцюме для язды конна выглядала быццам юнак-падлетак. Яна ішла побач з маткай і плакала. У Яна нешта зашчымела ў сэрцы, калі ён глядзеў на яе. У чарговы раз яму з цяжкасьцю ўдалося адвесьці свой погляд ад гэтай прыгожай панны. Мікалай ішоў ззаду ў сястры, важна паклаўшы руку на эфэс шаблі.

Пані Мяжэвіч падышла да Яна.

– Ці ўсё гатова?

– Так.

– Пан Заранковіч, я аддаю ў вашы рукі самае каштоўнае, што маю. Давязіце дзяцей да месца прызначэньня, гэта мая адзіная просьба да пана.

– Я зраблю гэта з Божай дапамогай. Пастарайцеся не турбавацца і маліцеся за нас.

Пані Мяжэвіч зьвярнулася да аднаго з віцебскіх зямянаў:

– Пан Магута, дазвольце мне даведацца, як вы паедзеце.

Ёй адказаў старэйшы з вяроў:

– У першы дзень даедзем да Астроўны і там заначуем. Далей павернем на поўдзень і будзем аддаляцца ад земляў, дзе гаспадараць маскавіты. За другі дзень пройдзем шлях да Мелехава. Калі зьявіцца небясьпека, трохі ў баку ад гасьцінца знаходзіцца замак Сарыца. У ім у выпадку чаго знойдзем паратунак. На трэці дзень даедзем да Сянна. Пасьля гэтага мы будзем у Аршанскім павеце, а ў Каханаве завернем на Барысаў. Далей паедзем магілёўскім гасьцін-

цам. Галоўнае – даехаць да Барысава. Пасьля будзе спакойна.

Пані Мяжэвіч працягнула Яну некалькі папераў.

– Гэта мой ліст да князя Мікалая, а таксама ахоўныя лісты, якія вам выпісаў пан Збараскі. У гэтых лістах загад віцебскага ваяводы ўсім урадам нашага ваяводзтва прымаць вас і аказваць усялякую дапамогу.

Пасьля кароткай малітвы падарожнікі рушылі ў дарогу. Шлях быў цяжкі. Коні пастаянна правальваліся ў размоклую гразь. Асабліва цяжка было Марыі. Для дзяўчыны яна даволі ўпэўнена трымалася ў сядле і на добрай дарозе мала ў чым саступіла б мужчынам, што ехалі з ёю, але ў той сытуацыі ёй даводзілася змагацца з разьбітай дажджом дарогай, і гэта барацьба давалася ёй з цяжкасьцю. Астатнія вершнікі мусілі чакаць яе. Хуткасьць руху была меншай, чым плянаваў Заранковіч.

Ян пад'ехаў да Марыі і паспрабаваў адцягнуць яе ўвагу размовай.

– Ці панна выяжджала калі-кольвек з Віцебску?

– Толькі ў Полацак і Воршу, але гэта было даўно, у маленстве.

Марыя, можа, упершыню за гэты дзень адарвала вочы ад дарогі і паглядзела на яго.

– А пан, напэўна, многія гарады пасьпеў наведаць?

– Шчыра кажучы, не. З бацькам быў у Навагрудку і Горадні. Потым, калі паступіў на службу да князя Радзівіла, стаў жыць у Нясьвіжы.

– Я думаю, служыць у такога славутага пана было вельмі цікава.

Ян усьміхнуўся.

– Цікава... Князь Радзівіл набраў у войска многа маладых зямянаў, якія яшчэ ня ведалі службы. Калі б вы бачылі, што з намі рабілі харунжыя, у рукі якіх мы былі аддадзеныя!.. Усе чатыры месяцы, што я там быў, нас вучылі ваеннай справе. З раніцы да вечара. Шэсьць дзён на тыдзень. Толькі нядзеля была вольная. Раніцай мы ішлі ў збор, а пасьля служэньня шпацыравалі ў горадзе. Увечары вярталіся ў замак, і ўсё пачыналася нанова.

– Цяжка было?

– Спачатку вельмі цяжка. Потым мы звыкліся, пасябравалі, пачалі дапамагаць адзін аднаму. А пазьней нам абвясьцілі, што мы выпраўляемся ў Полацак. Сябры глядзелі на нас як на шчасьліўцаў. Лепей падарожнічаць па краіне, чым па тысячы разоў выконваць адны і тыя ж загады пана харунжага.

– Ці дапамаглі вам тыя заняткі падчас абароны Полацку?

– І так і не. Безумоўна, шмат якія навыкі яны нам далі, і гэта спатрэбілася ў Полацку. Але мы служылі ў цяжкой кавалерыі. Нас вучылі франтальным атакам у полі. А ў Полацку давялося лезьці на сьцены і абараняць замак.

– Ці сябры пана загінулі?

– Так. Я думаю, усе ваяры майго аддзелу загінулі. А калі нехта і застаўся жывым, то, як і я, апынуўся ў палоне. Толькі наўрад ці яму пашанцавала гэтак жа, як і мне.

– А што будзе далей? Няўжо мы пакінем Полацак у руках маскавітаў?

– Гэта пытаньне і мне не дае спакою. Магчыма, адказ на яго будзе вядомы ў Нясьвіжы. Але ў кожным выпадку пачнецца вялікая вайна. Маскавіты зрабілі ў ёй ход першымі, а мы былі да яго непадрыхтаванымі. Цяпер наша чарга. Трэба рыхтаваць удар у адказ. Але зрабіць гэта будзе вой-як няпроста.

– Чаму? Няўжо яны такія моцныя?

– Так. Іван Жахлівы прывёў да Полацка вялікае войска. Наколькі мы здолелі вызначыць, адных толькі ваяроў было ня меньш за пяцьдзясят тысячаў. І яшчэ столькі ж халопаў, якія замест коней цягнулі на сабе вялізарны абоз. Мы столькі людзей сабраць на вайну ня здолеем.

– А колькі мы зможам сабраць?

– Як панна разумее, колькі мы можам сабраць і колькі зьбярэцца на самой справе – гэта дзьве розныя рэчы. Паспалітае рушэньне здольнае выставіць некалькі дзясяткаў тысяч вершнікаў. Калі б такое войска сабралася... Мы бы хутка выкінулі маскавітаў з Полацку. Нашы ваяры ў вайсковай справе на галаву вышэй за іх. У нас лепшыя ўзбраеньне і рыштунак. Нашае войска больш арганізаванае і дысцыплінаванае. То бок у нас ёсьць шмат перавагаў перад ворагам. Але ўся бяда ў тым, што неабходная колькасьць ваяроў рэдка калі зьбіралася. Таму і церпім паразу за паразай. Усе апошнія баявыя дзеі праходзілі пры вялізарных колькасных перавагах маскавітаў. Зямяне вельмі марудна зьбіраюц-

ца на вайну. А некаторыя ўвогуле ігнаруюць збор рушэньня, ганьбуючы шляхецкае саслоўе. І гэта нягледзячы на тое, што пакліканьне зямянаў – абарона Айчыны. На маё глыбокае перакананьне, тыя, хто адмаўляецца выканаць свой абавязак, нягодныя рыцарскага званьня.

– Што ж будзе далей? Маскавіты зноў прывядуць аграмаднае войска, а мы?

– Думаю, гэтым разам, калі небясьпека вялікая, мала хто застанецца дома. Страта Полацка – гэта ўжо сур'ёзна. Часта шляхту ў заходняй частцы Княства цяжка зрушыць, таму што яны ня бачаць рэальнай небясьпекі для сябе. Многія лічаць, што падзеі, якія адбываюцца на ўсходняй мяжы, тычацца толькі жыхароў усходніх ваяводзтваў. Але цяпер уся наша дзяржава пад пагрозай зьнішчэньня. На Полацку маскоўскі князь ня спыніцца. Гэта справа ўжо непасрэдна тычыцца кожнага ліцьвіна.

– Значыць, будзе вайна?

– Так. Будзе.

Ужо цямнела. Віцебскія зямяне спыніліся і нешта абмяркоўвалі. Ян пад'ехаў да іх.

– Я спадзяваўся да канца дня даехаць да Астроўны, – казаў пан Магута, – але бачу, што не пасьпеем. Будзем там позна ўначы. Гэтай парой нас ніхто да сябе ня пусьціць. Яшчэ палічаць за маскавітаў ці за разбойнікаў. Што будзем рабіць?

– Калі б з намі не было панны Мяжэвіч, можна было б раскласьціся начоўкай у лесе і прабавіць ноч там. Але паненцы нельга спаць на голай зямлі. Трэба шукаць начлег.

– Пагасевіч мае прапанову.

– Сапраўды, маю, – сказаў пан Пагасевіч. – Недалёка адсюль знаходзіцца засьценак Варковічы. У мяне там сваякі. Можна пераначаваць там, а раніцай вярнуцца на гасьцінец і працягваць шлях.

– Дзе мы павернем на засьценак? – запытаўся пан Магута.

– Неўзабаве будзе паварот.

– Тады едзем.

Яны імчалі па вузкай дарозе на Варковічы. Зрабілася зусім цёмна.

– Ня трэба так гнаць, – крыкнуў пан Магута. – Зараз ува ўсіх паселішчах на ноч выстаўляюць варту. У цемры ніхто разьбірацца ня будзе.

Праз дзесяць хвілінаў паказаліся абрысы дамоў. Яны амаль ужо ўехалі ў селішча, калі пачуўся голас:

– Стой! Назаві сябе!

Пан Пагасевіч выехаў наперад і назваў сваё імя. з цемры да іх выехалі тры вершнікі. Ян разглядзеў, што недалёка ад іх застылі некалькі стралкоў, якія напялі лукі.

– А хто з табой? – спытаў адзін з вартавых у пана Пагасевіча.

– Дзеці пані Мяжэвіч з Віцебску і суправаджэньне.

Іх прапусьцілі. Пад'ехаўшы да аднаго з дамоў, пан Пагасевіч зьлез з каня і пачаў моцна грукаць у дзьверы. Пачуліся гукі крокаў, паўтарылася працэдура апазнаваньня, пасьля чаго гаспадар адчыніў засаўку. На шум прачнуліся суседзі. Некалькі чалавек прыйшлі даведацца, што здарылася. Сва-

як Пагасевіча, пан Луцкі, папрасіў іх прыняць частку падарожнікаў, бо ў яго ў доме не хапала на ўсіх месца.

Ян моцна стаміўся за дзень. Цела, якое даўно ня ведала фізічных нагрузак, востра патрабавала адпачынку. Апошнія некалькі гадзінаў ён з цяжкасьцю трымаўся ў сядле. Яго і яшчэ двух віцебскіх зямянаў узяў да сябе ў дом адзін з суседзяў пана Луцкага. Ян лёг на падрыхтаванае месца і імгненна заснуў, нібы праваліўшыся ў глыбокую, цёплую мару.

Яго адразу ж пабудзілі. Прынамсі так яму падалося. На самой справе ўжо прыйшла раніца. Усё цела ламала пасьля ўчорашняй паездкі.

Яны сабраліся ў доме пана Луцкага на сьнеданьне. Елі моўчкі. Усе дрэнна выспаліся і слаба адпачылі за ноч. Падзякавалі гаспадару за прытулак, памаліліся разам і рушылі ў дарогу.

У Астроўну прыбылі толькі праз дзьве гадзіны, што пацьвердзіла слушнасьць рашэньня начаваць у Варковічах.

На другі дзень яны рушылі з большай хуткасьцю і заплянавана прыбылі ў Мелехава. Гэта вёска належала пану Вялічку з Віцебска. Вершнікі праехалі паўз сялянскія хаты да панскага дому. Гаспадар з сям'ёй знаходзіўся ў Віцебску. Іх сустрэў аканом, высокі і маўклівы мужчына, пан Табяновіч. Ян падаў яму ахоўныя лісты, і ён, прачытаўшы паперы, павёў іх за сабой. Марыі ён выдзеліў асобны пакой, усіх астатніх разьмясьціў у іншым. Заранковіч і на гэты раз заснуў адразу, як толькі прылёг.

## 9

Ян сьніў Полацак. Сьніў, як маскавіты ўрываюцца ў палаючы Верхні замак. Быццам знаходзячыся там, ён чуў гукі змаганьня, толькі вельмі прыглушана, нібы ён знаходзіўся на пэўнай адлегласьці ад месца бою. Гэты факт не даваў яму спакою ў сьне. Нейкая важная думка зьяўлялася ў сьвядомасьці, але, так і не праявіўшыся ясна, хутка зьнікала.

Ян адчайна спрабаваў зразумець, што гэта значыць, таму што дакладна ведаў, што Марыі, якая чамусьці была з ім у Полацку, пагражала небясьпека. І вось гэтая думка, якая то зьяўлялася, то прападала, несла ў сабе адказ на пытаньне, адкуль гэта небясьпека можа прыйсьці.

Потым ува сьне Ян перамясьціўся ў нейкае паселішча. У ім таксама былі маскавіты. Ян спрабаваў зразумець, што гэта было за месца, а калі зразумеў, то на яго быццам вылілі вядро халоднай вады: гэта было Мелехава. Маскавіты былі ў Мелехаве! Ян прачнуўся і ўскочыў на ногі. Пачынала віднець. Начная цемра расьсейвалася слабымі яшчэ прамянямі сонца. Ян ня спаў, але гукі бою, як і ўва сьне, параненйшаму чуліся яму. Ён выбег з дому. На ўскрайку селішча ішоў бой! Астатнія, за выключэньнем Мікалая, таксама прачнуліся і далучыліся да Заранковіча. Некалькі вершнікаў прамчаліся непадалёк, заблішчэлі шаблі. Маскавіты! Ян кінуўся назад у дом і расштурхаў Мяжэвіча.

– Мікалай! Ляці будзі Марыю! Хутчэй!

Мяжэвіч, дрэнна разумеючы, што здарылася, пабег да сястры.

Да іх двара наблізіліся вершнікі. Насустрач ім выбег Табяновіч з шабляй у руцэ і некалькі слугаў з сякерамі.

– Стой! – закрычаў пан Магута.

Табяновіч не зьвярнуў на яго ўвагі і працягнуў сваю безнадзейную атаку. З трэскам і выцьцём маскавіты пасеклі ўсіх людзей і іхняга камандзіра пана Табяновіча.

Віцебскія зямяне і Заранковіч з лукамі разьбегліся па ўзьлеску наўзбоч ад дарогі, якая вяла да дому. Маскавіты, відаць, разьлічвалі расправіцца з імі гэтак жа проста, як і з людзьмі Табяновіча, таму, не спыняючы коней, рушылі на іх.

Шэсьць стрэл пранізалі паветра, і пяцёра вершнікаў пазвальваліся з коней. Рэшта, зразумеўшы, што ім супрацьстаяць добра ўзброеныя ваяры, а не сяляне з косамі, павярнулі назад. Адзін з іх так рэзка асадзіў каня, што жывёла, устаўшы на дыбы, скінула яго на зямлю. Пагасевіч падбег да яго і прыбіў да зямлі адным ударам шаблі.

Мікалай і Марыя сьпяшаліся да сваіх. Трое віцебскіх ваяроў ужо выводзілі коней са стойла.

– Хутчэй, пакуль усе маскавіты не прыскакалі сюды! – прысьпешваў усіх пан Магута.

– Што мы будзем рабіць? – спытала яго Марыя.

– Паспрабуем уцячы.

– А людзі ў паселішчы?

– Мы іх не ўратуем. Яшчэ пытаньне, ці зможам самі вырвацца.

Яны выехалі з двара і наўскапыт паімчалі далей ад жахлівага месца. Трое віцебскіх зямянаў скакалі ўперадзе, за імі – Марыя, па баках ад яе – Заранковіч і Мяжэвіч, а яшчэ два ахоўнікі – ззаду за ўсімі. Хутка яны ўбачылі маскавітаў, якія выехалі проста на іх.

– Трымайся, – закрычаў Ян Марыі.

Два аршакі сутыкнуліся. Віцебцы прарваліся ўсе, за выключэньнем аднаго вершніка, які, атрымаўшы ўдар шабляй, пачаў марудна завальвацца на бок і ў рэшце рэшт упаў з каня. Мяжэвічу перагарадзіў шлях маскавіт. Марыя спужана закрычала, але баялася за брата яна дарэмна. Мікалай лёгка адкаснуўся ад шаблі і сваім ударам паканаў ворага. Яна зноў зьдзівіла майстэрства, з якім Мяжэвіч валодаў зброяй. У сваю чаргу Заранковіч адбіў накіраваны на яго ўдар, і яны аднавілі сваю шалёную скачку. Маскавіты разьвярнулі коней і кінуліся ў пагоню.

Цяпер яны ўсе зноў імчаліся праз паселішча. Многія дамы былі ахоплены агнём. У дварах гаспадарылі маскавіты, якія ўжо заняліся гвалтам і рабаваньнем. Але гэта было з рукі ўцекачам – большасьці ўсходніх захопнікаў было ўжо не да іх. Толькі на ўскрайку Мелехава некалькі чалавек стрэлілі па іх з лукаў, і яшчэ адзін віцебскі ахоўнік зьляцеў на зямлю са стралой у сьпіне.

Уцекачы вырваліся з паселішча і выскачылі на лясную дарогу. Маскавіты па-ранейшаму перасьледавалі іх. Заранковіч пастаянна азіраўся назад. Яму падалося, што адлегласьць паміж імі і ворагамі паступова зьмяншаецца. Ён спадзяваўся, што маскавіты не рызыкнуць моцна аддаляцца ад сваіх, але час

ішоў, а вораг не спыняў пагоню. І хутка зрабілася відавочным, што маскавіты даганяюць іх. Ян яшчэ раз азірнуўся. Іх даганялі сем-восем ваяроў.

– Пан Магута! – закрычаў ён.

– Бачу. Трэба біцца.

Ян павярнуўся да Мяжэвіча.

– Мікалай, вы з Марыяй ляціце далей. Не спыняйцеся і нас не чакайце.

– Не!

– Слухайся! – закрычаў Ян такім голасам, што Мяжэвіч адкаснуўся ад яго. Але загад выканаў. Яны з Марыяй памчаліся далей, а Заранковіч і трое зямянаў разьвярнулі коней і рушылі на ворага. Маскавітаў было восем чалавек. Двое з іх пакіраваліся ўбок, ухіліліся ад бітвы з ліцьвінамі, якія скакалі на іх, і працягнулі перасьлед Мяжэвічаў. Рэшта прыняла бой.

Вынік сутычкі шмат у чым залежаў ад першага сутыкненьня. Магута і Заранковіч зрэзалі па адным праціўніку. Пагасевіч абмяняўся з маскавітам безвыніковымі ўдарамі, а трэці ахоўнік загінуў. Суадносіны сілаў сталі чатыры на трох. Закіпеў бой. Пан Магута біўся з двума маскавітамі. Заранковіч і Пагасевіч узялі на сябе двух астатніх. Першым адолеў праціўніка Ян. Ён паканаў маскавіта і кінуўся на дапамогу пану Магуце, але не пасьпеў. Віцебскі вяр забіў аднаго маскавіта, але зараз жа лёг ад удару другога. Цяпер яны біліся два на два. Пан Пагасевіч быў паранены, і маскавіт моцна цісн уў яго. Урэшце рэшт маскавіт нанёс удар, які той ня здолеў адбіць.

Ян застаўся адзін супраць двух маскавітаў. Вора-

гі кружылі вакол яго, але пакуль яму ўдавалася адбіваць удары, якія сыпаліся з двух бакоў.

Аднаго з праціўнікаў падвёў конь, які рэзка скочыў у бок. Маскавіт страціў раўнавагу, і Заранковічу хапіла часу, каб нанесьці яму шабельны ўдар.

Цяпер двубой. Ян рашуча кінуўся на маскоўца і заатакаваў яго. Ён нанёс некалькі магутнейшых udараў і выбіў шаблю з рукі маскавіта. Заранковіч замахнуўся для апошняга ўдару. Але зрабіў ён гэта недастаткова хутка, дазволіўшы праціўніку наблізіцца да яго ўсутыч і ўдарыць па твары дзяржальняй бізуна, канец якой быў умацаваны металічнай набіванкай. У Заранковіча пацямнела ў вачах, і ён, нічога ня цямячы, апынуўся на зямлі. Маскавіт саскочыў з каня, падняў шаблю і кінуўся да яго. Ян не пасьпяваў устаць на ногі. Ён прыкінуўся, быццам ня можа ачуняць, але бакавым зрокам сачыў за набліжэньнем ворага. Калі той замахнуўся, Ян быў падрыхтаваны. Ён адскочыў убок, і шабля ўткнулася ў зямлю. Ударам у адказ Заранковіч паклаў ворага.

Вось і ўсё. Сутычка скончылася. З дзевяці ваяроў застаўся толькі адзін. Але былі яшчэ два маскавіты, якія гналіся за Мяжэвічамі. Ян ускочыў на ногі, але тут жа зноў зваліўся ад моцнага болю, які працяў галаву. Зноў пацямнела ў вачах. З цяжкасьцю ён адарваўся ад зямлі. Боль у галаве не праходзіў. Перад вачыма ўсё плыло. Ён дайшоў да каня і зьлёг у сядло. Яму ўдалося праехаць ня больш як сто крокаў. Галава так моцна кружылася, што давялося зьлезьці з каня. Паспрабаваў ісьці пешшу, але хутка паваліўся і самлеў.

Прытомнасьць вярнулася толькі праз некалькі гадзінаў. Галава моцна балела, але цяпер гэты боль можна было трываць. Левая частка твару, куды прыйшоўся ўдар, апухла, левае вока заплыло. Ён узьняўся на ногі і ўбачыў каня, які мірна пасьвіўся побач.

Ян ускараскаўся ў сядло і рушыў у той бок, куды паскакалі Мяжэвічы. Зямля была мокрая, на ёй добра былі відаць сьляды. Ян пачаў іх дасьледаваць. Ён знайшоў сьляды ад капытоў коней Мяжэвічаў і дваіх маскавітаў. Коні, якія ішлі наўскапыт, пакінулі на зямлі глыбокія, добра чытэльныя сьляды.

Праехаўшы некалькі вёрстаў, ён пабачыў удалечыні каня, побач з якім ляжаў чалавек. Ян пад'ехаў бліжэй, з цяжкім адчуваньнем чакаючы распазнаць у забітым Мікалая. Але не, гэта быў маскавіт. Галава разьбіта магутным ударам шаблі. Як сьведчылі сьляды, у гэтым месцы маскавіты дагналі Мікалая і Марыю. Была барацьба, у якой загінуў маскоўскі ваяр. Потым, згодна са сьлядамі, вершнікі памчаліся далей у ранейшым напрамку, але чамусьці ўтрох. Сьляды выразна паказвалі, што трое коней ішлі побач. І гэта паставіла Яна ў тупік. Чаму другі маскавіт ехаў з Мяжэвічамі, працягваючы аддаляцца ад сваіх? Калі ён захапіў Мікалая і Марыю, то чаму не вяртаецца назад?

Ян ехаў па сьлядах цэлы дзень, пакуль не надышоў змрок. Дагнаць коньнікаў яму не ўдалося. Некалькі разоў ён губляў сьляды. Відаць, маскавіт асьцерагаўся пагоні, і рухаўся так, каб заблытаць магчымых перасьледнікаў. Ён пастаянна паварочваў

у лес, доўгі час ехаў па неглыбокай ручаіне, пасьля якой Яну асабліва цяжка было знайсьці сьляды, часта мяняў кірунак руху.

Калі ў цемры стала немагчыма чытаць сьляды, Заранковіч спыніўся, распрог каня і разьмясьціўся спаць на зямлі. Ён доўга ня мог заснуць, разважаючы над загадкавымі паводзінамі таго, хто захапіў Мяжэвічаў. Так і ня здолеў ён нават уявіць, куды і навошта маскавіт вязе Марыю і Мікалая. Але засынаў ён з надзеяй на тое, што хутка яны будуць разам. Маскавіт, відаць, пакуль не зьбіраўся рабіць Мяжэвічам зла. Ян не сумняваўся, што хутка ён дагоніць іх, а сутычкі з адным чалавекам ён не баяўся. І, ужо засынаючы, Ян думаў аб Марыі і вырашыў, што яшчэ ніколі не сустракаў такой прыгожай дзяўчыны.

Наступнай раніцай Заранковіч працягнуў свой шлях. Сьляды былі меней заблытанымі. Хутчэй за ўсё, маскавіт вырашыў, што перасьледаваць яго няма каму. Ян бачыў, што даганяе іх. Адбіткі капытоў трох коней станавіліся ўсё больш сьвежымі. Ён прышпорыў свайго каня. Хутка ўсё вырашыцца.

Ян выехаў на вялікую паляну. Калі ён даехаў да яе сярэдзіны, то зразумеў, што маскавіт перахітрыў яго. У гэтым месцы ён з Мяжэвічамі зрабіў невялікую пятлю, вярнуўся ў адваротным кірунку і напэўна чакаў яго за дрэвамі.

Заранковіч спыніўся. Пасярод паляны, атачонай лесам, ён быў бачны, быццам на далоні. Калі ў праціўніка ёсьць лук са стрэламі, то яму давядзецца цяжка.

– Выходзь! – моцна крыкнуў ён.

Прайшло некалькі хвілінаў. Ян вырашыў, што маскавіт ня будзе пакідаць схову, таму ўжо зьбіраўся далей ехаць па сьлядах, але тут на краі паляны ён убачыў праціўніка. Той на кані нясьпешна набліжаўся да яго. Калі Заранковіч змог разабраць яго твар, яму зрабіліся зразумелыя загадкавыя паводзіны гэтага чалавека. Да яго кіраваўся Рольскі.

Пад'ехаўшы да Яна, разбойнік спыніўся насупраць яго і скіраваў позірк у вочы Заранковічу, якога ён, відаць, не пазнаў – падчас іх паядынку чатыры месяцы таму Ян быў у шаломе.

– Дык ты, я бачу, адзін застаўся, – прамовіў з насьмешкай Рольскі.

– А ты, я бачу, ад ката ўцёк, – парыраваў Ян.

Рольскі здрыгануўся і зьдзіўлена ўтаропіўся на Заранковіча.

– Дык гэта ты?! – ён прымружыў вочы і, памарудзіўшы, прамовіў:

– Дарэмна ты пра гэта сказаў, юнак. Лёгкай сьмерцю цяпер не памрэш.

– Адзін раз Госпад ужо аддаў цябе ў мае рукі. Дзе тыя, каго ты захапіў?

– Хочаш, каб яны ўбачылі тваю сьмерць? Няхай так станецца.

Рольскі разьвярнуў каня, паскакаў у лес і вывеў з-за дрэваў Марыю і Мікалая. Іх рукі былі зьвязаныя за сьпінамі, на тварах ніжэй за ўзровень вачэй былі туга завязаны белыя хусткі, якія рабілі іх бязмоўнымі.

Ян пад'ехаў да іх. Калі ён пабачыў спалоханыя вочы Марыі, халодныя дрыжыкі прайшлі па ягоным

целе. Але разам з тым погляд дзяўчыны быццам дадаў яму сілы.

– Хутка вы будзеце вольныя.

– Ня ўсё так проста, – сказаў Рольскі і зьняў хусткі з твараў Мяжэвічаў.

Мікалай плюнуў яму ў твар. Рольскі ўдарыў яго кулаком, і Мяжэвіч бразнуўся на зямлю.

– Ня трэба! –закрычала Марыя і павярнулася да Заранковіча.

– Ян...

– Усё ў парадку, спакойна адказаў юны рыцар і паўтарыў:

– Хутка вы будзеце вольныя.

Рольскі стаў насупраць яго.

– Ну і на што ты разьлічваеш? Ведаеш жа, што ты ня роўны мне.

Заранковіч у адказ прамовіў:

– Быў у цябе час для пакаяньня перад Госпадам. Але не захацеў ты скарыстацца гэтай літасьцю. Быў ты разбойнікам, а цяпер стаў яшчэ і здраднікам. Давядзецца мне з Божай дапамогай прывесьці ў выкананьне прысуд, які ты заслужыў.

Рольскі крыва ўсьміхнуўся.

– Так... Маскавіты прыйшлі своечасова. Не пасьпелі мне галаву адсекчы. А маскоўцам акурат патрэбны праваднік, які ведае мясцовасьць і дарогі.

– Здрадца!

Рольскі выхапіў шаблю з похваў.

– Хопіць пустых размоваў. Паразмаўляем на іншай мове.

Заранковіч таксама дастаў шаблю.

Разбойнік кінуўся на Заранковіча, хутка наносячы магутныя ўдары. Ён не сумняваўся ў тым, што праціўнік ня вытрымае гэтай атакі, але ўсе ягоныя ўдары былі адбітыя. Яму супрацьстаяў ужо далёка ня той неспрактыкаваны юнак, над якім ён меў калісьці вялікую перавагу. Школа ў Яна была добрая, а ўдзел у баявых дзеях прынёс досьвед і ўпэўненасьць у сваіх сілах. Ён адбіў атаку разбойніка і сам пайшоў наперад.

Рольскі адскочыў на некалькі крокаў назад.

– Бачу, маскавіты цябе нечаму навучылі.

І ён зноў пайшоў у атаку, яшчэ больш люта, чым першым разам. Ян адступаў пад яго ўдарамі. Мяжэвічы з хваляваньнем назіралі за рухамі ваяўнікоў. Некалькі разоў Ян з цяжкасьцю пазьбег шаблі праціўніка. У пэўны момант Рольскі настолькі моцна стаў яго ціснуць, што, здавалася, Заранковічу не перамагчы ў гэтым баі. Ужо Марыя ў адчаі не магла выседзець на месцы, Мікалай зьбіраўся наступным кінуць выклік Рольскаму, як раптам усё рэзка перамянілася. Ян парыраваў чарговы ўдар і пайшоў у атаку. Прычым так упэўнена, што цяпер Рольскі ледзьве пасьпяваў за яго шабляй.

Але не такі гэта быў чалавек, каб доўгі час абараняцца. Ён паспрабаваў зноў перахапіць ініцыятыву. Ян ня стаў адступаць, і цяпер яны секліся фактычна на месцы, амаль ня рухаючыся назад-уперад. Бой дасягнуў свайго апагею. Шаблі бліскалі, быццам маланкі. Праціўнікі абліваліся потам, але ўсё роўна абменьваліся зьнішчальнымі ўдарамі. Ужо сілы сталі пакідаць іх, і кожны ўдар суправаджаўся цяж-

кім выдыхам, ужо рукі рухаліся ня так хутка, як раней, а бітва ўсё працягвалася. Яны задалі адзін аднаму такі высокі тэмп бою, што стала ясна: вось-вось нехта з іх памыліцца, і на гэтым усё скончыцца. Мяжэвічы затаілі дыханьне, баючыся адарваць вочы ад паядынку. “Заранковіч ці Рольскі?” – маланкава думалі яны.

Пасьля працяглага абмену ўдарамі Ян не пасьпеў за рухамі Рольскага, і шабля праціўніка зачапіла ягоную галаву. Марыя ўскрыкнула. Ян выстаяў на нагах і зрабіў крок назад. Праз ягоны твар заструменіліся тонкія ручаінкі крыві. Рольскі сьціх на імгненьне, але, зразумеўшы, што рана несур’ёзная, кінуўся дацiскаць праціўніка. Ён наносіў магутныя ўдары, якія Заранковіч з цяжкасьцю адбіваў. Ян адступаў, адчуваючы, што надоўга яго ня хопіць і хутка будзе апошні ўдар, апошні ў ягоным жыцьці.

Але раптам Рольскі спыніўся, зрабіў некалькі крокаў назад, паглядзеў кудысьці за сьпіну Заранковічу і прамовіў:

– Другі раз табе пашанцавала, шчанюк.

Ён кінуўся да свайго каня, ускочыў на яго і крыкнуў:

– Калі мы сустрэнемся яшчэ раз, цябе ўжо ніхто не ўратуе.

Пасьля гэтых словаў ён разьвярнуўся і зьнік у лесе.

Ян павярнуўся і паглядзеў назад. Да іх набліжаўся аршак вершнікаў.

Ян зьняможана апусьціўся на зямлю. Мікалай падбег да яго.

–Разрэж вяроўкі.

Вызвалены Мяжэвіч схапіў шаблю, падбег да сястры і перарэзаў вяроўкі на яе руках. Марыя пасьпяшалася да Яна.

– Пан паранены.

– Гэта драпіна.

Марыя выцерла хустачкай кроў з твару Яна і перавязала рану. Яна сапраўды была неглыбокая і вялікай небясьпекі не ўяўляла. Калі рукі дзяўчыны датыкаліся да твару Заранковіча, ён злавіў сябе на думцы, што за кожны дотык можна было б прапусьціць ад Рольскага яшчэ пару ўдараў.

Хутка іх атачылі незнаёмыя ваяры, якія іх ўратавалі. На шчасьце, гэта былі свае, ліцьвіны.

## 10

Ратаўнікамі аказаліся ваяры з аддзелу аршанскай шляхты, якія ахоўвалі сваю зямлю ад магчымых нападаў маскавітаў. Калі рыцары пабачылі ахоўныя лісты ад віцебскага ваяводы і даведаліся, што вораг напаў на Мелехава, то хутка рушылі туды.

Заранковіч і Мяжэвічы, параіўшыся, вырашылі працягваць свой шлях у папярэднім кірунку. Яны дастаткова аддаліліся ад занятай маскавітамі тэрыторыі і спадзяваліся, што ніякіх непрыемнасьцяў з імі ўжо ня здарыцца. Аршанскія ваяры паабяцалі праўдзіць, ці не засталося жывых сярод віцебскіх зямянаў, якія ляжалі на дарозе да Мелехава.

Мікалай, калі рыхтаваў коней да далейшага шляху, заўважыў у траве скрутак папераў. Ён падняў яго і паклікаў Заранковіча.

– Відаць, той злодзей згубіў, калі ўцякаў.

Ян разгарнуў адну з папераў і прачытаў:

“Я, пан Мацьвей Салковіч з Полацку, гербу “Мядзьведзь”, пасьля маёй сьмерці прызначаю адзіным спадкаемцам усёй маёй маентнасьці пана Андрэя Рольскага з Воршы, гербу “Радван”.

Падобнага зьместу былі і астатнія аркушы. Яшчэ дзесяць шляхціцаў пасьля сьмерці пакідалі Рольскаму сваю маёмасьць.

– Ён прымушаў пісаць гэта палонных у Полацку, – прамовіў Ян, – а потым, напэўна, забіваў іх.

– Як такога носіць зямля? – сказаў Мікалай.

– Толькі да нейкага моманту. Ад суду яму не ўцячы. Калі не ад зямнога, дык ад нябеснага.

– Распавядзіце мне, што з вамі адбывалася, – папрасіў Ян, калі яны выехалі на добрую дарогу.

– Калі мы пакінулі вас біцца з маскавітамі, двое з іх пагналіся за намі, – пачаў Мікалай. – Нейкі час яны не маглі да нас наблізіцца, але потым нашы коні пачалі стамляцца. Урэшце рэшт нас дагналі. Я выхапіў шаблю і схапіўся з гэтым злодзеем.

– З Рольскім?

– Так.

– І што?

– Ён лёгка справіўся са мной, – Мікалай апусьціў галаву, – выбіў шаблю з рук, скруціў, быццам дзіця.

– Не бядуй. Ён сапраўды моцны ваяр. Саступіць такому нясорамна. Але маскавіта ты забіў?

– Не. Яго забіў Рольскі. Яны зьвязалі нам з Марыяй рукі. Маскавіт зьбіраўся вяртацца да сваіх. Вось тады Рольскі яго і засек. Ззаду.

– Зразумела. Што ён зьбіраўся з вамі рабіць?

– Хацеў завесьці некуды і патрабаваць выкуп. Яго ўразіла і зьдзівіла, што мы ехалі з аховай.

– Ці ты ведаеш яго? спытала Марыя Заранковіча. – Ён ліцьвін. Што ён рабіў з маскавітамі?

– Так, ён ліцьвін. Рольскі быў правадыром зграі разбойнікаў, якія рабавалі купецкія абозы каля Полацку. Мы іх разьбілі, а мне давялося схапіцца з ім, – ён павярнуўся да Мікалая, – тады толькі Госпад збавіў мяне ад сьмерці, нагэтулькі ён быў дужэйшы за мяне. Тады Рольскі быў узяты ў палон і завезены ў Полацак, дзе яму павінны былі адсекчы галаву. Але яго вызвалілі маскавіты. Ён зрабіўся іхным правадыром падчас наскокаў на нашы паселішчы.

– У першы дзень ён непакоіўся, што вы дагоніце нас, – сказала Марыя, – я ўсё чакала, калі вы зьявіцеся. Уначы не магла заснуць. Але раніцай ён сказаў, што вы ці загінулі, ці ня здолелі высачыць яго. Я ня ведала, што рабіць. Я амаль паверыла, што дапамогі чакаць няма адкуль. Ты зьявіўся ў той момант, калі надзея амаль згасла. Ня ведаю нават як табе дзячыць.

І Марыя так паглядзела на Яна, што сама зьбянтэжылася і пачырванела. А Ян падумаў, што за такі погляд ён гатовы кінуцца на дзесяцёх рольскіх.

– Тую пастку на паляне ён зрабіў на ўсялякі выпадак, – сказаў Мікалай, – ён вельмі зьдзівіўся,

калі ўбачыў цябе. Але, пераканаўшыся, што ты адзін, перастаў турбавацца.

– Усё мінула. Хутка будзем на месцы.

Яны імчалі ўглыб краіны. Бясьпеку, аднак, адчулі толькі ў Барысаве – першай буйной фартэцы на іхным шляху. Тут можна было не баяцца маскавітаў.

Затрымлівацца ў Барысаве яны ня сталі і, зьмяніўшы коней, паскакалі далей. Ззаду засталіся Смалявічы, Менск, Койданава, Сьвержань. Тут, у самым цэнтры Літвы, жыцьцё ішло сваім разьмераным парадкам. На дарогах было шмат падарожнікаў. Месьцічы займаліся рамяством і гандлем, сяляне апрацоўвалі валокі. Нішто ня сьведчыла пра небясьпеку, якая затаілася паблізу. Як быццам ня быў захоплены Полацак і яго ваколіцы. Як быццам не набліжалася на гэтыя землі з усходу злавесная пагроза.

Нарэшце ўдалечыні паказаўся Нясьвіж. Сэрца Яна затрапятала. Ён быў дома. Калі ён пакідаў горад пяць месяцаў таму, ніколі б не падумаў, што назаве Нясьвіж сваім домам. Але цяпер цяжкасьці першых месяцаў службы здаваліся яму нязначнымі. На іх ён амаль забыўся. У ягонай памяці аб тым часе засталіся самыя лепшыя ўспаміны. І як бы ён зараз хацеў, каб разам з вяртаньнем у горад вярнуўся і той былы час! На жаль, гэта было немагчыма. Рана ці позна павінна пачацца вялікая вайна. Былому часу ніколі не вярнуцца. Але нават на такую пэрспэктыву Ян глядзеў зараз ня так змрочна, як раней. Вяртаньне ў Нясьвіж як быццам дало яму сілы і падаравала надзею.

Яны прамчаліся па рынкавай плошчы і накіраваліся да замку. Нясьвіскі замак быў невялікіх памераў, рублены з дрэва. Разьмяшчэньне Нясьвіжа ў далечыні ад магчымых месцаў баявых дзеяў не патрабавала будаўніцтва вялікай абарончай цытадэлі, таму для такога буйнога магната, якім быў князь Радзівіл, замак выглядаў даволі сьціпла.

Каля брамы ім перагарадзілі шлях драбы.

– Стой! Хто такія?

Ян пад'ехаў да камандзіра.

– Паведаміце, што з Полацку прыбыў жаўнер з аддзелу паручніка Вітковіча.

Мінула паўгадзіны, калі іх прапусьцілі ў замак. Адзін з жаўнераў правёў іх да пана Гурэвіча, камандзіра харугвы, у якой служыў Ян.

Заранковіч, ідучы па тэрыторыі замку, прагна ўзіраўся ў твары мінакоў з надзеяй пабачыць каго-сьці знаёмага. Усё ў замку засталося такім жа, як і да ад'езду ў Полацак. Урэшце, з таго часу не мінула яшчэ і паўгады, а Яну здавалася, што ён адсутнічаў прынамсі некалькі год.

Да пана Гурэвіча павінны быў ісьці адзін Ян. Перад тым як увайсьці да камандзіра, Ян сказаў Мяжэвічам, якія з выразам лёгкага спалоху на тварах трымаліся ў незнаёмым месцы, каб яны не хваляваліся і чакалі яго.

Ян зайшоў у пакой, пакланіўся і стаў на зважай.

– Ваша міласьць, вяльможны пан ротмістар.

Пан Гурэвіч падыйшоў да Яна і ўважліва паглядзеў на яго.

– Як тваё імя?

– Ян Заранковіч.

– Ці ты быў у аддзеле Вітковіча?

– Так, ваша міласьць.

– Тваё імя здаецца мне знаёмым. Чаму толькі зараз вярнуўся ў Нясьвіж?

– Ваша міласьць, для адказу на пытаньне пана мне неабходна мець трохі часу.

Пан Гурэвіч паказаў на крэсла.

– Тады сядай і апавядай, – а сам сеў насупраць яго.

Ян распачаў падрабязны аповед пра падзеі, удзельнікам якіх яму давялося быць. Ён распавёў пра бойку з бандай Рольскага і першыя страты ў аддзеле, пра прыбыцьцё ў Полацак, пра атрыманьне весткі аб набліжэньні маскавітаў і рашэньні пана Вітковіча застацца абараняць горад. Далей ён апісаў аблогу Полацка, яго захоп, сьмерць і паланеньне абаронцаў. Ён падрабязна распавёў пра жудасную бойню і зьдзек, учыненыя Іванам Жахлівым над тымі, хто застаўся ў жывых, і пра гераічную сьмерць пана Вітковіча.

Калі Заранковіч апавядаў пра бойку з бандай Рольскага, пан Гурэвіч успомніў, дзе ён чуў ягонае прозьвішча. Махвіч, які прынёс вестку аб выправе Івана Жахлівага на Полацак, паведаміў, хто паланіў правадыра разбойнікаў. У аповедзе Заранковіча, як адзначыў сам сабе пан Гурэвіч, гэта падрабязнасьць адсутнічала.

Ян тым часам працягваў. Ён апісаў шлях з Полацку, атаку аддзела пана Збараскага і ўсё, што адбылася за час іх ад'езду з Віцебску.

Калі Заранковіч скончыў свой расповяд, пан Гурэвіч вымавіў:

– Тое, што ты мне распавёў, павінен пачуць князь. На жаль, ты спазьніўся на некалькі дзён. Яго мосьць накіраваўся ў Вільню на вальны сойм. Сёньня адпачывай, а заўтра з раніцы паскачаш да князя. Я не зьдзіўлюся, калі табе давядзецца выступаць перад панамі радай, а можа і перад самім манархам.

– Дазвольце пытаньне, ваша міласьць?

– Так?

– З Віцебску са мной прыбылі дзеці пані Мяжэвіч. Яны просяць аўдыенцыі ў князя.

– Я думаю, ім ня мае сэнсу ехаць з табой. Падчас сойму ў князя ня будзе часу займацца прыватнымі пытаньнямі. Да вяртаньня князя я вазьму іх пад сваю апеку, а потым адрэкамэндую іх яго мосьці.

– Дзякую, ваша міласьць.

Пан Гурэвіч устаў з крэсла.

– Так, з табой усё. Адпачывай, а заўтра паскачаш у Вільню. Запрасі да мяне тваіх спадарожнікаў.

Ян пакланіўся і выйшаў. Марыя і Мікалай з нецярплівасьцю чакалі яго.

– Ну што?

– Князь зьехаў у Вільню на вальны сойм. Заўтра раніцай я выпраўляюся да яго рабіць даклад аб падзеньні Полацка.

– А мы? – неспакойна запыталася Марыя.

– Пакуль князь ня вернецца, вамі будзе апекавацца пан Гурэвіч. Ён чакае на вас.

– Проста зараз? –спытаў Мікалай.

– Так. Ідзіце, не прымушайце яго чакаць. Я буду тут.

Мяжэвічы нясьмела ўвайшлі да пана Гурэвіча. Аўдыенцыя працягвалася нядоўга, і хутка яны зноў далучыліся да Яна. Амаль адразу зьявіўся пахолак і пакланіўся ім.

– Прашу вашмосьцяў кіравацца за мной.

Пахолак завёў іх у пакоі, якія пан Гурэвіч часова выдзеліў у карыстаньне Мяжэвічам. Ян суправаджаў брата з сястрой, і па меры таго, як набліжалася хвіліна растаньня, усё цяжэй станавілася ў яго на сэрцы, асабліва пры думцы аб тым, што заўтра ён на нявызначаны час зьедзе з Нясьвіжа. Ля дзьвярэй у пакой яны спыніліся. Ян паглядзеў на Марыю.

– Ну вось і ўсё.

– Ян, мы з Мікалаем вельмі ўдзячныя табе за ўсё, што ты зрабіў для нас. Калі ты вернешся?

– Нават ня ведаю. Можа, зраблю даклад князю і ён тут жа выправіць мяне назад. А, можа, давядзецца затрымацца.

– Мы будзем чакаць цябе.

– А я буду чакаць сустрэчы з вамі.

Ён зьвярнуўся да Мікалая.

– Калі вярнуся з Вільні, буду прасіць пана Гурэвіча прыняць цябе на службу. Ты добры ваяр. Дзякую Богу за сустрэчу з табой.

– Я таксама, Ян, дзякую Госпаду за тое, што ты паехаў з намі і выцягнуў нас. Калі б ня ты, страшна падумаць, што з намі было б. Ці ты завітаеш да нас заўтра перад ад’ездам?

– Я выеду вельмі рана. Вы яшчэ будзеце спаць.

Ян павярнуўся, каб сыходзіць, але раптам спыніўся і, паглядзеўшы Марыі ў вочы, сказаў:

– Мне будзе сумна бяз вас.

Марыя зьбіралася нешта адказаць, і Яну надзвычай важна было пачуць, што менавіта, але яе апярэдзіў Мікалай:

– Нам без цябе таксама. Вяртайся хутчэй. Будзем маліцца за цябе.

– Дзякуй вялікі, і я за вас таксама.

Дзьверы за імі зачыніліся, і Ян адчуў сябе жахліва самотным. Усе пачуцьці перамяшаліся ў ім: сімпатыя да прыгожай панны, неспакой напярэдадні будучай вайны, радасьць ад пасьпяховага вяртаньня ў Нясьвіж.

Харугвы, у якой служыў Ян, у замку не аказалася – яна была на вышкале ў полі і павінна была вяртацца ўвечары. Знаходзіцца аднаму ў чатырох кутах Яну было цяжка, таму ён выйшаў з памяшканьня і зрабіў сабе шпацыр па замку, які апусьцеў пасьля ад'езду князя і часткі двару ў Вільню. Потым ён пайшоў у горад. Там некаторы час хадзіў вуліцамі, успамінаючы, як яны рабілі гэта з Турам, Радынам і іншымі таварышамі, што загінулі ў Полацку.

Думкі Яна пастаянна вярталіся да Марыі. Ніколі раней ён ня меў падобных пачуцьцяў. Ніколі раней ён не сустракаў такой прыгожай панны. Яму здавалася, што ён таксама не абыякавы ёй. Прычым ён нават ня мог дакладна растлумачыць самому сабе, на чым заснаваная гэтая ўпэўненасьць. Але ці трэба казаць, што пераконваць сябе ў гэтым яму не было патрэбы? Таму ў будучыню Заранковіч глядзеў з над-

зеяй. Толькі паездка ў Вільню трохі турбавала яго. Але для сябе ён вырашыў: гэта ад Госпада. Растаньне праверыць тыя пачуцьці, якія нарадзіліся ня так даўно і цяпер займалі ўсе яго думкі. Ян пачаў маліцца, і сьветлы настрой агарнуў ягоную істоту, ён яшчэ раз перажыў Божую любоў і дзякаваў Госпаду ўсім сэрцам, што застаўся жывым тады, калі выжыць было немагчыма.

Заранковіч толькі пасьпеў вярнуцца ў замак, як убачыў сваю харугву.

Шыхт закутых у жалезныя панцыры вершнікаў набліжаўся да замку з боку лесу, пакідаючы пасьля сябе хмары пылу на дарозе. Уперадзе ехалі вайсковыя музыкі – трубач і бубніст, якія агалошвалі ваколіцу гучнай музыкай. За музыкамі пагойдваўся ў сядле харунжы, які праводзіў вышкал, за ім – сьцяганосец, які трымаў штандар з гербам Радзівілаў “Трубамі”, а далей – стройныя шыхты рыцараў з дзідамі ў руках. Пры выглядзе гэтай моцы, гэтых упэўненых рухаў і гордых паставаў вершнікаў сэрца Яна напоўнілася лікаваньнем. Праз пэўны час гэтыя і тысячы іншых рыцараў пойдуць на маскавітаў. І небясьпека, што пагражала яго краіне, ужо не здавалася былому абаронцу Полацка такой вялікай. Так, праціўнік быў магутны. Апошнія падзеі даказалі гэта, і зараз ня трэба нікога пераконваць у неабходнасьці мабілізацыі ўсіх вайсковых сілаў Вялікага Княства. Але ён верыў, што нарэшце будзе сабрана вялікае войска і вораг будзе адкінуты з захопленых земляў. Літва яшчэ не загінула, пакуль гэтулькі

сэрцаў гатовыя служыць ёй на полі бітвы. Госпад не забыўся пра зямлю, якая славіць Ягонае Імя.

Так разважаў Ян, з хваляваньнем назіраючы за набліжэньнем войска. Ён стаяў трохі ў баку ад шляху харугвы, якая была ўжо ў замку. Цікава, ці пазнае яго хто? Харунжы пан Макоўскі пашыхтаваў ваяроў, прамовіў ім некалькі словаў і распусьціў. І адразу некалькі чалавек на чале з Пятром Махвічам падбеглі да Заранковіча.

– Ян! Гэта ты?

– Жывы?!!

Прыяцелі атачылі яго, пачалі абдымаць, засыпалі пытаньнямі. Вестка аб тым, што з Полацку прыбыў жаўнер аддзелу паручніка Вітковіча, хутка разьляцелася сярод ваяроў, так што ледзьве ня ўся харугва сабралася вакол Заранковіча. Мноства рук пацягнулася да яго, быццам жадаючы пераканацца ў тым, што перад імі стаіць чалавек з плоці і крыві, а ня здань. Ян не пасьпяваў адказваць на прывітаньні і пытаньні. Нарэшце гэты вэрхал спыніў Махвіч.

– Ціха! – закрычаў ён. – Пытаньні задаю толькі я, – і гучна, так, каб яго чулі ўсе, хто сабраўся, зьвярнуўся да Яна:

– Што з астатнімі?

– Загінулі.

Нягледзячы на тое, што да такога адказу ўсе былі гатовыя, усё ж нейкая невялікая надзея на выратаваньне таварышаў у многіх захавалася. Цяпер і яна зьнікла. Ваяры апусьцілі галовы. Ня верылася, што такіх слаўных рыцараў, як пан Вітковіч і пан Карытка, больш няма ў жывых.

Увечары ўсе, хто застаўся ў замку, сабраліся ў аднной з заляў дзеля таго, каб выслухаць аповед Заранковіча пра страшны лёс Полацку. Перад тым як Ян пачаў, яго паклікаў да сябе пан Гурэвіч. Пан ротмістар трымаў у руках два лісты.

– Гэта ўручыш князю, – сказаў ён Яну, перадаўшы адзін з лістоў, – у ім я напісаў пра цябе. Калі яго мосьць зацікавіцца, распавядзеш яму ўсё, што бачыў. Другі ліст дасі пану Хвароўскаму, камандзіру харугвы, якая суправаджае князя. Пакуль ня вернешся ў Нясьвіж, ты паступаеш пад яго каманду. А зараз ідзі, цябе ўсе чакаюць. Хутка гэтак жа будзеш выступаць перад дыгнітарамі.

На працягу ўсяго вечара Ян падрабязна распавядаў сваю гісторыю. У залі была цішыня. Ян быў добры апавядальнік, слухачы баяліся прапусьціць хоць слова з ягоных вуснаў. Толькі два разы ён вымушаны быў перапыніць аповед, таму што слухачы занадта ўзрушана рэагавалі на ягоныя словы. Першы раз – пры апісаньні таго, як полацкі міністар адхіліў прапанову Івана Жахлівага. Другі раз – калі паведаміў пра сьмерць пана Вітковіча.

## 11

Наступнай раніцай на золку Ян выехаў з замку, мінуў места і памчаўся па дарозе на Сьвержань. Перад ад'ездам Заранковіч з сумам паглядзеў на вокны пакояў, дзе спалі Мяжэвічы. Сэрца сьціснулася пры думцы пра растаньне з Марыяй. А ён так нічога і не

сказаў ёй, не адкрыў ёй сваіх пачуцьцяў. Праўда, ён падазраваў, што гэтыя пачуцьці выразна чыталіся на ягоным твары, але ўсё роўна трэба было адкрыцца ёй на словах. Калі ж надарыцца наступная магчымасьць зрабіць гэта, ён ня ведаў. Сойм мог працягвацца не адзін тыдзень. За гэты час шмат чаго можа адбыцца ў Нясьвіжы. Было цалкам верагодна, што на такую прыгожую панну зьверне ўвагу які-небудзь кавалер з княскага двару. А яго ў гэты час ня будзе побач.

Падобныя невясёлыя карціны Ян маляваў у сваім уяўленьні на працягу ўсяго шляху да Вільні. Але па меры таго, як ён аддаляўся ад Нясьвіжа, гэтыя карціны станавіліся ўсё меньш яснымі. Дарога паглынула ягоныя думкі, тым больш, што ўздоўж яе было на што падзівіцца.

Пасьля Сьвержаня ён павярнуў на Мір, дзе спыніўся побач з велічным замкам, які належаў князю Юрыю Ільінічу. Князь быў апошнім прадстаўніком свайго слыннага роду па мужчынскай лініі. Пасьля заканчэньня будаўніцтва замку ягоным дзедам, таксама князем Юрыем, усе Ільінічы памерлі адзін за адным, не пакінуўшы нашчадкаў. Бацькі цяперашняга ўладара замку ня стала, калі ён быў яшчэ дзіцём, так што да дасягненьня паўнагадовасьці яго апякуном быў князь Мікалай Радзівіл Чорны.

Далей на шляху Заранковіча ляжаў Навагрaдак, першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Тут у трынаццатым стагодзьдзі зараджалася магутная дзяржава ліцьвінаў. Хто б мог тады падумаць, што з маленькага Наваградзкага княства, з усіх бакоў аточанага моцнымі ворагамі, выйдзе адна

з найбуйнейшых краінаў Эўропы? Але ні галіцка-валынскія князі, ні крыжакі Тэўтонскага ордэну, ні татары ня здолелі падпарадкаваць маладое Княства.

Наваградзкі замак моцна адрозьніваўся ад Мірскага. Гэта была вялікая сярэднявечная цытадэля, у параўнаньні з якой замак у Міры здаваўся дэкаратыўным.

Сем вежаў, самай высокай з якіх быў дванаццацісажневы данжон, злучаліся тоўстымі мурамі, у якіх былі зроблены байніцы. Пяць вежаў сталі на вяршыні гары, а яшчэ дзьве  ля яе падножжа, ствараючы баявую галерэю. Менавіта з гэтага боку ворагі часьцей за ўсё штурмавалі замак.

Каменны замак побач з драўляным пачаў узводзіць пры канцы чатырнаццатага стагодзьдзя яшчэ вялікі князь Вітаўт, а апошнія дзьве вежы былі пабудаваны параўнальна нядаўна – колькі дзясяткаў гадоў таму.

Гэты замак ніколі ня быў захоплены ворагам. Аб яго сьцены шматразова разьбіваліся нашэсьці крыжакоў і татараў.

Чым бліжэй Ян пад’яжджаў да сталіцы, тым больш ажыўлена станавілася на гасьцінцы. Шляхта з усёй краіны кіравалася на сойм і падцягвалася ў Вільню.

11 траўня праз Медніцкую браму Ян уехаў у велічнае места. Да гэтага ён ніколі ня быў у сталіцы. Горад быў абнесены каменным мурам з вежамі і брамамі, яшчэ здалёку быў відаць Верхні замак, над дахамі дамоў узвышаліся каталіцкія і праваслаўныя храмы, сярод іх сустракаліся ня так

даўно пабудаваныя рэфармацкія зборы. Пасьля Медніцкай брамы Ян мінуў царкву Сьвятой Тройцы, якую найвышэйшы гетман князь Канстанцін Астроскі зафундаваў пасьля легендарнай перамогі ў бітве пад Воршай, і апынуўся перад Ніжнім замкам. Ён праехаў паўз вялікакняскі палац і замкавую гару. Наблізіўшыся да касьцёлу Сьвятой Ганны, юнак спыніўся і сьпешыўся, доўгі час разглядваючы яго. Такіх прыгожых храмаў ён яшчэ ня бачыў. Заранковіча захапілі гатычныя формы касьцёлу: вострыя шпілі, якія цягнуліся ў неба, высокія вокны, невялікія вежы з дробным арнамэнтам. Касьцёл быў невялікім і хутчэй нагадваў капліцу. Асабліва маленькім ён здаваўся ў параўнаньні з храмам бэрнардынаў, які стаяў за ім. Гэта быў тыповы для свайго часу касьцёл-крэпасьць. Ён быў масіўны, шырокі, умацаваны байніцамі, контарфорсамі і вежамі для вядзеньня агню. Бэрнардынскі касьцёл быццам бы вырас для абароны невялікай зграбнай Ганны, якая зьявілася на гэтым месцы на некалькі дзесяцігодзьдзяў раней за яго.

Потым Ян вярнуўся назад у бок замкаў. На Дамініканскай плошчы ён зайшоў у рэфармацкі збор, пабудаваны з фундацыі князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Там ён даведаўся, як праехаць да палацу Радзівілаў на Лукішках. Прыбыўшы на месца, Заранковіч падыйшоў да дзяжурнага жаўнера. Яго адвялі да пана Хвароўскага. Ротмістар расьпячатаў ліст пана Гурэвіча і пачаў яго чытаць.

– Князя зараз няма ў палацы, – сказаў ён, калі скончыў чытаньне, – ён заняты апошнімі

прыгатаваньнямі да сойму, але калі вернецца, то скажу пра цябе адразу.

Князь прыбыў у палац толькі ўвечары. Даведаўшыся пра Заранковіча, ён загадаў прывесьці яго да сябе.

За чатыры месяцы службы Ян не аднойчы бачыў князя. Але да гэтага ніколі яму не даводзілася стаяць перад канцлерам Вялікага Княства гэтак блізка.

Князю-ваяводзе ішоў сорак дзявяты год. Ён меў высокі лоб, коратка падстрыжаныя цёмныя валасы і густую бараду, праз якую побач з яго імем заўсёды дадавалі прыдомак "Чорны". Гэта было неабходна таксама дзеля таго, каб адрозьніваць яго ад стрыечнага брата, таксама Мікалая Радзівіла, найвышэйшага гетмана, якога дзеля колеру барады празвалі "Рудым".

Князя Радзівіла называлі некаранаваным каралём Літвы. Ён быў самым багатым і ўплывовым магнатам дзяржавы. З вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам яго зьвязвала даўняе сяброўства яшчэ з дзіцячых гадоў. Абодва гадаваліся ў Кракаве пры польскім каралеўскім двары. Калі ў 1544 годзе на Берасьцейскім сойме стаяла пытаньне аб выбраньні Жыгімонта Аўгуста вялікім князем літоўскім, самым гарачым яго прыхільнікам выступіў Мікалай Радзівіл Чорны. Пасьля таго як Жыгімонт Аўгуст быў абраны манархам, Мікалай Радзівіл атрымаў пасаду вялікага маршалка і распачаў актыўна займацца дзяржаўнымі справамі. У 1549 годзе ён зрабіўся ваяводам троцкім, у 1551 – канцлерам, у 1552 – віленскім ваяводам. Вялікакняскім прывілеем ён

атрымаў права трымаць у сваім Нясьвіскім архіве дзяржаўныя дакумэнты.

Яшчэ яго называлі галоўным пратэстантам краіны. У 1553 годзе князь публічна абвясьціў аб тым, што вызнае эвангельскую веру і закладае ў сваім палацы ў Вільні рэфармацкую царкву. Ад гэтага моманту пачаўся масавы пераход магнатаў і зямянаў Вялікага Княства на бок Рэфармацыі.

– Распавядзі мне пра ўсё, што бачыў, – зьвярнуўся князь да Заранковіча.

І Ян каторым разам павёў сваё апавяданьне. Князь уважліва слухаў яго, зрэдку задаваў пытаньні, хочучы даведацца пра пэўныя дэталі. Калі Ян распавёў пра Мяжэвічаў, князь спытаў яго:

– Ці яны засталіся ў Нясьвіжы?

– Так, ваша княская мосьць. На час адсутнасьці мосьці князя апеку над імі ўзяў пан Гурэвіч.

– Добра. Ці ліст пані-маці Мяжэвічаў пры табе?

– Так.

– Дай яго мне. Я заапякуюся імі.

Ян, зусім зьнясілены пасьля далёкай дарогі і стамляльнага аповеду, скончыў сваё апавяданьне позьнім вечарам. На князя, відаць, зрабіла вялікае ўражаньне ўсё сказанае Заранковічам. Калі малады шляхціц змоўк, князь Радзівіл пэўны час працягваў задумліва сядзець у крэсле, ня робячы ніякіх загадаў. Нарэшце ён сказаў:

– Заўтра я вазьму цябе з сабой на сойм. Калі знойдзецца час у перапынках паміж саймаваньнямі, ты паўторыш усё сказанае тут перад вялікім князем і панамі радай.

Вальны сойм 1563 году пачаў сваю працу 12 траўня. Прычынай яго склікання стала небывалая параза, якую ў Полацкай вайне Масковія нанесла Літве. Страта аднаго з самых буйных і заможных гарадоў Княства, славы якога не засланяла нават слава сталіцы, была моцным ударам па прэстыжу дзяржавы.

Атрымаўшы вестку аб падзеньні Полацка, паны-рада прасілі вялікага князя Жыгімонта Аўгуста як мага хутчэй прыехаць з Польшчы ў Літву і склікаць вальны сойм. Ува ўсе канцы Княства паляцелі ганцы з лістамі аб выкліку на сойм прадстаўнікоў рыцарскага стану.

Усім было відавочна, што вайна з Масквой, якая да гэтага часу праходзіла ў Інфлянтах ці на памежных землях, трывала і надоўга перакінулася на абшары Літвы.

Ян прыбыў на першае паседжаньне сойму ў складзе сьвіты князя Радзівіла. Уся прастора залы, дзе павінны былі праходзіць саймаваньні, была запоўнена пасламі. Тут сабралася эліта Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага: сьвецкія і духоўныя саноўнікі, якія складалі дзяржаўную раду, дворныя і земскія ўрадоўцы, князі і паны харугоўныя, а таксама земскія паслы. Кожны займаў вызначанае рэглямэнтам месца, так што паслы ўтварылі чатырохкутнік, пакінуўшы ўсярэдзіне пляцоўку для выступоўцаў. Самыя знакамітыя магнаты сядзелі ў першым шэрагу, за іх сьпінамі сталі астатнія паслы, а вялікі князь Жыгімонт Аўгуст

разьмяшчаўся на троне пасярэдзіне галоўнай лініі гэтага чатырохкутніка.

Сойм распачаў сваю працу. Адны паседжаньні зьмяняліся другімі, падымаліся і вырашаліся дзяржаўныя пытаньні, незаўважна пралятаілі дні.

Ян ніколі не ўяўляў, што яму нагэтулькі цікава будзе сачыць за працай сойму. Разьвязаньне пытаньняў, якія тычыліся лёсу цэлай краіны і ўсяго народу, цалкам захапілі яго ўвагу. Ён забыўся на ўсё, што было раней, і жыў тым, што чуў і бачыў у гэтыя дні.

На самым пачатку саймаваньня пасламі было прызнана, што значная доля віны ў страце Полацка ляжала на магнатах, якія ці не зьявіліся на вайну ў вызначаны тэрмін, ці, зьявіўшыся, не прывялі з сабой той колькасьці ваяроў, што яны былі абавязаны сабраць. Таму на сойме абмяркоўваўся шэраг пастановаў з мэтай больш поўнага і спраўнага адбываньня вайсковай службы землеўладальнікамі шляхецкага стану.

Усе зямяне абавязаны былі з кожных дзесяці службаў выставіць аднаго ваяра са шчытом, дзідай і на кані, коштам ня меньш за 6 коп грошай. Хто не пастаўляў свайго ваярскага почту спраўна, той губляў маёнтак. Ніхто пад страхам сьмяротнага пакараньня ці пазбаўленьня гонару ня меў права пасылаць на вайну замест сябе служку ці найміта, за выключэньнем выпадкаў старэчай кволасьці, цяжкой хваробы ці адбыцьця іншай гаспадарскай ці земскай службы.

Перад адпраўленьнем на вайну харунжыя, павод-

ле даўняга звычаю, павінны былі сабраць усю шляхту сваіх паветаў у вызначанае загадам месца, перапісаць ваяроў, запісаць тых, хто застаўся дома, а потым усім разам накіравацца да гетмана. У абавязкі харунжаму таксама ставілася сачыць за тым, каб ваяры не чынілі шкоды мясцовым жыхарам.

Зацьвердзіўшы гэтыя ды іншыя пастановы, Жыгімонт Аўгуст прызначыў збор паспалітага рушэньня на 1 жніўня ў Крэве.

Наступным пытаньнем, якое разглядалася, была сытуацыя з аплатай службы найманых жаўнераў. Сродкі земскага скарбу былі зусім вычарпаны, дзяржава завінавацілася ваярам немалую суму. Яшчэ да пачатку працы сойму Жыгімонт Аўгуст разаслаў па ліцьвінскіх замках лісты, у якіх заклікаў найманых жаўнераў не пакідаць службы і абяцаў ім выплаціць заслужанае па сваім прыезьдзе ў Літву. Станы адказалі, што разумеюць неабходнасьць новых фінансавых збораў на ваенныя патрэбы, і пісьмова заявілі вялікаму князю пра гатовасьць заплаціць срэбшчыну дзеля абароны краіны.

Не адна толькі вайна з Масквой абмяркоўвалася на сойме. На парадак дня было вынесена пытаньне, рашэньне якога чакалася многімі ўжо доўгі час. Размова ішла пра скасаваньне тых артыкулаў Гарадзельскага прывілею, у якіх правы і вольнасьці замацоўваліся толькі за шляхтай каталіцкай веры, і згодна з якімі толькі яна мела права пасупаць на дзяржаўную службу і ўваходзіць у склад паноў-рады. На практыцы гэтыя артыкулы даўно ўжо ня дзейнічалі – і пратэстанты, і праваслаўныя на роўных з ка-

талікамі ўдзельнічалі ў грамадзкім жыцьці краіны і кіраваньні дзяржавай. Але надыйшоў час, калі пратэстанцкая шляхта запатрабавала юрыдычна замацаваць роўнасьць усіх трох хрысьціянскіх канфэсіяў перад законам і дзяржавай. Пасьля рады з сэнатам Жыгімонт Аўгуст абвясьціў, што зьмешчаныя ў Гарадзельскім прывілеі абмежаваньні для некаталіцкай шляхты будуць зьнятыя. Ад гэтага часу прадстаўнікі ўсяго рыцарства і шляхецтва бяз розьніцы веры, каб яны толькі былі хрысьціянамі, мелі права атрымліваць ад вялікага князя пасады і ганаровыя званьні згодна з заслугамі перад Айчынай кожнай канкрэтнай асобы.

Тады ж праходзілі нарады з нагоды магчымай вуніі з Польшчай. У лістападзе ў Варшаве мусіў быць супольны польска-ліцьвінскі сойм, прысьвечаны гэтаму пытаньню. Але актывізацыя ваенных дзеяў з Масквой зашкодзіла гэтым плянам. Паколькі замірэньне з маскоўскім князем было ўкладзена да 15 жніўня, то было ня ясна, ці будзе яно працягнута ці нават парушана. Таму з ліцьвінскага боку ў супольным сойме не маглі ўзяць удзел усе, хто меўся гэта рабіць пры звычайных умовах. У зьвязку з гэтай акалічнасьцю было прынята рашэньне выбраць на сойм у Польшчу дэлегацыю і выпрацаваць для яе інструкцыю, адступаць ад якой паслы ня мелі права. У склад дэлегацыі былі абраныя самыя знакамітыя князі і паны Вялікага Княства. А ў сувязі з тым, што ад Кароны ў сойме меліся ўзяць удзел месьцічы сталічнага Кракава месьцічы Вільні таксама былі выпраўлены на перамовы.

Пасьля таго, як інструкцыя была выпрацавана, яе зачыталі сойму.

Паслы павінны былі сабрацца ў Вуграве на Падляшшы да 21 лістапада і разам выправіцца ў Варшаву. У інструкцыі, дадзенай ім, былі падрабязна выкладзены ўмовы, на якіх магла быць заключана вунія.

Першай умовай ставілася, каб для Польшчы і Літвы быў адзін манарх, які б выбіраўся з кіроўнай дынастыі агульнымі галасамі. Па спыненьні гэтай дынастыі палякі ня мелі права выбіраць караля бяз ведама ліцьвінаў, а ліцьвіны – вялікага князя бяз ведама палякаў. Выбары супольнага манарха павінны былі адбывацца на межах абодвух дзяржаваў, пасьля чаго ён мусіў каранавацца ў Кракаве ў прысутнасьці ліцьвінскіх паслоў, а потым адбывалася ганаровае ўзьвядзеньне на вялікае княжаньне ў Вільні ў прысутнасьці польскіх паслоў. Перад каранацыяй у Кракаве выбраны манарх павінны пацьвердзіць правы і вольнасьці жыхароў Кароны Польскай, а перад узьвядзеньнем на вялікае княжаньне – правы і вольнасьці жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Пасьля гэтага адбывалася прысяга гаспадара паводле традыцыйнай формы.

Выбраны манарх мусіў з аднолькавай прыхільнасьцю ставіцца да абедзьвюх дзяржаваў, не аддаючы адной з іх перавагі перад другой.

Палякі і ліцьвіны павінны былі абавязацца ніколі не пакідаць свайго манарха, дапамагаць адно аднаму ва ўсіх цяжкасьцях і зьменлівасьцях лёсу, дапамагаць словам і справамі супраць падкопаў і

нападаў усіх ворагаў, не пачынаць разладаў і войнаў з суседзямі без супольнай згоды, не заключаць ні з кім новых дамоваў і не парушаць старых, не пасылаць паслоў бяз рады і згоды адно з адным, мець агульных ворагаў і сяброў.

Павінны быць вызначаны памеры ваеннай дапамогі, якую адны аказваюць другім як паспалітым рушэньнем, так і найманымі войскамі ды грашыма.

Вальныя соймы павінны былі праходзіць асобна ў Польшчы і асобна ў Літве. У інструкцыях дапускалася згадзіцца на агульныя польска-літоўскія соймы, але на такіх соймах павінны выраШацца толькі тыя пытаньні, якія тычацца абодвух дзяржаваў і ні ў якім разе не павінны разьвязвацца справы, якія датычылі б асобнай краіны.

Кожная дзяржава павінна была самастойна абіраць сэнат, прызначаць урады, адпраўляць суды, выдаваць законы. Літва і Карона павінны былі захоўваць сваю беспасярэднюю і пасярэднюю найвышэйшую ўладу – merum et mixtum imperium.

У выпадку вайны на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага заступае на сваю пасаду літоўскі гетман, якому падначальваюцца войскі, адусюль сабраныя. У выпадку вайны на тэрыторыі Кароны Польскай войскамі кіруе гетман каронны.

Такімі былі інструкцыі, дадзеныя ліцьвінскім паслам на супольны сойм.

Пасьля абмеркаваньняў умоваў магчымай вуніі з Польшчай надыйшоў час для хадайніцтваў і заяваў прадстаўнікоў розных земляў і паветаў.

Першымі выступалі прадстаўнікі Кіеўскай зямлі. Паслы пакланіліся Жыгімонту Аўгусту.

– Ваша каралеўская мосьць, князі, паны і земяне Кіеўскай зямлі просяць Вас, каб нас запрашалі на соймы адмысловымі лістамі згодна з даўнім звычаем, як і абывацеляў іншых земляў, – пачаў казаць адзін шляхціц.

– Ці ж цяпер так ня робіцца? – зьдзівіўся Жыгімонт Аўгуст.

– Ваша мосьць, справа ў тым, што лісты з запрашэньнем на гэты сойм не дайшлі да Кіеўскай зямлі, і мы выправіліся ў Вільню са спазьненьнем, грунтуючыся толькі на чутках пра скліканьне сойму.

– Даўні звычай запрашаць на сойм паслоў з Кіева адмысловымі лістамі будзе дзейнічаць і надалей, – адказаў манарх. – Што ж тычыцца гэтага сойму, то лісты былі таксама пасланы, але, відаць, не дайшлі праз вялікую адлегласьць і малы час, які быў адведзены для збору паслоў.

– Ваша мосьць, кіеўскія земяне просяць таксама, каб іх не прымушалі даваць людзей на будаўніцтва кіеўскага замку, бо, па-першае, яны ня маюць абавязку гэта рабіць, а па-другое, шляхецкія ўладаньні ў дадзены момант моцна спустошаны ворагам.

– Я ўжо загадаў ваяводу далучаць да будоўлі замку толькі тых земянаў, якія абавязаны гэта рабіць. Але я быў бы вельмі ўсьцешаны, каб і астатнія паны дапамаглі ім хутчэй дабудаваць замак у гэты небясьпечны час, – сказаў Жыгімонт Аўгуст.

– Просім, мосьці княжа, таксама, каб разам з намі пры кіеўскім замку несьлі вайсковую службу і ўсе

князі, паны і зямяне іншых земляў, якія маюць уладаньні ў Кіеўскім павеце.

– Гэта справядліва. Хай так будзе, але толькі для тых паноў, у каго ў Кіеўскім павеце галоўныя маёнткі.

Прадстаўнікоў Кіеўскай зямлі зьмянілі паслы Мсьціслаўскага павету.

– Ваша мосьць, беручы пад увагу небясьпеку ад Масквы, якая пагражае нашаму гораду, просім Вас распарадзіцца пра пачатак рамонту ў Мсьціслаўскім замку і пра папаўненьне яго службовымі людзьмі, гарматамі, жалезам, салетрай і харчовымі запасамі.

– Я загадаю папоўніць залогу ваярамі. Аб высылцы гармат, жалеза і салетры распараджэньне ўжо зроблена.

– Ваша каралеўская мосьць, мсьціслаўскія зямяне просяць Вас абараніць іх ад ротмістарскіх гвалтаў, асабліва ад пана Пятра Куніцына. Паны ротмістры трымаюць корчмы пры шляхецкіх дамах, у замку і ў месьце, а таксама бяруць у лік сваіх драбоў шляхецкіх падданых.

– Я ўжо загадаў пасłаць з канцылярыі ліст да старасты князя Яна Саламярэцкага з загадам даць шляхце суд і ўправу на ротмістраў. Калі яны не паслухаюцца, то стануць перад гаспадарскім судом.

– Дзякуем, Ваша каралеўская мосьць. Просім Вас таксама адвесьці для нашых жонак і дзяцей прыстанішча на выпадак небясьпекі.

– Прызначаю для гэтага Сьвіслач, – сказаў вялікі князь і кароль.

Мсьціслаўскіх дэлегатаў зьмянілі прадстаўнікі

Жмудзкай зямлі. Жмудзкія зямяне прасілі, каб на вайне іх не адлучалі ад астатняга войска, як гэта было ў мінулым годзе, дзеля чаго ваяры мелі вялікія клопаты падчас доўгай і дрэннай дарогі. Потым паслы скардзіліся на мернікаў і рэвізораў, якія доўга не выплочваюць кампэнсацыі за адрэзаныя ў выніку валочнай памеры землі, і прасілі, каб гэтыя мернікі і рэвізоры падчас вайны спынялі памеру і выпраўляліся на вайну разам з астатняй шляхтай.

Апошнюю просьбу заля сустрэла ўхвальным шумам. Жыгімонт Аўгуст са сьмехам адказаў, што задаволіць гэтае справядлівае патрабаваньне, бо ў адваротным выпадку нашу зямлю будзе мераць вораг.

– Ваша каралеўская мосьць, просім Вас абараніць убогіх зямянаў, у якіх землі памераны на валокі, каб яны не страчвалі сваіх земляў і ня мелі шкоды для шляхецкай годнасьці.

– Рэвізоры і мернікі ня маюць паўнамоцтваў пазбаўляць земляў і ставіць пад сумніў шляхецтва, – сказаў вялікі князь. – Я гатовы даць суд і ўправу кожнаму, каму была ўчынена падобная крыўда.

– Ваша каралеўская мосьць, з памерай зямлі на валокі ў нас адняты ўваходы ў гаспадарскія пушчы, дзе мы бярэм дрэва і дровы, насуперак старадаўняму нашаму праву, зацьверджанаму Вашым слаўным айцом і Вашай каралеўскай мосьцю. А ў тых пушчах, дзе яшчэ не памераны на валокі, гаспадарскія лясьнікі Марцін Падскарбі і Мікалай Воўк рабуюць зямянаў ды іхных людзей,ураднікі забараняюць нам

лавіць рыбу ў гаспадарскіх азёрах і рэках, хаця Вашай мосьці ад гэтага няма ніякай страты.

– Я пакідаю вас пры старадаўніх правах і вольнасьцях і не забараняю вам уваходзіць у мае пушчы па дровы і дрэва для будоўлі, але я забараняю вырабляць у пушчах лясныя тавары на спуск, высякаць лес і рабіць разоры. Я ўжо распарадзіўся выдаць вам грамату, якая дазваляе браць дрэва і дровы з пушчаў для прыватных патрэбаў, таксама як і лавіць рыбу ў азёрах і рэках.

Ян чакаў, што князь Радзівіл ужо ў першыя дні паставіць яго перад сэнатам. Але час ішоў, паседжаньні праходзілі ад раніцы да позьняга вечару, і магчымасьці для ўключэньня ў парадак соймавых дзён дакладу Заранковіча не было і не прадбачылася. Ян ужо амаль забыўся, з якой мэтай князь узяў яго з сабой, тым больш, што яму вельмі цікава было назіраць за працай парлямэнту. Дні пралятали незаўважна. Ён з захапленьнем глядзеў на дзяржаўных мужоў, якім была нададзена ўлада ў Вялікім Княстве. Яны здаваліся Заранковічу тытанамі, зважаючы на тую адказнасьць, якая была ўскладзена на іх плечы. Сапраўды, лягчэй было працаваць шабляй на полі, чым прымаць рашэньні, ад якіх залежалі жыцьцё і дабрабыт сотняў тысяч людзей.

Аднаго дня, надвячоркам, у перапынку паміж паседжаньнямі князь Радзівіл загадаў Заранковічу кіравацца за ім. Яны ўвайшлі ў невялікі пакой, дзе сабраліся каля дваццаці асобаў, і калі Ян пазнаў іх, ён зразумеў, дзеля чаго князь прывёў яго сюды. У пакоі знаходзіліся вялікі князь і многія знакамітыя

паны. Гэта былі людзі, якія кіравалі Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім. За час побыту на сойме Ян ужо ведаў з твару многіх уплывовых вяльможаў. Тут знаходзіліся найвышэйшы гетман князь Мікалай Радзівіл Руды, падчашы Мікалай Кішка, віцебскі ваявода князь Стэфан Збараскі, ваяры якога ўратавалі Заранковіча, падстолі Станіслаў Пац, польны гетман Рыгор Хадкевіч, віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч, кіеўскі біскуп Мікалай Пац ды іншыя магнаты.

Сэнатары сабраліся вакол вялікага князя, які сядзеў у цэнтры пакою.

Жыгімонту Аўгусту ішоў сорак трэці год. Ужо амаль дваццаць год як ён быў абраны манархам дзяржавы. Вялікі князь меў ламаны рымскі нос, чорныя задумлівыя вочы, невялікія вусы і бараду, што зьлёгку спускалася на грудзі.

Князь Мікалай Радзівіл Чорны стаў па правую руку ад вялікага князя і сказаў Яну:

– Распавядзі ўсё, што ведаеш.

Ян за час сойму амаль не ўспамінаў аб полацкіх падзеях. Ён падрыхтаваў даклад у першы дзень, як толькі атрымаў распараджэньне князя, але той дзень быў адзіным, калі ён думаў пра даклад. Далей яму было не да гэтага. Таму ён пачаў свой расповед не зусім выразна, але па меры таго, як ён казаў, падзеі нядаўняга мінулага адна за адной паўставалі ў яго перад вачыма, і працягваў ён усё больш упэўнена. Калі ён распавёў усё, што ведаў, паны-рада задалі яму з дзясятак пытаньняў, на якія ён з ахвотай адказаў.

У канцы Жыгімонт Аўгуст запытаў яго:

– Як тваё імя?

– Ян Заранковіч, Ваша каралеўская мосьць.

– Слаўны род. Дзякую за службу. Можаш ісьці.

Ян пакланіўся і выйшаў.

У той жа дзень яго паклікаў да сябе пан Хвароўскі.

– Князь дазваляе табе адправіцца ў адпачынак. У Нясьвіжы мусіш быць 15 чэрвеня. Ад гэтага часу ты вольны.

## 12

Перад тым як выправіцца дамоў, Заранковіч накіраваўся ў Ашмяны, дзе жыла сям'я Броніся.

У горадзе ён даведаўся, як праехаць да маёнтку Радынаў. Аказалася, ён стаяў за дзесяць вёрст ад Ашмянаў. Праехаўшы каля пяці вёрстаў, Ян дагнаў рыдван, у якім ехаў зямянін гадоў пяцідзесяці.

– Слава Ісусу Хрысту, – выгукнуў Заранковіч.

– На векі вечныя.

– Ці я траплю ў маёнтак пана Радыны гэтай дарогай?

– Так. Я менавіта туды кіруюся. Калі пан жадае, паедзем разам.

– З задавальненьнем. Ян Заранковіч, – адрэкамэндаваўся ён.

– Міхал Валошыч.

– Ня ведаеце, ці засьпею я пана Радыну дома?

– Засьпееш, пан, і яго самога, і ягоную сям'ю.

– Ці вялікая яна ў яго?

– Панства Радыны маюць трох дзяцей. Праўда, большага сына цяпер няма дома. Ён служыць у князя Радзівіла Чорнага.

– Большы? – перапытаўся Ян.

– Так.

Выходзіла, што Броніс успадкаваў маёнтак бацькі і ня меў скрайняй неабходнасьці ісьці на службу да князя, каб забясьпечыць сабе будучыню. А менавіта гэта прычына была галоўнай для большасьці зямянаў, якія выбіралі вайсковую кар'еру.

– Ці пан таксама служыць? – запытаў Валошыч.

Ян зьбянтэжыўся, ня ведаючы, што яму адказаць. Першым, каму ён зьбіраўся расказаць пра гібель Броніся, быў ягоны бацька. Адкрываць гэта каму-небудзь іншаму ён не хацеў. А распавёўшы зараз, што служыць князю Радзівілу, абавязкова пачуе пытаньне, ці ня мае ён зьвестак пра маладога пана Радыну. Падумаўшы, Заранковіч адмоўна паківаў галавой і сказаў, што зьбіраецца пайсьці на службу бліжэйшым часам.

– Я таксама хачу выправіць сваіх сыноў да харугвы, – сказаў пан Валошыч, – пара ім станавіцца сапраўднымі мужчынамі.

– Працы ў нас будзе шмат, – прамовіў Ян, – трэба адбіваць у маскавітаў Полацак.

– Так, але перад гэтым неабходна заключыць вунію з Польшчай. Сваіх сілаў на гэтую вайну ў нас ня хопіць.

Ян уважліва паглядзеў на пана Валошыча. Князь Радзівіл быў праціўнікам аб'яднаньня Літвы з Польшчай. Адпаведна, падобныя перакананьні былі

і ў яго людзей. Таму тых, хто патрабаваў вуніі, у Нясьвіжы не любілі.

– І што, вы думаеце, палякі будуць ваяваць замест нас? – спытаў ён.

– Калі будзем мець супольную дзяржаву, то, вядома, будуць. Разам з намі.

– А я думаю, што нам хопіць тых пагадненьняў з палякамі, якія ёсьць, навошта новая вунія? Ды і сваіх сілаў у нас дастаткова.

– Тады чаму капітуляваў Полацак?

– Таму што паспалітае рушэньне, якое павінна было сабрацца яшчэ ў сьнежні мінулага году, ня зьехалася нават у лютым, і гетман вымушаны быў ісьці на пяцідзесяцітысячнае маскоўскае войска, ня маючы нават чатырох тысячаў ваяроў. Калі б усе, каму трэба ісьці на вайну, выканалі б свой абавязак сумленна, мы бы прагналі маскавітаў.

–А ці сам пан паехаў у войска гетмана? – запытаў пан Валошыч.

Ян пачырванеў.

– Не. Акалічнасьці склаліся так, што я ня змог гэтага зрабіць.

Пэўны час яны ехалі моўчкі, зьбянтэжаныя гэтым невялікім разыходжаньнем у поглядах.

– А вы сусед пана Радыны? – спытаў Ян, каб перапыніць маўчаньне.

Валошыч усьміхнуўся.

– Не, я аканом ягонага маёнтку.

– Маёнтку? – зьдзівіўся Ян. – А як вялікі маёнтак мае пан Радына?

– Ня надта вялікі, але і не малы. Ён мае тры вёскі.

Ян ажно сьвіснуў ад нечаканасьці. У гусарскіх харугвах служылі, у асноўным, сыны з нябедных сем'яў, але, падобна, нават на агульным, далёка не гаротным узроўні сваіх таварышаў, Броніcь быў сапраўдным багацеем, і, да таго ж, галоўным нашчадкам свайго бацькі.

Валошыч, бачачы зьдзіўленьне Яна, паказаў рукой у кірунку дарогі.

– Ці пан бачыць лес наперадзе?

– Так.

– Там пачынаюцца маентнасьці Радынаў.

– Іх маёнтак?

– Не, да яго ехаць яшчэ добрых некалькі вёрстаў. Мы яшчэ падзівімся на лясныя абшары і палі, якія належаць ім, перш, чым убачым маёнтак.

Калі яны мінулі лес і наблізіліся да маёнтку, Ян з сумам падумаў аб тым, што вось так павінен быў вяртацца дадому Бронік пасьля годнай службы, дзеля таго, каб ажаніцца з прыгожай паннай і разам з бацькам кіраваць сваім вялізарным маяратам. А пасьля, з цягам часу, зрабіцца яго гаспадаром. Але ўсё выйшла па-іншаму, ня так, як магло бы быць.

Яны заехалі ў двор, мінулі некалькі гаспадарчых пабудоваў, і апынуліся каля панскага дому. Насустрач ім зараз жа выйшаў пахолак.

– Ці трэба паведаміць пану пра вас? – запытаў ён у Валошыча.

– Так.

– А пан? – зьвярнуўся ён да Яна.

– Паведамце, што пан Заранковіч, з пільнай справай, просіць яго прыняць.

Увайшоўшы ў дом, Валошыч накіраваўся да пакою, дзе яго чакаў гаспадар, Ян кіраваўся за ім. Янава прозьвішча, зразумела, нічога не сказала пану Радыну, таму Валошыча ён прыняў першым. Такая пасьлядоўнасьць адпавядала жаданьню Яна. Ён не хацеў, каб нехта чакаў аўдыенцыі ў пана Радыны пасьля той весткі, што ён прынёс.

Страх Заранковіча перад гэтай размовай увесь час нарастаў. Як тут перажывуць сьмерць старэйшага сына?

Ян чакаў каля гадзіны. Урэшце рэшт да яго падыйшоў пахолак і нягучна запытаў:

– Пан Радына прасіў пацікавіцца ў пана, ці магчыма, каб пан прыбыў заўтра. У яго зьявіліся неадкладныя клопаты, і ён ня можа прыняць вас.

– Прашу пераказаць пану Радыну, што ён сам будзе зацікаўлены як мага хутчэй выслухаць мяне.

Але гаспадар дому не дачакаўся вяртаньня пахолка. Дзьверы ягонага пакою расчынілася, і на парозе зьявіўся ён сам разам з Валошычам.

Ян узьняўся і пакланіўся айцу Броніся.

– Ну што? Ці прыйдзе пан да мяне заўтра? – нецярпліва спытаў ён у Заранковіча.

Гэта быў мужчына, які меў трохі больш за сорак гадоў, сярэдняга росту, з вайсковай выпраўкай. На правай шчацэ быў знаць шнар ад удару шаблі. У маладосьці, пэўна, ён ваяваў з татарамі і маскавітамі. У рысах твару Ян убачыў шмат падобнага да рысаў Бранілава. Толькі гэта быў твар чалавека, які

звык камандаваць. У Броніся падобнага выразу на твары не было. Ян нават думкі ніколі ня меў, што той задуменны юнак быў нашчадкам вялікага маярату і мог бы ня ісьці на вайсковую службу.

– Пан Радына, я думаю, пану неабходна выслухаць мяне менавіта зараз.

Выраз незадаволенасьці прамільгнуў на твары Бронісевага бацькі.

– Добра. Заходзьце. Міхал, – зьвярнуўся ён да Валошыча, – пачакай мяне тут.

Яны зайшлі ў пакой. Пан Радына запытальна зірнуў на Яна, жадаючы пачуць тлумачэньне ягонай настойлівасьці.

У Заранковіча мароз прайшоў па скуры. Калі ён пачаў гаварыць, то не пазнаў свайго голасу.

– Пан Радына, у мяне кепскія навіны... Ваш сын Браніслаў загінуў.

Ян чакаў пабачыць нейкія зьмены на твары ў пана Радыны, але той як глядзеў яму ў вочы, так і працягваў глядзець не міргаючы.

– У Полацку?

– Так, васпане.

Старэйшы Радына прысеў за стол, і толькі цяпер у выразе ягонага твару адбіваўся ўвесь той боль, які яму прынесла вестка пра сьмерць сына.

– Мне падавалася, я быў падрыхтаваны да гэтага, – прамовіў ён пасьля доўгае паўзы. – Я пасылаў у Нясьвіж грошы для Броніка, але выявілася, што ён быў накіраваны ў Полацак. А потым стала вядома пра захоп гораду маскавітамі.

Зноў запанавала ціша. Пан Радына сядзеў за ста-

лом, паклаўшы на яго абедзьве рукі і, як падалося Яну, хіліўся ўсё ніжэй, быццам пад цяжарам страшнага грузу. На Заранковіча ён не зьвяртаў увагі і быў цалкам засяроджаны на сваіх думках. Ягоны твар застыў у выразе страшэннай пакуты. Ён быццам пастарэў на вачах у Яна. Заранковіч усё больш палохаўся. Ён ужо меў намер распачаць размову пра што заўгодна, толькі б перавесьці думкі пана Радыны на іншае, але той сам узяў сябе ў рукі і паглядзеў на Заранковіча.

– Цябе выправіў да мяне ваш камандзір?

– Не. Браніслаў быў маім сябрам і загінуў на маіх вачах.

– Ты таксама быў там?

– Так.

– Як жа ты ўратаваўся?

– Мяне захапілі ў палон і гналі ў Масковію, але па дарозе маскавітаў заатакаваў аддзел віцебскага ваяводы. Ягоныя людзі мяне і вызвалілі.

– Для чаго вас накіравалі ў Полацак?

– Мы суправаджалі абоз з порахам для полацкай залогі.

– І што, не пасьпелі зьехаць адтуль?

– Пасьпелі б, але наш паручнік прыняў рашэньне застацца ў горадзе.

– Як яго імя?

– Пан Вітковіч.

– І што з ім стала?

– Загінуў ад рукі Івана Жахлівага.

Пан Радына зноў на доўгі час замоўк, а потым папрасіў Яна распавесьці, як загінуў ягоны сын.

– Дык ты прыбыў сюды ў прыватным парадку? – запытаў ён Заранковіча, калі той скончыў свой аповед.

– Так, пане.

– А як жа служба?

– Маю цяпер адпачынак і кіруюся дадому.

– Куды?

– Пад Ваўкавыск.

– Дык ты з Нясьвіжу паехаў спачатку сюды?

– Не. Я ехаў з Вільні, з вальнага сойму. Там я дакладаў пра падзеі ў Полацку вялікаму князю і сэнату.

– Дык ты дома яшчэ ня быў?

– Не.

– Калі зьбіраешся выехаць?

– Зараз жа.

– Зараз я табе не дазволю. Хутка надыдзе вечар, і табе цяжка будзе знайсьці добры начлег. Заначуеш тут і раніцой паедзеш.

– Шчыра дзякую вашмосьці.

– Ці ты каму-небудзь тут казаў пра гібель Браніслава?

– Не.

– Нікому не распавядай. Для маёй жонкі гэта будзе сапраўдны ўдар. У свой час я сам усё раскажу ёй.

Ноч Ян правёў дрэнна. Роля вястуна страшнай навіны далася яму нялёгка. Заснуць адразу не ўдалося. Нахлынулі ўспаміны пра Полацак, аб пакутах тысячаў людзей і гібелі яго таварышаў. Сум, быццам цяжкі камень, лёг на душу. Потым ён падумаў пра Марыю. І пачуцьцё, якое нарадзі-

лася ў яго да гэтай дзяўчыны, зноў пачало разьдзіраць сэрца, то выклікаючы надзею на ўзаемнасьць, то творачы страх таго, што надзеі няма і ня будзе. Ён узгадваў кожны позірк, кожнае прамоўленае слова, спрабуючы зразумець, ці лепш будзе сказаць, адгадаць, што за імі стаяла. Праўда, у тую ноч ніякай высновы ён так і не зрабіў.

Ледзьве пачало віднець, як Ян саскочыў з ложка. Ён памаліўся і прачытаў некалькі разьдзелаў Бібліі. Пасьля малітвы ягоны настрой палепшыўся. Хутка ён будзе дома, пабачыць бацькоў, брата і сёстраў. Пазьней, пасьля адпачынку, ён вернецца ў Нясьвіж і адкрые свае пачуцьці Марыі. А потым будзе вайна, і яны выб'юць маскавітаў з роднай зямлі.

Ян выехаў з двара, калі толькі нешматлікія пахолкі марудна рыхтаваліся да працоўнага дня. Ён накіраваўся на паўднёвы захад. Мільгалі лясы, палі, вёскі і фальваркі. Ён набліжаўся да дому.

Апынуўшыся ў родных мясьцінах, малады жаўнер адчуў, што нейкае дзіўнае пачуцьцё завалодала ім. Незвычайна было пасьля доўгай адсутнасьці зноў ехаць па дарозе, па якой езьдзіў бясконцую колькасьць разоў, бачыць лес, дзе прабавіў шмат часу, і піць паветра, якім дыхаў змалку. Знаёмыя мясьціны былі тымі ж, але ўсё ж трошкі зьмяніліся і адрозьніваліся ад таго вобразу, што застаўся ў памяці пры растаньні з імі.

Непадалёк ад іхняга маёнтку знаходзілася невялікая сажалка. Яшчэ здалёку Ян убачыў каля яе дзьвюх паненак. Пад'ехаўшы бліжэй, ён пазнаў сваіх сёстраў – Ганну і Аршулю. Яны так-

сама заўважылі яго, але сонца сьвяціла проста ў іхныя вочы, і дзяўчаты доўга разглядалі вершніка, які набліжаўся да іх. Нарэшце іх бровы ўзьняліся на лоб ад зьдзіўленьня, яны абедзьве моцна закрычалі і кінуліся да Яна. Малады рыцар саскочыў з каня і абняў сёстраў.

– Янік, ты жывы! Слава Госпаду!

– Ці дома ўсё ў парадку? – запытаў ён. – Як бацькі?

– Усё добра, толькі пра цябе непакоіліся.

І тут Ян успомніў, што калі ён у складзе аршаку пана Вітковіча накіроўваўся ў Полацак, то сустрэў бацьку і старэйшага брата ў Менску, куды тыя зьявіліся на збор паспалітага рушэньня. Таму дома ведалі пра падарожжа Яна ў сталіцу крывічоў.

Меньшая Аршуля хуценька пабегла дамоў папярэдзіць бацькоў, а Ян з Ганнай павольна рухаліся за ёй. Ян заўважыў на безыменным пальцы сястры пярсьцёнак.

– Ну і хто будзе тваім мужам?

– Пан Роквіч з Рудзевічаў.

– Вы, я бачу, часу не марнавалі. Можа, яшчэ нехта замуж выходзіць?

– Не, пакуль я адна.

– А Станіслаў ня будзе жаніцца?

– Пакуль не.

– Ці бацькі моцна непакоіліся?

– Так, вельмі моцна. Тата са Станіславам нават езьдзілі ў Нясьвіж, каб даведацца, ці не вярнуўся ты з Полацку.

Яны зайшлі ў двор. Тата, маці, брат Станіслаў і

сёстры Аршуля, Зося і Кацярына сустракалі іх перад домам. Ян кінуўся да іх. Перад бацькам ён укленчыў і пацалаваў яму руку. Усе тут жа сталі абдымаць і цалаваць Яна. Бацька падняў яго з каленяў, узяў за плечы і некалькі імгненьняў глядзеў яму ў твар. Усе замоўклі і ў цішыні назіралі за імі.

– Бачу, што табе шмат давялося перажыць, – прамовіў бацька. –Маю толькі адно пытаньне: ці ты з гонарам вытрымаў усе выпрабаваньні?

– Так. Я нічым ня зганьбіў нашага імя.

Бацька пацалаваў Яна ў лоб. Астатнія ўспрынялі гэта як сыгнал зноў на яго накінуцца з абдымкамі і пацалункамі.

Таго вечару ў Заранковічаў было баляваньне. Да блізкіх і далёкіх суседзяў выправілі пахолкаў з запрашэньнем разьдзяліць радасьць прыезду Яна. Хутка госьці сталі сьцягвацца да іх маёнтку. Усім не цярпелася даведацца пра тое, што адбывалася ў Полацку, асабліва з вуснаў Яна, якога многія ведалі з дзяцінства. Старэйшы Заранковіч прымаў гасьцей. Ён ганарыўся сынам і не перад кім не хаваў гэтага.

Калі ўсе сабраліся, Ян чарговым разам павёў сваё апавяданьне. Гэтыя слухачы былі самымі эмацыйнымі з усіх, каму Заранковіч распавядаў аб падзеях у Полацку. Яго пастаянна перапынялі камэнтарамі, воклічамі і моцнымі ды працяглымі абмеркаваньнямі. Старыя зямяне пачыналі вучыць моладзь расповядамі пра свае былыя подзьвігі, авалодвалі агульнай увагай, і бацька Яна ўвесь час вымушаны быў вяртаць размову ў першапачатковае рэчышча.

Да гэтага часу тую частку расповяду, якая датычылася Марыі, Ян заўсёды праходзіў адносна нэўтральна і лічыў, што ніякім чынам не адкрываў слухачам сваіх пачуцьцяў да яе. Але гэтым разам перад людзьмі, многія з якіх добра ведалі яго, пры ўзгадваньні пра Марыю ён чамусьці засаромеўся і, да свайго жаху, адчуў, што пачынае чырванець. Усе размовы як абарвала. У вачах слухачоў зьявілася цікаўнасьць, значна большая за тую, якая была падчас расповеду пра баталіі. Сёстры Яна захіхікалі і пачалі шаптацца між сабою. Ян гатовы быў праваліцца скрозь зямлю.

Сытуацыю ўратаваў бацька. Ён моцна прыкрыкнуў на дачок і загадаў Яну працягваць. Але той, зьбянтэжаны сваёй асечкай, быў ужо не такі красамоўны, як раней. Тым больш, што цяпер ён апынуўся пад цікаўна-запытальнымі поглядамі слухачоў.

Толькі адзін раз людзі шумна адрэагавалі на ягоныя словы, калі пачулі, што Заранковіч рабіў даклад аб падзеях у Полацку вялікаму князю і панам-радзе. Суседзяў гэта ўразіла. А бацька ўвогуле зьзяў ад гонару за сына.

Спаць леглі позьняй ноччу. Ян, як гэта і было да ад'езду ў Нясьвіж, спаў у адным пакоі са Станіславам. Ён яшчэ доўга расказваў брату аб сваёй службе. А потым раптоўна запытаў у Станіслава:

– Цікава, ці здагадаліся людзі, у чым справа, калі я абсекся і зьбянтэжыўся?

– Ты пра панну Мяжэвіч?

– Так.

– Здагадаліся.

– Жахліва. Чуткам ня будзе канца.

– Няма бяды. А яна прыгожая?

– Самая прыгожая.

– Ці бацька дасьць дабраславеньне?

– Так. Ня думаю, што для гэтага ёсьць перашкоды. Ані высакароднасьцю, ані багацьцем Мяжэвічы нам не саступаюць.

– Тады парадак.

– Ну ты малайчына! Лёгка сказаць – парадак! Я нават ня ведаю, як яна да мяне ставіцца.

– Не адкрываўся ёй?

– Не.

– Чаму?

– У дарозе не было магчымасьці. Я зьбіраўся паразмаўляць з ёй у Нясьвіжы, але мне далі толькі пераначаваць і адразу накіравалі ў Вільню.

– Нічога. Паразмаўляеш з ёй пасьля вяртаньня з адпачынку.

– Менавіта так я і зьбіраюся зрабіць.

– Я табе па-добраму зайздрошчу. Вярнуўся з вайны героем, выратаваў прыгожую панну, рабіў даклад вялікаму князю. Няблага для пачатку.

Ян уздыхнуў.

– Сустрэчу з прыгожай паннай я табе не абяцаю, а вось вайны хутка будзе шмат. І вялікага князя, напэўна, пабачыш падчас збору паспалітага рушэньня.

## 13

Паплылі дні адпачынку. Жыцьцё ў доме бацькоў ішло нясьпешнай чарадой, і толькі слабыя адгалоскі бураў, якія віравалі вакол, даходзілі да яго.

У нядзелю Заранковічы пайшлі ў збор на служэньне. Жанчыны занялі месцы ў рыдване, а бацька, Станіслаў і Ян ехалі конна побач. Да збору трэба было ехаць каля пяці вёрстаў. Усю дарогу да царквы Заранковічы звычайна пелі псальмы. Пачынала сьпяваць Кацярына, якая мела прыгожы голас. Цяпер таксама, пасьля таго, як яны выехалі з маёнтку, Кацярына засьпявала псальм, а астатнія далучыліся да яе. Ян, як толькі прагучалі першыя радкі песьні, выехаў трошкі наперад і адвярнуў галаву ад усіх, каб ніхто не заўважыў сьлёзаў у яго на вачах.

Як жа ён сумаваў за ўсім гэтым, калі пабіты і зьмерзлы ляжаў у хляве, куды яго кінулі людзі Сямёнава! Ён гатовы быў саскочыць з каня, кінуцца да сваіх родных, сказаць, наколькі яны яму дарагія, наколькі яму не хапала іхняй любові, калі яго не было дома! І яшчэ аб нечым падумаў Ян – аб тым, што ваенная пагроза, якая падымалася з усходу, можа дайсьці і да гэтых месцаў. І тады самае каштоўнае, што ёсьць у ягоным жыцьці, закруціцца ў крывавым вадавароце вайны. І калі Ян аб гэтым думаў, ён па-сапраўднаму спалохаўся.

Ваколіцу ўжо абляцела вестка аб тым, што меньшы сын пана Заранковіча вярнуўся жывы з Полацку. Як толькі сямейства Яна пад'ехала да збо-

ру, ён апынуўся ў цэнтры ўвагі. Яго пачціва віталі, а тыя, хто ня быў у іх дома ў дзень прыезду, спрабавалі даведацца падрабязнасьці аблогі Полацка. Такая ўвага пачала ўжо абцяжарваць Яна, і ён з цяжкасьцю дачакаўся пачатку служэньня. Але і пасьля заканчэньня малітоўнага збору да яго працягвалі падыходзіць людзі, пачыналі размовы, запрашалі ў госьці. Бацька, відаць, зразумеў настрой сына, таму ветліва адмовіў усім, сабраў сям'ю і накіраваў яе дадому.

Праз тыдзень Ян паехаў у Берасьцейскі павет пад Кобрын. Там жыла сям'я Андрэя. Зноў яго чакала цяжкая місія носьбіта страшнай весткі.

Разам з бацькамі Тура жылі два браты і сястра Андрэя. З плачам даведаліся яны пра сьмерць, якая прыйшла ў іх дом. Яну было невыносна глядзець на іх бедаваньне. Прабыўшы ў Тураў тры дні, ён вярнуўся дадому.

Апошняя частка адпачынку праляцела хутка. Трэба было вяртацца ў Нясьвіж. Што хаваць, не асабліва Ян радаваўся атрыманаму адпачынку, бо прагнуў хутчэй паразмаўляць з Марыяй, але ўсё ж з цяжкім сэрцам пакідаў бацькоўскі дом. У атачэньні родных людзей яму ўдалося амаль забыцца пра жах, перажыты на вайне. Дома ён па-сапраўднаму адпачыў. Але трэба было ехаць.

Ян цёпла разьвітаўся з маці і сёстрамі. З бацькам і Станіславам асабліва не разьвітваўся: у хуткім часе яны павінны былі сустрэцца ў Крэве ў войску гетмана. Ян прыбудзе на збор у складзе почта кня-

зя Радзівіла, а бацька з братам – у складзе павятовай харугвы.

У дарозе ўсе думкі Яна былі пра спатканьне з Марыяй. Два месяцы ён з нецярплівасьцю чакаў гэтага моманту, рыхтаваўся да важнай размовы, а зараз, чым бліжэй ён пад'яжджаў да Нясьвіжа, тым мацней яго ахапляла хваляваньне. Як сустрэне яго Марыя? Ці ўспамінала яна пра яго? Ці сярод бліскучых кавалераў нясьвіскага двару забылася пра яго? Можа, пакахала каго іншага?

Ян не разьлічыў час на дарогу, таму прыбыў у Нясьвіж увечары, незадоўга да закрыцьця ўезнай брамы. Жаўнеры, якія несьлі службу ў галоўнай вежы, не хацелі ўпускаць яго. Давялося выклікаць камандзіра варты, толькі ён дазволіў Заранковічу праехаць у замак. Ян даклаў аб прыезьдзе харунжаму пану Макоўскаму і накіраваўся да сваёй харугвы. Першым, каго ён пабачыў, быў Махвіч. Абодва былі радыя сустрэчы.

Ян даведаўся ад Пятра апошнія навіны і спытаў:

– А панну Мяжэвіч ты часта бачыў?

– Каго?

– Панну, якая прыехала разам са мной і сваім братам з Віцебску.

– Так, я памятаю іх. Але, ведаеш, мне здаецца, што зараз іх няма ў замку.

– Як гэта няма?

– Апошнім часам я іх не сустракаў.

– А дзе яны дзеліся?

– Ня ведаю.

Гэта вестка занепакоіла Яна. Ён нават не ўяўляў

сабе, куды маглі зьехаць Марыя і Мікалай. Але было ўжо позна высьвятляць гэта, таму малады жаўнер пайшоў спаць.

Наступнай раніцы ён пацікавіўся ў пана Макоўскага, ці ня ведае ён месцазнаходжаньня Мяжэвічаў. Харунжы ня ведаў, але паабяцаў даведацца ў пана Гурэвіча. У той жа дзень ён выклікаў Заранковіча да сябе.

– Яны паехалі ў Барысаў, – сказаў пан Макоўскі. – Прыбыў пахолак з лістом ад іх маці, у якім яна прасіла іх прыехаць туды дзеля сустрэчы з ёю.

– Нешта здарылася?

– Наколькі зразумеў пан Гурэвіч, не. Проста маці захацела сустрэцца з дзецьмі.

Што ж, Яну трэба было чакаць, пакуль Марыя і Мікалай вернуцца з Барысава. Пані Мяжэвіч, хутчэй за ўсё, хацела даведацца, як дзеці ўладкаваліся ў Нясьвіжы. Верагодна, што дамоўленасьць пра падобную сустрэчу існавала яшчэ да выезду з Віцебску.

Да збору ліцьвінскага войска ў Крэве заставалася зусім мала часу. Паручнікі і харунжыя інтэнсіўна рыхтавалі ваяроў князя Радзівіла да будучых баявых дзеяў. Заняткі праходзілі з раніцы да вечару. Ян ужо паўгады ня меў так шмат цьвічэньняў, і яму з цяжкасьцю ўдавалася не адставаць ад сваіх таварышаў, для якіх падобныя заняткі былі больш звыклыя. Тым больш, што на яго цяпер глядзелі як на дасьведчанага ваяра і чакалі нечага выдатнага.

Пад наглядам камандзіраў рыцары раз за разам сыходзіліся ў вучэбных баях, што імітавалі розныя сытуацыі падчас сапраўдных бітваў. Больш за ўсё

ўвагі надавалася франтальным атакам – галоўнаму прызначэньню цяжкой кавалерыі. Аддзелы дзяліліся на два шыхты, якія ў адкрытым полі, выцягнуўшыся ў доўгія лініі, атакавалі адзін аднаго. Нягледзячы на тое, што ваяры выкарыстоўвалі драўляныя шасты замест дзідаў, сутыкненьні пры такіх атаках былі вельмі небясьпечныя. Некаторым жаўнерам ламалі косьці, разьбівалі галовы, нявечылі коней. Але падчас такіх баёў ваяры набывалі навыкі, якія былі патрэбныя, каб захаваць жыцьцё і прынесьці перамогу ў сапраўдных сечах. Таму ўсе трывалі і з гатовасьцю працягвалі заняткі. Таксама харунжыя вучылі жаўнераў шыхтавым манэўрам: каб шыхт на вялікай хуткасьці мог паварочваць і разварочвацца, і пры гэтым захоўваць парадак, не распадацца на кавалкі. Калі атрымлівалася зрабіць манэўр узгоднена, то з боку гэта выглядала вельмі прыгожа. Але зноўтакі не ў прыгажосьці была справа, а ў тым, што такая ўзгодненасьць у дзеях была пытаньнем жыцьця ці смерці, перамогі ці паразы.

Неўзабаве харугвы князя Радзівіла накіраваліся ў Крэва. Праўда, загадзя было вядома, што баявых дзеяў у бліжэйшым часе ня будзе: мірныя перамовы з Масковіяй усё яшчэ працягваліся.

Ля муроў замку, у якім забілі вялікага князя Кейстута, адкуль уцёк малады Вітаўт і дзе была падпісана першая вунія з Польшчай, гетман Мікалай Радзівіл Руды правёў агляд войска і адпусьціў жаўнераў. Ян сустрэўся з бацькам і Станіславам, пасьля чаго вярнуўся ў Нясьвіж з надзеяй пабачыць там Мяжэвічаў. Але іх па-ранейшаму не было. Гэта

ўжо пачало турбаваць Заранковіча. Што можна было рабіць у Барысаве так доўга?

Тым часам, 4 верасьня 1563 году, на захадзе Княства, у Берасьцейскай друкарні князя Радзівіла Чорнага была надрукавана поўная Біблія. За гэта выданьне князь заплаціў 10 тысячаў дукатаў – гадавы даход з усіх сваіх земляў. У Берасьце разам з князем прыехала большая частка Нясьвіскага двару. Ян таксама ўваходзіў у лік жаўнераў, якія суправаджалі Чорнага, і прысутнічаў пры выхадзе першых асобнікаў Бібліі з друкарскага варштату. Калі адзін з майстроў падаў князю толькі што надрукаваную кнігу, той прамовіў:

– З гэтага часу яшчэ больш жыхароў Княства і Кароны змогуць чытаць жывое і дзейснае Слова Божае і расьці ў хрысьціянскай веры.

Калі Ян другі раз вярнуўся ў Нясьвіж, яму паведамілі, што яго чакае Мікалай Мяжэвіч. Заранковіч радасна забег у пакой і аслупянеў. Мікалай выглядаў проста жахліва. Бледны твар зьмізарнеў, у вачах – адчай.

– Што здарылася? Дзе Марыя?

– Яе скралі.

– Скралі? Хто?

– Рольскі.

Ян вушам сваім не паверыў.

– Рольскі? Адкуль ён узяўся? Што яму трэба?

– Тыя паперы, якія ён страціў, калі біўся з табой.

– Нічога не разумею.

– З Віцебску прыбыў наш пахолак з лістом ад маці. Яна нібыта прасіла нас прыехаць у Барысаў. Па-

холка гэтага мы ведалі, на лісьце была пячатка маці. Ня маючы падставаў ня верыць яму, мы паехалі. Але непадалёк ад Барысава на нас напаў Рольскі са сваімі людзьмі. Марыю ён захапіў, а мяне пакінуў жывым, каб я пераказаў табе яго патрабаваньні. Ён чакае цябе праз два тыдні. Сказаў, каб ты прыехаў адзін, а то ён заб'е Марыю.

– Чакай, дык адкуль ён меў ліст вашай маці?

– Ліст быў фальшывы, пячатка выкрадзеная.

– А пахолак?

– Падкуплены. Я думаю, Рольскі падбіў яго яшчэ ў Віцебску, той выкраў пячатку, уцёк з дому і далучыўся да ягонай хеўры.

– Рольскі ведаў, адкуль вы?

– Так. Ён ведаў нашае прозьвішча і адкуль мы. Ён распытваў пра гэта Марыю, калі захапіў нас у першы раз.

– Дык яму патрэбныя тыя паперы?

– Так. Дзе яны?

– У пана Гурэвіча. Хадзем да яго.

Хутка яны былі ў паручніка. Той быў узрушаны расповедам Мікалая яшчэ больш, чым Заранковіч.

– Тут і князю крыўда ўчынена, – сказаў пан Гурэвіч. – Бо напалі на людзей, якія пад яго апекай знаходзяцца. Ён абавязкова павінны пра гэта ведаць.

Утрох яны пайшлі да князя.

– Першы раз сустракаюся з такім прыкладам людзкой подласьці, – прамовіў князь, выслухаўшы іх. – І што ты маеш намер рабіць? –запытаў ён у Заранковіча.

– Буду прасіць, мосьці княжа, дазволіць мне паехаць на сустрэчу з Рольскім.

– Дазваляю. Калі трэба, дам табе людзей.

– Дзякую, але думаю, што ня варта. Рольскі папярэдзіў, каб я быў адзін. Марыя можа пацярпець.

– Тады едзь адзін. Дзе ён цябе чакае?

– На мяжы Полацкага павету, – адказаў Мікалай.

– Хай Госпад дапаможа табе ў гэтай няпростай справе.

У вызначаны дзень Ян выправіўся на сустрэчу з Рольскім. За Барысавам ён узяў на поўнач. Паводле разуменьня Мікалая, Рольскі чакаў яго ў карчме на тэрыторыі, якая пасьля захопу Полацку Іванам Жахлівым невядома каму належала. Там можна было сустрэць і ліцьвінскія, і маскоўскія войскі, а з яшчэ большай верагоднасьцю – тых, каму вельмі падабалася адсутнасьць любой улады.

Ян знайшоў гэтую карчму, якая стаяла на краі лесу на перакрыжаваньні двух дарог, і зайшоў усярэдзіну.

Нягледзячы на тое, што размяшчалася яна ў пустынным месцы, людзей у карчме было шмат. Але ўсе яны былі вельмі падобныя на разбойнікаў, што сабраліся тут у перапынку паміж рознымі цёмнымі справамі. На Яна, які сваёй вопраткай і выглядам вельмі вылучаўся сярод астатніх наведнікаў, утаропіліся з дзясятак параў зьдзіўленых вачэй, а крыклівыя размовы спыніліся. Ян агледзеў памяшканьне. Рольскага ў ім не было. Тады пасярод злавеснай цішыні і пад позіркам бадай усіх, хто быў у карчме, ён

знайшоў сабе вольнае месца і са спакойным выглядам сеў за стол. Карчмар прыкінуўся, што не заўважыў новага чалавека і пазіраў у іншы бок.

Ян пачаў чакаць. Сярод гэтых галаварэзаў напэўна ж ёсьць людзі Рольскага. Ён не сумняваўся, што хутка ўбачыць свайго ворага.

Размовы паступова аднавіліся, і на Заранковіча больш ніхто не глядзеў. Узьнікла ўражаньне, што ўсе пагадзіліся і зьмірыліся з ягонай прысутнасьцю ў гэтым дзіўным месцы. Ён нават пачаў сумнявацца, ці добра ён зразумеў Мікалая. І калі трывога ўсё больш напружвала нэрвы Яна, да яго падыйшоў невысокі жаўнер.

– З вамі хоча паразмаўляць адзін пан, – прамовіў ён, нагнуўшыся амаль да самага твару Заранковіча.

Ян з гатовасьцю падняўся з лавы.

– Дзе?

– На двары. Хадземце за мной.

Яны выйшлі на двор.

– Дзе Рольскі? – запытаў Ян.

– Хто?

– Рольскі.

– Ня ведаю я ніякага Рольскага, – адказаў ягоны суразмоўца, злосна ашчэрыўшы зубы, – але ведаю, што ты маеш грошы, якімі давядзецца падзяліцца са мной.

Ён працягнуў руку да поясу Яна, дзе вісеў мяшэчак з манэтамі, але, атрымаўшы імгненны ўдар кулаком у твар, пакаціўся па зямлі. І тут жа яшчэ некалькі чалавек зьявіліся побач з імі. Заранковіч выхапіў шаблю і зрабіў некалькі крокаў на-

зад да карчомнай сьцяны. Два разбойнікі наблізіліся да яго з шаблямі, але хутка адправіліся сьледам за сваім таварышам на зямлю. Праціўнікі Яна зразумелі, што перад імі добры ваяр і, абступіўшы яго, не рашаліся атакаваць. Толькі калі новыя людзі выбеглі з карчмы, яны пайшлі на Заранковіча. Ян як мог адбіваў удары, якія сыпаліся на яго з трох бакоў. Нават атакаваў, і тады разбойнікі разьбягаліся, але потым усё роўна вярталіся да яго. Бо ведалі, што доўга іх праціўнік так біцца ня здолее. І Ян ведаў гэта таксама, і ўжо адчуў, што ўсё больш стамляецца.

Бадай усе наведнікі карчмы выйшлі на двор назіраць за бойкай. Але на дапамогу кагосьці з іх Яну разьлічваць не даводзілася. Нават для тых, хто ня быў замешаны ў гэтым гвалце, ён быў чужаком, і іх сымпатыі належалі яго праціўнікам. А тыя станавіліся ўсё больш задзірыстымі па меры таго, як Заранковіч губляў сілы і не пасьпяваў за іх шаблямі. Усе бачылі, што яшчэ крышачку – і бойка скончыцца. Але раптам ззаду ў людзей, што атачылі Яна, зьявіўся рыцар на кані. Ён павольна набліжаўся да карчмы, але, калі ўбачыў, што там адбываецца, выхапіў шаблю, прышпорыў дрыкганта і паскакаў наперад. Ён урэзаўся ў праціўнікаў Заранковіча і пачаў секчы іх шабляй. Тыя з жахам кінуліся хто куды, але ўратаваліся толькі тыя, хто забег у карчму. Астатніх рыцар усіх пасек, нават тых, за якімі яму давялося кінуцца наўздагон. Калі на двары нікога не засталося, акрамя яго і Заранковіча, рыцар наблізіўся да Яна і зьлез з каня.

Гэта быў пан Андрэй Рольскі.

– Пан Заранковіч, даю слова, што да гэтых абадранцаў я ня маю ніякага дачыненьня. Прабачце, што так атрымалася. Мне было б вельмі шкада, калі б яны вас забілі, – ён усьміхнуўся.

– Дзе панна Мяжэвіч? – цяжка дыхаючы, запытаў Ян.

– Ці пан прывёз тое, што я прасіў?

– Так.

– Тады паедзем да яе.

– Так, едзем.

– Ці не жадаеце наведаць карчму?

– Навошта?

– Там яшчэ засталіся тыя, хто на вас напаў.

– Не, ня трэба.

– А я б наведаў.

Яны селі на коней і паскакалі ў той бок, адкуль зьявіўся Рольскі. Хутка яны прыбылі ў самотнае месца. Калісьці тут, відаць, быў маёнтак, але зараз пасярод разбураных будынкаў расла высокая трава. Калі вершнікі заехалі за агароджу, з будыніны выйшла Марыя ў суправаджэньні нейкага селяніна. Рукі ў яе былі не зьвязаныя, ішла яна спакойным упэўненым крокам. Селянін крочыў за ёй.

– З табой усё ў парадку? – спытаў Ян.

– Так.

Рольскі хітануў галавой у бок селяніна, і той моўчкі накіраваўся ў бок карчмы.

– Цяпер мы тут утраіх, – прамовіў Рольскі. – Рады прыняць вас у адным з маіх былых маёнткаў. Яго ў мяне некалі сканфіскавалі, і я яго спаліў.

Ян працягнуў яму паперы.

– Ці мы можам ехаць?

Рольскі ўсьміхнуўся і паклаў руку на шаблю.

– Не. У нас з табой засталася справа, якую абавязкова трэба скончыць. Два разы табе моцна пашанцавала. Паглядзім, што будзе зараз.

– А панна Мяжэвіч?

– Тут больш нікога няма. Калі ў нашым двубоі пераможаш ты, разам з паннай будзеце вольныя. Калі перамагу я, то за некаторую суму я вярну яе маці. Ці князь Радзівіл заплаціць болей?

Ян нічога не адказаў, але абяцаньне Рольскага, што той не зьбіраецца рабіць Марыі зла, трохі супакоіла яго.

– Я прапаную табе дзьве гадзіны адпачынку, – працягваў Рольскі, – ты толькі што цяжка біўся і, пэўна, змарыўся.

– Ня трэба. Будзем біцца зараз.

– Ты настолькі ўпэўнены ў сваіх сілах?

– Я ўпэўнены, што на маім баку Госпад Бог.

Апошнія словы Ян прамовіў з такой верай, што па целе Рольскага прайшлі лёгкія дрыжыкі. Каб схаваць гэта, ён патрос галавой і дастаў шаблю.

– Ну, паказвай, на што ты здольны.

– Хай дапаможа табе Госпад, Ян, – прамовіла Марыя.

Натхнёны гэтымі словамі, малады рыцар пайшоў на Рольскага. І так хутка ён стаў наносіць моцныя ўдары, што праціўнік у зьдзіўленьні адступаў назад і з цяжкасьцю абараняўся. Калі разбойнік паспрабаваў перахапіць ініцыятыву і перайсьці ў ата-

ку, Заранковіч не адыйшоў ні на крок, адбіў ягоныя ўдары і працягнуў насядаць на ворага.

Ніколі яшчэ Ян не змагаўся так добра, як зараз. Сапраўды, ён верыў, што Госпад не пакіне яго. Таму бяз стомы ішоў адважна наперад.

А Рольскі, наадварот, з першых хвілінаў бою зразумеў, што сёньня не ягоны дзень. Да таго ж, у галаве яго круцілася адна думка, ад якой ён старанна хацеў уцячы, але гэта яму не ўдавалася. Думка была аб тым, што гэты юнак сапраўды пасланы на ягоны шлях Усявышнім, каб пакараць яго за ўсё ўчыненае зло. Як і ў любога злачынцы, недзе ў самых глыбінях сэрца Рольскага ўтойвалася дбайна прыхаванае разуменьне таго, што, рана ці позна, надыдзе хвіліна адплаты. І ўсё ў ягоных стасунках з Заранковічам сьведчыла, што хвіліна гэта набліжаецца. Падчас першага бою Рольскі быў нашмат мацнейшы, але “выпадак” дапамог Заранковічу перамагчы. Другі бой – сілы праціўнікаў былі прыблізна роўныя, але Рольскі ўсё ж ішоў да перамогі, і зноў, дзякуючы таму самаму “выпадку”, Заранковіч ўратаваўся. І вось зараз, падчас трэцяга іх паядынку, перавага была ўжо не на баку Рольскага. Як быццам Найвышэйшая сіла ўмешвалася ў гэтыя падзеі. Як быццам з кожным разам сілы Рольскага зьмяншаліся, а сілы Заранковіча прыбывалі.

Але здавацца Рольскі не зьбіраўся. Як дасьведчаны ваяр, ён пачаў зьбіваць тэмп бою і зацягваць праціўніка ў доўгую цяжкую барацьбу, каб пазбавіць яго натхненьня, з якім той пачаў двубой. Да таго ж, ён ведаў, што Заранковіч, які толькі што біўся

ля карчмы, хутка павінен выдыхнуцца. Час быў на баку Рольскага.

Ян зразумеў, да якой тактыкі перайшоў праціўнік, і бачыў, што гэта прыносіць свой плён. Ён ужо ня меў той перавагі, якая была на пачатку бою, але што рабіць у гэтай сытуацыі, Заранковіч ня ведаў. Ён спрабаваў разарваць глухую абарону Рольскага, але той трымаўся моцна і не даваў яму шанца.

Ян ня памятаў, як доўга яны так секліся. Яму здалося, што бясконца, бо сілаў амаль не засталося. Рольскі канчаткова выматаў яго. Практыка паказвала, што бой дасягнуў крытычнага моманту.

І раптам Рольскі выбухнуў. Ён настолькі моцна пайшоў у атаку, што цяпер ужо Ян хутка адступаў назад. Ужо Рольскі быў гаспадаром становішча. Ён нанес мноства ўдараў, адным з якіх зьлёгку параніў Заранковіча, і на кашулі Яна зьявілася кроў.

– Гэта ўсё, – прамовіў Рольскі, працягваючы наступаць.

Ян, як мог, адбіваўся, але сілаў болей не было. Ён бачыў, што гэта сапраўды ўсё. Вось-вось Рольскі нанясе ўдар, які ён ня здолее адбіць.

Раптам ягоны погляд, пастаянна прывязаны да Рольскага, на імгненьне выхапіў за сьпіной праціўніка Марыю, якая з пашыранымі ад жаху вачыма назірала за боем. Яна стаяла, нахіліўшыся наперад, так, як быццам працягвала Яну рукі дапамогі, і ўся яе постава сьведчыла пра той неймаверны боль, які яна ў той момант цярпела.

І нечакана пакуты каханага чалавека выклікалі ў Яна такую рашучасьць біцца да канца, што ў яго

зьявіліся дадатковыя сілы. Ён з такой моцай адбіў чарговы ўдар Рольскага, што рука праціўніка, у якой была шабля, пайшла далёка ў бок. Наступным ударам Ян на імгненьне апярэдзіў Рольскага, і яго шабля трапіла ў шыю разбойніка – акурат у тое месца, куды кат б'е сваю ахвяру.

Рольскі як падкошаны рухнуў на зямлю.

Ян, яшчэ нават не асэнсаваўшы, што ён перамог, – настолькі хутка ўсё адбылося – замёр на месцы, ад стомленасьці ледзь трымаючыся на нагах.

Марыя падбегла да яго, абняла, прыпала да яго-нага пляча.

– Я так баялася за цябе.

– Я ведаю. Усё скончылася.

Яны паглядзелі адно аднаму ў вочы і, хоць не было паміж імі нічога сказана пра пачуцьці, яны ўсё ведалі бяз словаў.

Заранковіч пахаваў Рольскага, і яны выправіліся ў дарогу. Больш прыгодаў на шляху рыцар і панна не сустрэлі і хутка з трыюмфам уехалі ў Нясьвіж. Калі яны зьявіліся ля ўезнай брамы, вестка пра іх вяртаньне хутка абляцела замак, і ўсе, хто знаходзіўся ў гэты момант на тэрыторыі радзівілаўскай рэзыдэнцыі, выйшлі іх прывітаць. Шмат было сказана аб мужнасьці Яна і прыгожасьці Марыі. Такой пары Нясьвіж ня бачыў даўно.

## 14

Восень і пачатак зімы ў Нясьвіжы прайшлі аднosна спакойна. Князь Радзівіл яшчэ да вяртаньня Яна і Марыі зьехаў у Варшаву на супольны польска-ліцьвінскі сойм. На ўсходзе ўсё яшчэ працягваліся перамовы з маскавітамі, і чуткі аб вайне пакуль не прыходзілі. Заранковіч увесь вольны ад службы час бавіў з Марыяй. Яны сустракаліся кожны дзень, і такое складалася ўражаньне, што тэмы для доўгіх размоваў у іх ніколі ня скончацца. Ім было вельмі хораша разам, яны цешыліся сваім шчасьцем, але пра каханьне пакуль не было сказана ніводнага слова. Ян Заранковіч, гэты храбры пераможца пана Рольскага, ніяк ня мог набрацца сьмеласьці адкрыць Марыі свае пачуцьці.

Аднойчы, адразу пасьля Сьвята Божага Нараджэньня, у замак прыляцеў вястун з навіной, якой чакалі, да якой рыхтаваліся, і якая, тым ня меньш, шмат у каго выклікала трымценьне. Перамовы з Масквой сышлі на нішто. Будзе вайна. Вялікі князь абвяшчае збор ліцьвінскага войска.

У замку князя Радзівіла пачалі хутка рыхтавацца да ўсходняй выправы.

Праз некалькі дзён прыбыў наступны вястун з навіной, яшчэ больш трывожнай. Іван Жахлівы фактычна па сьлядах ліцьвінскіх паслоў, якія выяжджалі з Масковіі, накіраваў даўно ўжо падрыхтаванае войска ў межы Княства. На Літву рушылі вялізарныя маскоўскія сілы. Часу на доўгія зборы войска найвышэйшы гетман ня меў зусім.

Наступнага дня почт князя Радзівіла Чорнага выехаў з замку. Заранковіч напярэдадні ўвечары зайшоў да Марыі. Яна была нагэтулькі ўзрушана, што не магла стрымаць сьлёзаў. У Яна сэрца сьцялася пры выглядзе яе заплаканага твару. Абодва былі так усхваляваныя растаньнем, што размовы не атрымалася.

Напрыканцы Марыя прамовіла:

– Ян, я хачу папрасіць цябе.

– Так, слухаю.

– Мікалай зьбіраецца ісьці разам з вамі.

– Я ведаю.

– Пераканай яго, што яму пакуль рана ваяваць.

Ян адмоўна павёў галавой.

– Не магу.

– Чаму?

– Таму што на ягоным месцы я б таксама пайшоў у войска.

– Але ён яшчэ не жаўнер, ён жа зусім дзіця.

– Ён ужо не дзіця, ён рыцар.

Войска князя Радзівіла выходзіла раніцай. Заранковіч, Махвіч і яшчэ некалькі конных жаўнераў сабраліся разам, чакаючы каманду на шыхтаваньне. Ян убачыў, што Махвіч глядзіць кудысьці за яго сьпіну. Ён азірнуўся. Да іх ішла Марыя. Ян саскочыў з каня і падбег да дзяўчыны. Ягонае сэрца моцна калацілася ў грудзях.

– Я прыйшла разьвітацца, – сказала Марыя, – учора, па вялікім рахунку, не атрымалася.

Яна дастала з-пад футра белую хустку і павязала яе Яну на рукаво дасьпеха.

– Я хачу, каб гэта было з табой.

– Марыя, я...

– Ты ... галоўнае, вяртайся жывым.

Прагучала каманда зьбірацца ў шыхт.

– Я мушу ісьці, – прамовіў Ян.

– Хай Госпад цябе бароніць. Абавязкова вярніся.

Хутка стройныя шыхты рыцараў адзін за адным пачалі выяжджаць з замку. Каля галоўнай вежы Ян азірнуўся. Марыя стаяла і глядзела ім у сьпіну. Ён падняў руку, на якой была павязана хустка, і пабачыў, як Марыя памахала ў адказ.

Радзівілава войска рушыла знаёмым Заранковічу маршрутам: Сьвержань, Койданава, Менск, Барысаў. На працягу ўсяго шляху пры ўезьдзе калёны ў гарады іх сустракала вялікае мноства месьцічаў. Чутка аб новым маскоўскім нашэсьці ўжо абляцела ваколіцы. Мясцовыя зямяне таксама зьбіраліся на вайну. Хутка і яны пойдуць гэтай жа дарогай. Людзі дабраслаўлялі рыцараў і зычылі ім перамагчы і вярнуцца жывымі.

Найвышэйшы гетман літоўскі князь Мікалай Радзівіл Руды знаходзіўся ў Барысаве. Там і павінна было сабрацца войска, перш чым рушыць насустрач захопнікам.

Ян спадзяваўся пабачыць пры гетмане вялікае рушэньне, але нічога падобнага не было. Іхні аршак адным з першых прыбыў у Барысаў. Акрамя гетманскіх харугваў былі яшчэ почты некалькіх паноў. З паспалітага рушэньня не прыбыла ніводная павятовая харугва.

Цягам некалькіх наступных дзён у горад

прыходзілі новыя аддзелы, але ўсе яны былі даволі малалікія. Чым больш Ян назіраў за такім павольным зборам войска, тым большая трывога нараджалася ў сэрцы. Няўжо сытуацыя будзе такая ж, як і год таму, і Літва зноў ня выставіць сапраўднага войска? Аб тым, што адбудзецца ў такім разе з ягонай краінай, страшна было і падумаць.

Тры дні пасьля прыезду ў Барысаў Ян з Мікалаем ішлі па вуліцы, калі насустрач ім выехаў конны аддзел. Сярод рыцараў, якія яго ачольвалі, Ян пазнаў паноў Каверскага і Даліву. Успаміны аб падзеях у Полацку адразу паўсталі ў яго перад вачыма. Ян выйшаў на сярэдзіну вуліцы і загарадзіў вершнікам дарогу.

– Пан Каверскі, ці памятаеце вы мяне? – спытаў ён у рыцара, які зьдзіўлена глядзеў на яго.

– Не. З кім маю гонар?

– Я бачыў вас год таму ў карчме каля Полацка. Я быў у аршаку пана Вітковіча.

Пан Каверскі выскачыў з сядла.

– Ты быў там?

– Так.

– Што з вамі здарылася?

– Усе, акрамя мяне, загінулі.

– І Вітковіч?

– Так.

Пан Каверскі апусьціў галаву.

– А нас вестка пра захоп гораду засьпела ў Вільні. Мы толькі-толькі атрымалі ў людвізарні фалькон, але везьці яго ўжо не было куды. Ты прыбыў сюды з почтам князя?

– Так.

– А сёньня ўвечары не заняты службай?

– Не.

– Прыходзь да нас. Распавядзеш аб тым, як усё было ў Полацку.

– Добра.

– Я выпраўлю па цябе пахолка.

Увечары Ян наведаў пана Каверскага і даў яму справаздачу аб падзеях, што адбыліся ў мінулым годзе. У сваю чаргу, ад былога полацкага ваяра, які служыў цяпер князю Радзівілу Рудому, Заранковіч даведаўся, што ў Барысаве сабраліся пакуль толькі шэсьць-сем тысяч ваяроў. Не нашмат больш за тое, што было год таму, калі малалікае ліцьвінскае войска так і ня здолела нічым дапамагчы Полацку. Да гэтага часу толькі нямногія паны прывялі да найвышэйшага гетмана свае почты. У Барысаве знаходзіліся польны гетман Рыгор Хадкевіч і ягоны пляменьнік Ян Хадкевіч, чачэрскі староста Юры Зяновіч, князь Раман Сангушка, рагачоўскі староста Багдан Саламярэцкі, наваградзкі ваяводзіч Мікалай Сапега, луцкі староста Богуш Карэцкі, пан Юры Тышкевіч. Астатнія магнаты і заможныя паны ў Барысаў пакуль не прыбылі, таксама як і паспалітае рушэньне. Што да рушэньня, то яно заўсёды зьбіралася павольна, а ў баявых дзеях істотна саступала рэгулярным войскам.

Гэтая размова яшчэ больш пацьвердзіла засьцярогі Яна ў тым, што пакуль раскладка сілаў далёка не на карысць Вялікага Княства Літоўскага. У той час як ліцьвіны павольна зьбіраліся ў Барысаве, на

іх краіну рушыла аграмаднае маскоўскае войска. Як і год назад, здавалася, што мінулыя паразы нічаму не навучылі, быццам дарэмнымі і бязьдзейнымі былі рашэньні, прынятыя вальным соймам.

Мінула яшчэ некалькі дзён. Колькасьць войска нязначна павялічылася, але асноўныя сілы ўсё яшчэ не падыйшлі. І раптам па ўсіх харугвах прагучаў загад найвышэйшага гетмана выступаць. Князь Радзівіл павёў на ворага тых ваяроў, што былі ў шыхтах.

Маскоўскае войска ішло на Літву дзьвюма калёнамі. Першая – пад кіраўніцтвам князя Пятра Шуйскага – выйшла з Полацку ў нядзелю 23 студзеня 1564 году. Да войскаў, што знаходзіліся ў Полацку, паступіла ўзмацненьне са смаленскай, пскоўскай, наўгародзкай, тарапецкай і вялікалуцкай земляў, так што пад рукой князя Шуйскага было дваццаць пяць  трыццаць тысяч ваяроў. Другая калёна, пад кіраўніцтвам князя Пятра Сярэбранага, ішла са Смаленска і налічвала каля пяцідзесяці тысяч жаўнераў.

Абедзьве групоўкі павінны былі злучыцца пад Друцкам і далей рушыць на Менск, Наваградак і Вільню. Іван Жахлівы плянаваў нанесці скрышальны ўдар у самае сэрца Вялікага Княства Літоўскага.

Перад гетманам Радзівілам паўстала дылема: ці дзяліць сваё нешматлікае войска і сустракаць кожную калёну паасобку, ці кінуць усе свае сілы спачатку на адно маскоўскае войска, а потым – на другое? У любым выпадку нельга было дазволіць злучэньня вялізарнага войска праціўніка.

Князь Радзівіл прыняў рашэньне з асноўнымі

сіламі ісьці на полацкую групоўку, а каля дзьвюх тысячаў вершнікаў, пад кіраўніцтвам чарнігаўскага старасты Філона Кміты і амсьціслаўскага ваяводы Юрыя Осьціка, накіраваў пад Воршу з загадам як мага даўжэй затрымаць рух смаленскай калёны ўглыб Літвы. Неабходны быў час, каб спачатку разьбіць Шуйскага, а потым ісьці на Сярэбранага.

З Барысава войска гетмана зрабіла кідок да невялікай крэпасьці Лукомаль, што стаяла непадалёк ад Полацка. Князь Радзівіл разьмясьціўся ў фартэцы і прымаў зьвесткі пра рух праціўніка ад конных разьездаў, якія ён высылаў насустрач маскавітам.

26 студзеня ліцьвінскае войска выйшла з Лукомля, па лёдзе перайшло раку Улу каля мястэчка Чашнікі і заглыбілася ў лес. Непадалёк ад вёскі Іваньск, на полі каля Улы, што зрабіла выгін, абодва войскі сустрэліся лоб у лоб.

Маскавіты першымі выйшлі з лесу і занялі палову поля. Князь Шуйскі пашыхтаваў свае палкі ў баявыя пазыцыі і стаў чакаць выхаду праціўніка.

Трохі пазьней, з іншага боку, на поле вывеў сваіх жаўнераў князь Радзівіл. Пры гэтым ліцьвіны, выходзячы з яроў, парослых кустоўем, з цяжкасьцю маглі разгарнуць свае шэрагі. Бачачы, што праціўнік можа не ўступіць у бітву, маскоўскі ваявода загадаў сваім палкам адступіць назад, каб даць ліцьвінам месца і час для расстаноўкі і ўпарадкаваньня шэрагаў. Шуйскі меркаваў скончыць усё адным ударам, зьнішчыўшы як мага большую колькасьць ліцьвінскіх сілаў.

Два войскі сталі адно насупраць аднаго, і толькі засьнежанае поле падзяляла іх.

Вакол навісла цішыня, быццам надыйшло зацішша перад навальніцай. Войскі былі пашыхтаваныя, загады зробленыя. Цяпер заставалася даць сыгнал атакі і пачаць бітву. Кожны з некалькіх дзясяткаў тысяч ваяроў, якія сабраліся на полі, з трымценьнем чакаў, калі гэты сыгнал прагучыць, і думаў пра тое, ці давядзецца яму пабачыць неба, сонца і лес, калі ўсё скончыцца.

Ян глядзеў на гуфы маскавітаў, якія стаялі далёка, а ў яго перад вачыма паўставалі карціны нядаўняга мінулага. Ён успамінаў, як год таму непадалёк ад гэтых мясьцінаў праяжджаў па дарозе на Полацак, успамінаў Андруся Тура і Броніся Радыну, астатніх сяброў, што загінулі, успамінаў Марыю і тое, як яна праводзіла яго на вайну.

Князь Радзівіл Руды ў атачэньні некалькіх вершнікаў, сярод якіх быў ягоны шаснаццацігадовы сын Крыштап, заняў месца на ўзвышшы і аглядаў сваё войска. Жаўнеры былі пашыхтаваныя да атакі, над іх галовамі ўзвышаўся лес дзідаў і луналі харугвы з Пагоняй. Гэта была эліта ліцьвінскага войска, адборныя сілы, якія прайшлі не адну бітву. У іх перавазе над праціўнікам гетман не сумняваўся. Адзінае, што трывожыла, – іх было мала. Шыхты ліцьвінаў стаялі толькі насупраць непрыяцельскага цэнтру, супраць флангаў маскоўскага войска князю Радзівілу не было каго паставіць.

Гетман у малітве аддаў у рукі Госпада войска і сябе і махнуў булавой, падаўшы знак пачынаць бітву.

Атаку ўзначаліў Рыгор Хадкевіч, а з ім пайшлі ў бой почты Юрыя Зяновіча і князя Саламярэцкага.

Дзіды, якія дагэтуль глядзелі ўверх, нахіліліся ў бок ворага, вершнікі крануліся з месца і, павольна набіраючы ход, пайшлі на маскавітаў. Коні правальваліся ў снег, і Ян спачатку турбаваўся, што яны ня здолеюць набраць неабходнай хуткасьці, але, пераадолеўшы некалькі дзясяткаў сажняў, рыцары разагналіся і наўскапыт імчалі на ворага. Насустрач ім рушыла маскоўская кавалерыя. На сярэдзіне поля ваяры сустрэліся. Дзіды ўдарыліся ў шчыты і дасьпехі, заблiскалі шаблі, пачуўся лязгат жалеза і чалавечыя крыкі. Бітва пачалася.

Лінія маскавітаў, што ўступілі ў бой, была значна даўжэйшай за ліцьвінскую, але ўжо пасьля першага сутыкненьня яна выгнулася ў сярэдзіне і даволі хутка парвалася. Маскоўскія ваяры, якія знаходзіліся на флангах, пачалі адступаць, а ліцьвіны працягвалі рух наперад, падмінаючы пад сябе варожае войска. Лёгкая маскоўская кавалерыя была няздольная на роўных супрацьстаяць закутым у браню цяжкім ліцьвінскім вершнікам. Толькі колькасная перавага магла забясьпечыць маскавітам перамогу.

Шуйскі выслаў у бой новыя аддзелы, і цяпер ужо ліцьвінскія ваяры пачалі адступаць. Князь Радзівіл таксама ўводзіў у бітву сьвежыя сілы, хоць у яго не было столькі жаўнераў у рэзэрве, колькі іх меў у сваім распараджэньні маскоўскі ваявода, і ён толькі назіраў, як ліцьвіны, пакінуўшы ззаду сябе вялікую колькасьць пасечаных і растаптаных маскавітаў, сутыкнуліся са сьвежымі сіламі праціўніка.

Вось і харугва, дзе служыў Ян Заранковіч, атрымала загад атакаваць ворага. Прагучаў сыгнал вайсковай трубы, і вышкаленыя, выдатна ўзброеныя радзівілаўскія ваяры ўдарылі па маскавітах. Магутным націскам яны скрышылі, зьмялі першыя шэрагі супрацьстаяўшага ім палка. Упершыню Ян так выразна зразумеў, што недарэмна іх так доўга ганяў на вышкалах пан харунжы. Ліцьвінская кавалерыя ў бітве пераўзыходзіла маскоўскую на некалькі парадкаў. Нічога не маглі зрабіць маскавіты з іх бліскавічнай атакай. Толькі вялізарная колькасная перавага пакуль уратавала праціўніка ад поўнага разгрому.

Дзіда Яна зламалася аб маскоўскі шчыт ужо на пачатку бітвы. Ён выхапіў шаблю і з усяе моцы сек ёю ворагаў. Пачаўся вельмі зацяты рукапашны бой. Увесь гнеў, які назапасіўся за мінулы год, вылілі ліцьвіны на ворага ў той дзень.

Мікалай Мяжэвіч ад пачатку бітвы знаходзіўся ў абозе. Яго плян заключаўся ў тым, каб незаўважна далучыцца да жаўнераў Радзівіла Чорнага і ўзяць удзел у сечы. Ён усё для гэтага падрыхтаваў: у Нясьвіжы набыў сабе зброю і добрыя жаўнерскія дасьпехі. Грошай трошкі не хапіла, ён папрасіў іх у Марыі, але яна адмовіла: спадзявалася, што брат усё ж ня пойдзе на вайну. Але малады Мяжэвіч зрабіў пазыку ў Заранковіча, і Ян дапамог яму з умовай нічога не казаць Марыі. У дарозе Мікалай ехаў за войскам, а ў Барысаве трымаўся разам з Заранковічам. Калі войска сустрэла маскавітаў і гетман даў загад шыхтавацца, Мікалай быў гатовы далучыцца да ас-

татніх жаўнераў. Але ўсё пачалося вельмі хутка, і ён не пасьпеў набрацца сьмеласьці, каб пад'ехаць да рыцараў. Харугва Яна пайшла на ворага, а Мяжэвіч застаўся ў абозе разам з пахолкамі. Пачатак бітвы прайшоў на яго вачах. Шмат разоў ён зьбіраўся кінуцца на поле бітвы, але саромеўся таго, як усе людзі ў табары будуць глядзець на дзіўнага ваяра, які адзін без каманды паскакаў біцца.

Мікалай ня ведаў, што рабіць. Ён дакараў сябе за нерашучасьць, думаў аб тым, што сапраўднае жыцьцё мінае без яго, але раптам гетман загадаў уступіць у бой аддзелу князя Рамана Сангушкі. Мяжэвіч паскакаў на фланг, дзе пачынала рухацца гэтая харугва. Ён трошкі спазьніўся, і яму ўсё ж давялося імчацца аднаму ззаду за шыхтом рыцараў, але цяпер гэта было ўжо ня важна. Ваяры князя Сангушкі сышліся з маскавітамі, і хутка Мікалай быў сярод іх. Як быццам з-пад зямлі перад ім вырас праціўнік, Мяжэвіч ударыў яго шабляй і далучыўся да астатніх ваяроў. Змагацца ў дасьпехах было нязвыкла, рухі былі не такімі хуткімі, як хацелася б. Ужо ў самым пачатку ён ледзь не атрымаў удар дзідай, але яго ўратаваў рыцар, які біўся побач. А потым усё закруцілася ў віры змаганьня. Гадзіны бітвы праляцелі, быццам хуткія імгненьні.

Рыцар, што дапамог Мяжэвічу, заўважыў за сьпінамі маскоўскіх ваяроў пярэдняй лініі баярына, які трымаў варожую харугву. Ён кінуўся наперад, каб яе захапіць і дэмаралізаваць праціўніка. Хутка праскочыўшы паміж двума маскавітамі, гэты жаўнер наблізіўся да баярына з харугвай і магутным ударам

шаблі засек яго. Маскоўскі сьцяг зваліўся долу. Але храбры рыцар апынуўся адзін у атачэньні ворагаў. І, напэўна, загінуў бы, калі б не Мяжэвіч. Мікалай кінуўся ў атаку на двух маскавітаў, якія са сьпіны пагражалі яго таварышу. Аднаго ён забіў, іншаму перашкодзіў ударыць шабляй. Невялікая пляцоўка, дзе адбываліся гэтыя падзеі, раптам стала цэнтрам змаганьня на іхным флянзе, бо і ліцьвіны і маскавіты сьпяшаліся прарвацца да яе. Першыя – захапіць варожую харугву, другія – перашкодзіць ім. Мікалай быў у самай сярэдзіне гэтай сечы. Праціўнікі перамяшаліся паміж сабой і жорстка рубілі адзін аднаго. Вораг мог быць ня толькі наперадзе, але і ззаду. Спачатку вакол харугвы, якая ляжала ў сьнезе, было шмат маскавітаў, потым ліцьвіны сталі іх выціскаць. І калі Мікалай ужо вырашыў, што галоўная небясьпека мінула, ззаду на яго галаву абрынуўся магутны ўдар, усе паплыло перад вачыма, і ён споўз з каня.

Пасьля дзьвюх гадзінаў бітвы перавагу схілілі на свой бок ліцьвіны. Маскавіты завагаліся, пачалі адступаць. Паранены ваявода Шуйскі пасьпяшаўся ўратавацца ўцёкамі, а за ім пайшло і ўсё ягонае войска. Гэта адбывалася ўжо ў той час, калі на зямлю апусьціўся змрок. Наступіла ноч, ясная ад сьвятла маладзіка. Ліцьвіны абрынуліся на маскавітаў, калолі іх дзідамі і секлі шаблямі. Супраціву яны амаль не сустракалі. Адступленьне маскоўцаў ператварылася ў панічныя ўцёкі. Частка ваяроў Шуйскага паспрабавала перайсьці па лёдзе Улу. Тонкі лёд ня вытрымаў такой вагі і праваліўся, зацягваючы захопнікаў у ледзяную ваду.

Войска праціўніка ліцьвіны перасьледавалі каля пяці вёрстаў. Уся гэтая прастора ўздоўж дарогі была запруджана целамі забітых маскавітаў. З той вялізарнай колькасьці ваяроў, якія выйшлі з Полацка, толькі пяць тысячаў вярнуліся назад у горад. Гэта быў поўны разгром войска Шуйскага. Самога князя, які спрабаваў схавацца ў лесе, забіў сякерай селянін з Іваньску. Раніцай яго цела прынесьлі да гетмана Радзівіла.

Мікалай Мяжэвіч вярнуўся да прытомнасьці ўначы. Ён ляжаў у футры ў рыцарскім шатры. Добра зроблены шалом уратаваў яго ад сьмерці – рана на галаве была неглыбокая, удар проста аглушыў яго. Ад пахолка – зусім юнага хлопца, які глядзеў за ім, Мікалай даведаўся, што шацёр належыць ваяру князя Сангушкі пану Кулеве, і рыцар гэты пад час бітвы аддаў загад вынесьці Мяжэвіча з поля. Размова Мікалая з пахолкам адбывалася ў той момант, калі ліцьвіны грамілі маскавітаў пад час іх уцёкаў.

Пан Кулева вярнуўся разам з астатнімі жаўнерамі толькі раніцай. Калі ён заўважыў Мікалая, то адразу накіраваўся да яго.

– Ці пан у парадку?

– Так.

– Дзякуй Богу! Сымон Кулева, – адрэкамэндаваўся ён.

– Мікалай Мяжэвіч. Дзякуй за тое, што двойчы пан уратаваў мяне.

– І табе дзякуй. Ты таксама выбавіў мяне. Адкуль ты зьявіўся?

– Я прыбыў сюды разам з харугвамі князя Радзі-

віла Чорнага, але я толькі спрабую паступіць да яго на службу і яшчэ ня ведаю, ці атрымаецца гэта.

– А я служу князю Сангушку. Магу дапамагчы табе паступіць да яго на службу, калі не атрымаецца з Радзівілам. І цяпер можаш трымацца разам з намі.

– Дзякуй.

Ліцьвіны атрымалі вялікую перамогу, але гэта была толькі палова справы. Заставалася яшчэ смаленскае войска, больш шматлікае, чым полацкае. І жаўнеры, не пасьпеўшы адпачыць пасьля цяжкой бітвы, выправіліся на Воршу. Гетман Радзівіл выслаў да паноў Кміты і Осьціка ганцоў з весткай пра перамогу над Шуйскім і загадам працягваць стрымліваць войска князя Сярэбранага.

Ян лікаваў. Напярэдадні бітвы на Уле ён не ўяўляў сабе, як ім абараніць сваю зямлю. Вельмі ўсё было падобнае да падзеяў гадавой даўніны. Зноў нашэсьце вялікага маскоўскага войска, і зноў яму супрацьстаяла малалікае ліцьвінскае. Ён імкнуўся адганяць ад сябе падобныя думкі, але ўнутры не чакаў ад гэтай выправы нічога добрага. Сваёй сьмерці ён не баяўся, але жахаўся ад думкі пра тое, што будзе з Марыяй, маці і сёстрамі, калі маскавіты нахлынуць у краіну. Даволі сьвежымі яшчэ былі ўспаміны аб тым, што яны чынілі ў Полацку. Але ўжо на пачатку сечы, калі ён убачыў, з якой лёгкасьцю яны зьміналі шыхты маскоўскага войска, яго настрой зьмяніўся. Ён паверыў у перамогу.

І вось цяпер, калі харугвы Радзівіла кіраваліся да Воршы, ён не сумняваўся ў тым, што яны пераможуць войска Сярэбранага. З такім гетманам і з такімі

ваярамі ім не страшныя былі тыя пяцьдзясят тысяч маскавітаў.

Яны падыходзілі да Воршы, калі насустрач ім з лесу выскачылі некалькі вершнікаў і накіраваліся да князя Радзівіла. Ян знаходзіўся ўсярэдзіне калёны на добрай адлегласьці ад гетмана. Ён і яго таварышы ўважліва сачылі за размовай вестуноў з князем, спрабуючы даведацца, якую навіну яны прынесьлі. Між тым, у галаве калёны, побач з гетманам стала адбывацца нешта загадкавае. Шыхт рыцараў рассыпаўся, чуліся поўныя радасьці выгукі, трыюмфальна лунаді харугвы з Пагоняй. Хутка па ўсім войску прайшла неверагодная вестка: войска Сярэбранага пераможана і адступіла да Смаленска. Спачатку ніхто нічога не зразумеў. Хто мог нанесьці паразу пяцідзесяцітысячнаму войску? Адзіным ліцьвінскім войскам, якое яму супрацьстаяла, былі дзьве тысячы вершнікаў паноў Кміты і Осьціка. Але не маглі ж яны разграміць вялізарнае маскоўскае войска!

Хутка, аднак, стала ведама, што адбылося. А здарылася наступнае. Атрымаўшы ад гетмана вестку пра перамогу на Уле, паны Кміта і Осьцік накіравалі ў горад Дуброўну вестуна з лістом, у якім напісалі пра разгром Шуйскага, і, між іншага, у некалькі разоў павялічылі сапраўдную колькасьць ліцьвінаў. Вестуна яны адмыслова накіравалі праз тэрыторыю, занятую маскавітамі ў разьліку на тое, што яго перахопяць. Так і здарылася. Маскоўцы перахапілі ліст і даставілі яго князю Сярэбранаму. З ліста князь даведаўся, што яму ўжо няма з кім злучацца для далейшага паходу ўглыб Літвы. Пры

зьяўленьні на ягоным шляху войска пана Кміты ён палічыў гэты невялікі аршак за ўсё ліцьвінскае войска, што разграміла Шуйскага. Маскоўскі ваявода так і не адважыўся ўступіць у бітву і загадаў адступаць. І вось пяцідзесяцітысячнае войска без адзінага стрэлу стала ўцякаць ад атакі двухтысячнага аддзелу, так што ваяры пана Кміты гналі іх да Смаленска. Аграмадны абоз з дваццаці пяці тысячаў вазоў маскавіты пакінулі пераможцам.

У праўдзівасьць таго, што адбылося, складана было паверыць. Рыцары саскоквалі з коней, падалі на калені і дзякавалі Богу за гэты цуд. Толькі Госпад мог падараваць ім такую перамогу! Вялікае Княства Літоўскае была збаўлена ад маскоўскага нашэсьця.

Шлях назад стаў дарогай трыюмфу. Ва ўсіх буйных гарадах іх урачыста сустракалі і дзякавалі за зьдзейсьнены подзьвіг. Гетман павёў пераможцаў у Вільню і ўехаў у сталіцу на кані князя Шуйскага. Самога маскоўскага ваяводу з належнай яго званьню пашанай пахавалі ў Вільні на праваслаўных могілках. Да ног вялікага князя Жыгімонта Аўгуста кінулі захопленыя ў маскавітаў сьцягі.

Вестка пра паразу вялізнага маскоўскага войска засьпела Івана Жахлівага падчас баляваньня ў Маскве. Даведаўшыся пра разгром Шуйскага і пра ганебныя ўцёкі Сярэбранага, маскоўскі князь у гневе рынуўся ў лёхі Крамля, дзе трымалі захопленых у Полацку палонных. Там Жахлівы і яго прыслуга ў лютасьці выразалі вялікую колькасьць ліцьвінаў. Калі валадар Крамля ўдарыў дзідай полацкага зямяніна пана Быкоўскага, палонны рыцар ухіліўся ад

удару, выхапіў з рук князя дзіду і паспрабаваў пака-нацць маскавіта, але, аслаблены за доўгія месяцы па-лону, ён дзейнічаў недастаткова хутка, і ахова пасьпе-ла засекчы яго бердышамі.

З Вільні радзівілаўскія харугвы накіраваліся ў Нясьвіж.

Ян з нецярплівасьцю набліжаўся да замку. Адной з першых, каго ён убачыў пры браме, была Марыя. Яны пабеглі насустрач адно аднаму.

– Марыя!

– Ян! Ты жывы! Слава Богу!

Увечары Ян наведаў Марыю і распавёў ёй аб усім, што здарылася з моманту выхаду войска з Нясьвіжа. Перад тым як сыходзіць, Ян нарэшце набраўся сьме-ласьці і прамовіў:

– Марыя, я хачу нешта сказаць табе.

Дзяўчына ўважліва паглядзела на яго.

– Так, я слухаю.

– Марыя, я... я хацеў сказаць, што кахаю цябе і хачу, каб ты зрабілася маёй жонкай.

Яну падалося, што мінула цэлая вечнасьць, перш чым ён пачуў адказ.

– Я згодна быць тваёй жонкай, Ян.

Заранковіч доўга ня мог падабраць патрэбных словаў. Яны моўчкі глядзелі адно аднаму ў вочы. Нарэшце ён прамовіў:

– Які цудоўны час падараваў Госпад! Наша слаўная краіна здолела абараніць сябе ад нашэсьця захопнікаў, а самая прыгожая панна на зямлі зга-дзілася стаць маёй жонкай. Дзякую Госпаду Ісусу Хрысту за гэта!

Але да вясельля ім было яшчэ далёка. Неабходна было атрымаць згоду бацькоў з абодвух бакоў, правесьці заручыны і толькі потым рыхтавацца да шлюбу.

Пакуль князь Радзівіл Руды зброяй абараняў сваю краіну, яго стрыечны брат князь Радзівіл Чорны змагаўся ў дыпляматычнай бітве падчас аб'яднанага польска-ліцьвінскага сойму ў Варшаве. А сытуацыя там была ня меньш складаная, чым на палях баталіяў. Выкарыстоўваючы маскоўскую пагрозу, польскія паслы ў чарговы раз патрабавалі дзяржаўнай вуніі паміж Польшчай і Літвой. Пры гэтым іх бачаньне вуніі моцна адрозьнівалася ад таго, што было выпрацавана на ліцьвінскім вальным сойме ў Вільні. Палякі патрабавалі не аб'яднаньня Польшчы і Літвы як раўнапраўных дзяржаваў, а ўваходжаньня Вялікага Княства Літоўскага ў склад Польскага Каралеўства з амаль поўным скасаваньнем яго самастойнасьці.

Ліцьвінскі і польскі праекты вуніі супярэчылі адзін аднаму па большасьці пунктаў. І многія ліцьвінскія паслы пад уплывам няўдалага ходу вайны з Масковіяй гатовы былі згадзіцца на значныя саступкі палякам. Але калі ў Варшаву прыбыў вястун, які паведаміў пра перамогу над маскавітамі, галава дэлегацыі князь Радзівіл Чорны адхіліў польскі варыянт вуніі.

Вось так Вялікае Княства Літоўскае супрацьстаяла пагрозам, што паўставалі як з усходу, так і з захаду. Праўда, усе разумелі, што гэтыя пытаньні толькі адкладзены на час і хутка зноў прыйдзецца іх разь-

вязваць. І, акрамя таго, неабходна было вызваляць Полацак з рук маскавітаў.

А тым часам краіна перажывала найвялікшае духовае адраджэньне. Набываў моц рух Рэфармацыі. Біблія станавілася настольнай кнігай цэлага пакаленьня. Рыхтаваліся новая рэдакцыя Статуту, судовая ды іншыя рэформы, расла колькасьць гарадоў, друкарняў і школаў. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ператваралася ў дзяржаву, дзе пануюць хрысьціянскі закон і свабода.

# Слоўнік імёнаў і тэрмінаў

**Аканом** – гаспадарчы кіраўнік маёнтку.

**Аршак** – невялікі конны атрад.

**Астроскі Канстанцін (1460–1530)** – адзін з самых славутых гетманаў Вялікага Княства Літоўскага. Сучасьнікі называлі яго "другім Ганібалам". Атрымаў 64 перамогі над маскавітамі і татарамі, у тым ліку і ў славутай бітве пад Воршай у 1514 г.

**Бітва пад Воршай 1514 г.** – адбылася 8 верасьня 1514 г. на рацэ Крапіўне непадалёк ад Воршы паміж ліцьвінскімі і маскоўскімі войскамі. 35-тысячнае войска К. Астроскага дазваньня разграміла 80-тысячную маскоўскую армію і ўратавала краіну ад захопу.

**Бона Сфорца (1494–1557)** – каралева польская і вялікая княгіня літоўская, маці Жыгімонта Аўгуста.

**Гакаўніца** – ручная агняпальная зброя, якая выкарыстоўвалася для абароны фартэцаў, а таксама ў адкрытым баі.

**Гарадзельскі прывілей** – заканадаўчы акт, прыняты ў 1413 годзе, які прадугледжваў перавагу каталікоў у Вялікім Княстве Літоўскім пры заняцьці дзяржаўных пасадаў.

**Гарадня** – прастакутны драўляны зруб з бярвёнаў ці брусоў, частка сьцяны драўлянага абарончага збудаваньня (гроду, замку ды інш.). Для ўзмацненьня сьценаў гародні маглі рабіць у дзьве ці тры сьцяны, а ўнутраную прастору засыпаць зямлёй, друзам ці каменьнем.

**Глябовіч Ян (1544–1590)** – кашталян менскі,

пазьней падскарбі (міністар фінансаў) Вялікага Княства Літоўскага. Адзін з лідараў Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Знакаміты веданьнем Бібліі і гарачым патрыятызмам. Падчас захопу Полацку маскоўскім войскам у 1563 г. быў узяты ў палон. Цудам выжыў. У многім дзякуючы Яну Глябовічу быў прыняты Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г., які зрабіўся асновай беларускага заканадаўства і дзейнічаў больш за 240 гадоў.

**Дворныя і земскія ўрадоўцы** – прыдворныя і дзяржаўныя чыноўнікі.

**Драб** – пяхотнік, пешы ваяр Вялікага Княства Літоўскага.

**Жыгімонт Аўгуст (1520–1572)** – вялікі князь літоўскі з 1544 г., адначасова кароль польскі – з 1548 г. Пры ягоным кіраваньні ў Вялікім Княстве Літоўскім пашырылася і перамагла Рэфармацыя, была праведзена аграрная рэформа 1557 г. і зацьверджаны Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г. У 1569 г. падпісаў акт Люблінскай вуніі, паводле якой Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае стварылі канфэдэрацыю – Рэч Паспалітую Абодвух Народаў (палякаў і ліцьвінаў). Апошні з дынастыі Ягайлавічаў.

**Залога** – гарнізон.

**Збор** – эвангельская, пратэстанцкая царква (ад слова "збор" - "сабраньне" вернікаў).

**Земскі скарб** – нешта падобнае да дзяржаўнага бюджэту.

**Іван IV Жахлівы (1530–1584)** – вялікі князь маскоўскі (1533–1584). У 1547 г. абвясьціў сябе царом

“усяе Русі”. Праводзіў вельмі жорсткую ўнутраную і замежную палітыку. Разьвязаў шэраг войнаў на захадзе і на ўсходзе, у тым ліку супраць Вялікага Княства Літоўскага. Увёў апрычніну. У расейскай гістарычнай традыцыі вядомы як Иван Грозный, у ангельскай – як John the Terrible, у французскай – Ivan le Terrible, у нямецкай – як Iwan der Schrekliche.

**Казнадзей** – прапаведнік.

**Капа** – грашова-лікавая адзінка ў Вялікім Княстве Літоўскім роўная 60 грошам.

**Карона** – Польскае каралеўства (Карона Польская).

**Корд** – кароткі меч, у баі выконваў функцыі кінжала.

**Літва** – Вялікае Княства Літоўскае, беларуская дзяржава ў XIII-XVIII стст. Утварылася ў сярэдзіне XIII ст. са сталіцай у Наваградку (цяпер раённы цэнтар Гарадзенскай вобласьці). У 1323 г. вялікі князь літоўскі Гедзімін перанёс сталіцу ВКЛ у Вільню.

**Лютары** – зьняважлівая назва эвангельскіх хрысьціянаў у XVI ст.

**Людвізарня** – майстэрня, у якой адліваліся гарматы.

**Маентнасьць** – маёмасьць.

**Мартыра** – гармата вялікага калібру з кароткай руляй. Прымянялася для разбурэньня ўмацаваньняў праціўніка.

**Маярат** – атрыманьне ў спадчыну нерухомасьці паводле прынцыпу першародзтва ў сям’і.

**Мікалай Радзівіл Руды (1512–1584)** – най-

вышэйшы гетман Вялікага Княства Літоўскага, адзін з лепшых палкаводцаў краіны. У 1564 г. разьбіў маскоўскае войска пад Улай, чым уратаваў краіну ад захопу. Разам са стрыечным братам Мікалаем Радзівілам Чорным ("Чорным" і "Рудым" Радзівілы называліся паводле колеру барады) быў лідарам Рэфармацыі ў Беларусі.

**Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565)** – канцлер Вялікага Княства Літоўскага, "некаранаваны кароль Літвы". Галоўны лідар Рэфармацыі ў Беларусі. У 1553 г. публічна вызнаў эвангельскую веру. Заснаваў шэраг пратэстанцкіх збораў, школаў, друкарняў, дзякуючы чаму Вялікае Княства Літоўскае фактычна зрабілася пратэстанцкай краінай (большасьць эліты складалі пратэстанты). Удзельнічаў у распрацоўцы аграрнай рэформы 1557 г., рыхтаваў рэдакцыю Статуту 1566 г. Дзякуючы ягонай падтрымцы выдавалася шматлікая хрысьціянская літаратура, у тым ліку "Катэхізіс" Сымона Буднага ў 1562 г. і Берасьцейская Біблія ў 1563 г. Час ягонага канцлерства лічыцца адным з найбольш слаўных пэрыядаў Залатога Веку Беларусі.

**Міністар** – служыцель, так называлі пратэстанцкіх сьвятароў.

**Паны-рада** – (у дакумэнтах на лацінскай мове – сэнат) – найвышэйшы орган дзяржаўнага кіраваньня Вялікага Княства Літоўскага, які разьвязваў галоўныя пытаньні палітыкі і эканомікі, адыгрываў істотную ролю ў абраньні вялікага князя, абароне дзяржавы, падрыхтоўцы законапраектаў.

**Пахолкі** – слугі, слугі-збраяносцы.

**Почт** – вайсковае фармаваньне, якое ствараў (наймаў) і ўзначальваў арыстакрат Вялікага Княства Літоўскага.

**Прэнг** – эшафот.

**Рагаціна** – разнавіднасьць дзіды. Найчасьцей выкарыстоўвалася пад час паляваньня, радзей на вайне.

**Ручніца** – агняпальная ручная зброя.

**Рыдван** – невялікая конная каляска.

**Сагайдак** – камплект з калчана са стрэламі і лука ў налуччы.

**Сойм** – парлямэнт у Вялікім Княстве Літоўскім.

**Сэрпантына** – палявая гармата, якая характарызавалася доўгім ствалом і малым калібрам.

**Фартэца** – крэпасьць.

**Фальканэт** – гармата малога калібру прымялася пры абароне невялікіх замкаў і як палявая зброя пяхоты.

**Фалькон** – тое самае, што фальканэт, толькі фалькон мог мець большы калібар.

**Цэйгаўз** – складзкое памяшканьне для захоўваньня запасаў зброі і вайсковага рыштунку.

**Чакан** – разнавіднасьць баявой сякеры з вузкім кароткім лязом.

## Зьмест

| Разьдзел | Старонка |
|---|---|
| 1 | 5 |
| 2 | 13 |
| 3 | 24 |
| 4 | 34 |
| 5 | 48 |
| 6 | 60 |
| 7 | 74 |
| 8 | 86 |
| 9 | 100 |
| 10 | 111 |
| 11 | 122 |
| 12 | 139 |
| 13 | 152 |
| 14 | 167 |
| Слоўнік імёнаў і тэрмінаў | 186 |

Літаратурна-мастацкае выданне

**Рукаль Алег**

# НА СЛУЖБЕ КНЯЗЯ РАДЗІВІЛА

Аповесць

Рэдактар *Андрусь Унучак*
Дызайн: *Юрась Гецэвіч*
Ілюстрацыі: *Віктар Козел*
Pryhazosc@gmail.com

Карэктары
*Марына Багародзь*
*Сьвятлана Гецэвіч*
*Вольга Жандарава*

Подпісана да друку 04.12.2013
Фармат 60x90 1/16. Папера афсетная
Друк афсетны. Улік.-выд. арк. 6,98. Умоўн.-друк. арк. 18,5
Наклад 500 экз. Заказ №3890.

Выдавецтва ЗАТ «Юніпак»
ЛИ №02330/1048 ад 06.06.2013
Вул. Старажоўская, 8, а/с 69
220002, г. Мінск, Беларусь
E-mail: unipack.d@gmail.com

Друкарня «Палікрафт»
ЛП №02330/0494199 ад 03.04.2009
Вул. Кнорына, 50, корп. 4, п. 401а
220103, г. Мінск, Беларусь

*А повесьць “На службе князя Радзівіла” прысьвечана падзеям Інфлянцкай вайны другой паловы XVI стагодзьдзя.*

*На старонках твору паўстаюць захапляльныя гістарычныя постаці вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста, канцлера Вялікага Княства Літоўскага і ваяводы віленскага князя Мікалая Радзівіла Чорнага, найвышэйшага гетмана літоўскага князя Мікалая Радзівіла Рудога.*

9 789856 802587

Алег Рукаль

# На службе князя Радзівіла